WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

13 ЛІПЕНЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 130
(26994)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ГЕРМАН ГРЭФ АБМЕРКАВАЛІ ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ З АШЧАДНЫМ БАНКАМ РАСІІ

Перспектывы развіцця супрацоўніцтва з Ашчадным банкам Расіі абмяркоўваліся 12 ліпеня ў ходзе сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй праўлення ААТ «Ашчадны банк Расіі» Германам Грэфам.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў Герману Грэфу за тую падтрымку, якую Ашчадны банк Расіі і яго даччыны банк у Беларусі ААТ «БПБ-Банк» аказваюць рэальнаму сектару беларускай эканомікі. «І параіцца трэба, і ёсць што абмеркаваць. Я хачу вам шчыра падзякаваць, што на працягу гэтага года і ў канцы мінулага, калі ў нас узніклі пэўныя праблемы, як вы і абяцалі, БПБ-Банк, ваша падраздзяленне ў Беларусі, вельмі прыстойна сябе, як мяне інфармуюць, сёння паводзіць. Вы аказваеце падтрымку нашаму рэальнаму сектару эканомікі з набыццём тавараў па імпарце, вядучым нашым прадпрыемствам. Гэта дарагога каштуе, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Я вельмі цаню і вельмі рады, што мы ў свой час лёс гэтага банка (БПБ-Банка. — *Заўвага БЕЛТА*) звязалі з Ашчадным банкам Расіі і маем сёння адпаведную падтрымку».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў у ходзе сустрэчы абмеркаваць існуючыя праблемы. «Ды і вы, я ведаю, маўчаць не будзеце, падкажаце тое, што вы бачыце збоку, што нам трэба зрабіць у гэтай сітуацыі. Для нас гэта вельмі важна», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу Герман Грэф паведаміў, што з пачатку гэтага года Ашчадны банк Расіі накіраваў дадатковую ліквіднасць на падтрымку БПБ-Банка ў памеры каля $480 млн. «Гэта дапамагло падтрымаць устойлівасць нашага банка. Лічу, што мы таксама ў гэты перыяд часу дапамаглі многім прадпрыемствам Беларусі ў энергетыцы, прамысловасці, сельскай гаспадарцы», — адзначыў кіраўнік Ашчаднага банка Расіі.

«Мы бачым, што пры наяўнасці збалансаванай палітыкі да канца гэтага года сітуацыю ў Беларусі можна не толькі стабілізаваць, але і істотна палепшыць. Я падрыхтаваўся па тым, чым бы мы маглі быць вам карысныя ў гэты перыяд часу», — сказаў Герман Грэф.

Заснаваны ў 1841 годзе акцыянерны камерцыйны Ашчадны банк Расійскай Федэрацыі з'яўляецца буйнейшым банкам Расійскай Федэрацыі і СНД. Па выніках 2010 года ён уваходзіць у дзясятку самых прыбытковых банкаў свету. Яго актывы на 1 студзеня 2011 года склалі больш за чвэрць актываў банкаўскай сістэмы Расійскай Федэрацыі (27 працэнтаў), доля ў банкаўскім капітале — 26 працэнтаў. У 2010 годзе каля палавіны (47,9 працэнта) зберажэнняў расійскіх грамадзян захоўвалася ў Ашчадным банку Расіі. Крэдытны партфель банка складае каля трэці ўсіх выдадзеных у Расіі крэдытаў.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА СУСТРЭЎСЯ З ПРЭЗІДЭНТАМ КЛУБА ВОЕНАЧАЛЬНІКАЎ РАСІІ АНАТОЛЕМ КУЛІКОВЫМ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 12 ліпеня сустрэўся з прэзідэнтам клуба военачальнікаў Расійскай Федэрацыі Анатолем Куліковым.

Клуб военачальнікаў Расійскай Федэрацыі заснаваны ў 2005 годзе. У яго склад, які аб'ядноўвае вышэйшае аператыўна-стратэгічнае звяно кіравання ваеннымі і ваенізаванымі арганізацыямі Расіі, уваходзяць больш як 2 тыс. дзеючых і знаходзячыхся ў запасе і ў адстаўцы вышэйшых афіцэраў Міністэрства абароны, МУС, ФСБ, МНС, іншых сілавых ведамстваў.

Сярод прыярытэтных напрамкаў дзейнасці клуба — патрыятычнае выхаванне грамадзян, шэфства над ветэранамі і ваеннымі вучылішчамі, рэалізацыя праектаў, якія павінны ўмацоўваць сувязі паміж рознымі слаямі грамадства і пакаленнямі. Клуб узаемадзейнічае з аналагічнымі замежнымі арганізацыямі па пытаннях калектыўнай бяспекі, процідзеяння тэрарызму, наркапагрозе і кантрабандзе.

Анатоль Кулікоў расказаў аб дзейнасці клуба, а таксама прапанаваў абмеркаваць магчымасць стварэння такой арганізацыі ў Беларусі.

«У нас у Беларусі многія помняць гады вашай службы, вашу дзейнасць яшчэ палкоўнікам пры тушэнні пажару на ЧАЭС, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Анатоля Кулікова. — Мы часта сустракаліся, калі вы працавалі на адпаведных пасадах пры першым Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі. Ведаю вашу пазіцыю, абсалютна яе тады падтрымліваў і цяпер таксама. Мне вельмі імпануе тое, што вы адзін з нямногіх у Расіі гаворыце праўду, хоць гэта і горкая праўда. Больш таго, вы і ўлады крытыкуеце, калі яны недзе памыляюцца. Гэта ўсё правільна».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, напярэдадні сустрэчы ён азнаёміўся не толькі з задачамі клуба, але і яго практычнай работай. «Яна сёння вельмі актуальная. Няма нічога дрэннага ў тым, каб мы такую арганізавалі дзейнасць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Свет абсалютна крымінальны сёння. І ўсё гэта (крымінал, карупцыя) да нас адтуль прыйшло, у асноўным з Захаду», — адзначыў беларускі лідар.

«Што датычыцца нашай агульнай з вамі Айчыны, Расіі, Беларусі, і я не выключаў бы Украіну, то нам тут вельмі шмат давядзецца папрацаваць. Таму што свет не такі просты, і нямала гэтых праблем у нас, на жаль, з Расіяй, з'яўляюцца ўсё новыя і новыя. Таму любое аб'яднанне, асабліва ўплывовых людзей у Расійскай Федэрацыі, для нас вельмі важнае, архіважнае. Прынамсі, мы хоць бы да вас маглі б даводзіць тую інфармацыю, якой сёння расійскае грамадства, і нават эліта расійскага грамадства, не мае. Таму для нас гэта вельмі важна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, гаворачы аб мэтах клуба. Анатоль Кулікоў сказаў: «Наша задача — максімальна выкарыстоўваць патэнцыял людзей, якія доўгія гады займаліся сур'ёзнымі праблемамі кіравання вялікімі воінскімі калектывамі, каб іх патэнцыял не згас, каб яны маглі ўдзельнічаць у распрацоўцы ваеннай дактрыны, канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, удзельнічаць у рэфармаванні». «Мы таксама праводзім вялікую навуковую работу. Вядома, гэта няпроста — сказаць праўду і быць пачутымі, але нам гэта ўдаецца», — адзначыў ён.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ ПРЭЗІДЭНТУ КІПРА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Рэспублікі Кіпр Дымітрысу Хрыстофіясу ў сувязі з трагічнай гібеллю людзей у выніку пажару і ўзрываў на ваенна-марской базе «Евангелас Фларакіс».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь выступае за стварэнне роўных умоў для вытворцаў на рынку Мытнага саюза

А б гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, выступаючы ў Маскве на канферэнцыі «Ад Мытнага саюза да АЭП: інтарэсы бізнэсу», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Умовы трэба ствараць роўныя для таго, каб была добрасумленная канкурэнцыя вытворцаў», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Ён таксама дадаў, што Мытны саюз нясе ў сабе не толькі выгаду, але і пэўныя рызыкі для вытворцаў. У прыватнасці, узмацняецца канкурэнцыя паміж імі. У той жа час прадпрыемствы Мытнага саюза павінны імкнуцца да каапэрацыі для больш паспяховага размяшчэння і выкарыстання капіталу.

Кіраўнік урада Беларусі назваў таксама праблему дыспарытэту цэн на адзіным рынку Мытнага саюза. Гэта зніжае канкурэнтаздольнасць тавараў адных краін на фоне субсідзіравання другіх. У адзін момант гэтыя пытанні не вырашыць, але імі трэба займацца», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Гэта трэба ў тым ліку для таго, каб устараніць разрыў па цэнах на паліўна-энергетычныя рэсурсы і іншыя таварныя групы.

Прэм'ер-міністр Беларусі падзякаваў расійскаму калегу Уладзіміру Пуціну за разуменне ў вырашэнні пытанняў, якія датычацца супрацоўніцтва дзвюх краін у паліўна-энергетычнай сферы. «Фактычна за апошнія шэсць гадоў цэны на газ для Беларусі павялічыліся ў 4,5 раза, у той час як цэны беларускага экспарту ў Расію выраслі на 22 працэнты», — рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

Беларусь у поўным аб'ёме прымае ўзятыя на сябе абавязацельствы ў рамках крэдытнай падтрымкі Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. «Хачу праінфармаваць бізнэс-супольнасць і кіраўнікоў урадаў Расіі і Казахстана аб тым, што мы ў поўным аб'ёме прымаем узятыя на сябе абавязацельствы ў рамках крэдытнай падтрымкі за кошт Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, — сказаў кіраўнік беларускага ўрада. — Гэта датычыцца абмежавання бюджэтных асігнаванняў, выплат, росту даходаў і многіх іншых пытанняў».

Беларусь прапанавала Расіі і Казахстану стварацца транснацыянальныя альянсы ў рамках Мытнага саюза.

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, тры краіны дабіліся добрых вынікаў у гандлёвым супрацоўніцтве, аднак не трэба спыняцца на дасягнутым, трэба ісці далей і пераходзіць да стварэння сумесных карпарацый як на дзеючых, так і на новых прадпрыемствах краін Мытнага саюза. «Гэта зробіць тры нашы дзяржавы менш залежнымі ад знешняй кан'юнктуры і забяспечыць устойлівае развіццё прамысловасці, навукі і сферы паслуг», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. На яго думку, дзякуючы стварэнню транснацыянальных карпарацый Мытны саюз можа стаць цэнтрам эканамічнай сілы на сусветнай арэне.

Аналізуючы перспектывы развіцця супрацоўніцтва краін — удзельніц Мытнага саюза, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ўсе пытанні ў аб'яднанні вырашаюцца канструктыўна і з улікам нацыянальных інтарэсаў. Гэта перш за ўсё датычыцца беларуска-расійскіх адносін. «Мытны саюз і АЭП адбудуцца, у гэтым ёсць упэўненасць, — сказаў кіраўнік беларускага ўрада. — Ёсць давер і разуменне, што трэба ісці на кампрамісы ў рамках узаемаадносін паміж нашымі краінамі». Беларусь была і застаецца прыхільніцай інтэграцыі ў Мытным саюзе.

У той жа час Міхаіл Мясніковіч адзначыў і шэраг цяжкасцяў, якія краіны-партнёры павінны будуць пераадолець. Размова перш за ўсё ідзе аб стварэнні адзінай канкурэнтаздольнай прасторы на агульным рынку і ўстараненні дзяржаўнага пратэкцыянізму і несправядлівых форм субсідзіравання нацыянальных вытворцаў.

Беларусь прапанавала партнёрам удзельнічаць у прыватызацыі прадпрыемстваў хімічнай галіны.

«Мы запрашаем бізнэс-супольнасці Расіі і Казахстана ўдзельнічаць у прыватызацыі прадпрыемстваў у Беларусі. У першую чаргу я хацеў бы назваць хімічную прамысловасць, таму што, як мне здаецца, мы моцна зацыкліліся на пытаннях нафтаперапрацоўкі», — сказаў прэм'ер-міністр. Міхаіл Мясніковіч назваў перспектыўнымі, у прыватнасці, праекты ў галіне вялікай і малатанажнай хіміі, менавіта яны могуць зацікавіць патэнцыяльных партнёраў у Беларусі.

Пры гэтым кіраўнік беларускага ўрада падкрэсліў інвестараў праяўляць большую актыўнасць і больш эфектыўна ўносіць і ажыццяўляць свае прапановы па прыватызацыі. Паводле яго слоў, некаторыя такія прапановы «размазваюцца на працягу некалькіх гадоў».

Беларусь зацікаўлена ў прыцягненні інвестыцый у фармацэўтычную галіну, развіццё мабільнай сувязі, мікраэлектроніку, металургію і машынабудаванне. «Неабходна ісці на актыўную інтэграцыю ў высокатэхналагічнай сферы», — дадаў прэм'ер-міністр. Адным з найбольш перспектыўных праектаў у гэтай галіне ён назваў будаўніцтва беларускай АЭС, у якім прыме актыўны ўдзел Расія. «Гэта сур'ёзны знакавы праект, і такіх праектаў можна прывесці шмат», — рэзюмаваў Міхаіл Мясніковіч.

Прэм'ер-міністр Беларусі лічыць неабходным фарміраванне адзінага абароннага заказу ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана.

«Калі яго не будзе, то ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва нашых краін будзе непаўнацэнным», — лічыць прэм'ер-міністр. На яго думку, вырашаць гэта пытанне неабходна даволі хутка, тым больш што па шэрагу буйных прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу Беларусі паступаюць ужо актыўныя прапановы з боку іншых партнёраў краіны. «У той жа час мы павінны перш за ўсё аб'ядноўваць намаганні ў рамках Адзінай эканамічнай прасторы», — упэўнены кіраўнік беларускага ўрада.

У Беларусі, Расіі і Казахстана няма супярэчнасцяў па фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы. Пра гэта заявіў журналістам у Маскве, падводзячы вынікі канферэнцыі, старшыня ўрада Расіі Уладзімір Пуцін. Ён таксама паведаміў, што падчас перамоў бакі дамовіліся пра функцыі і ўмовы працы Камісіі Мытнага саюза. Прынята рашэнне, каб камісія дзейнічала на пастаяннай прафесійнай аснове. «У рамках гэтай структуры будзе арганізавана адмысловае падраздзяленне, якое будзе дзейнічаць на пастаяннай аснове, — паведаміў кіраўнік расійскага ўрада. — З 1 студзеня 2012 года Камісія Мытнага саюза ў гэтай якасці прыступіць да працы».

Стыхія

БОЛЬШ ЯК ПАЛАВІНА МЕСЯЧНАЙ НОРМЫ АПАДКАЎ ВЫПАЛА Ў МАР'ІНАЙ ГОРЦЫ

Больш як палавіна месячнай нормы ападкаў выпала ў ноч на 12 ліпеня ў Мар'інай Горцы: за суткі выпала 49 мм ападкаў, што складае 55 працэнтаў месячнай нормы, паведамілі БЕЛТА ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Найбольшая колькасць ападкаў адзначана таксама ў Бабруйску — 35 мм (40 працэнтаў) і на метэастанцыі «Акцябр» — 30 мм (34 працэнты). Такія багатыя ападкі ў гэтым месяцы назіраюцца ўпершыню. У асобных раёнах прайшлі моцныя ліўні, парывы ветру пры навальніцах дасягалі 14-16 метраў у секунду. У цэлым пазаўчора па рэспубліцы назіралася вельмі цёплае надвор'е з сярэднясутачнай тэмпературай паветра плюс 21-25 градусаў, што на 3-7 градусаў вышэй за кліматычную норму.

Максімальная тэмпература паветра днём склала плюс 26-32 градусы. Своеасаблівы рэкорд дня быў устаноўлены ў Лельчыцах, дзе слупок тэрмометра днём падняўся да 32 градусаў. Мінімальная тэмпература паветра ноччу склала каля плюс 20 градусаў. У Касцюковічах было 16 градусаў цяпла

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАЛЯЦЕЛА І ПАДТАПІЛА

У Магілёўскай вобласці ўначы з 11 на 12 ліпеня шквалісты вецер хуткасцю да 16 метраў за секунду назіраўся ў Бабруйску і Горках. У Бабруйску, да таго ж, за ноч выпала рэкордная колькасць ападкаў — 35 міліметраў, што складае 125% ад дэкаднай нормы.

Паводле інфармацыі Магілёўскага УМНС, у Бабруйску аказаліся падтопленымі 104 падворкі на 72 вуліцах і завулках. Прыпынены рух тралейбусаў на двух маршрутах. Улады правялі пасяджэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях. У горадзе (звесткі на другую палову дня 12 ліпеня) на ліквідацыі наступстваў моцных дажджоў працавалі 26 адзінак тэхнікі, 18 мотапомпаў, 77 чалавек.

Ілона ІВАНОВА.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШУКА.

У вёсцы Радзюкі Шаркаўшчынскага раёна дагэтуль бытуе звычай смажыць бліны ці яешню на калодзе. Арыгінальнае і простае старажытнае вынаходніцтва стала візітоўкай клуба аматараў нацыянальнай кухні «Груца», у якой удзельнічае Алена МАІСЕЕВА *(на фотаздымку)*. Нядаўна жыхарам фестывальнага Віцебска ўдалося пакаштаваць пышных радзюкоўскіх блінцоў.

У ВІЦЕБСКУ ЗОРКІ НАРАДЖАЮЦЦА, ЯК БЛІНЫ ПЯКУЦЦА

З НАКАВАЙ падзеяй юбілейнага «базара» стаў святочны канцэрт «З юбілеем, фестываль!» з удзелам лаўрэатаў і пераможцаў міжнародных конкурсаў «Віцебск — 1992—2010». Цікава, а што даў «базар» цяперашнім «зоркам»? Чым яны займаюцца, якія навіны ў іх творчым і асабістым жыцці?

— Я ўладальніца двух Гран-пры. Другі Гран-пры — гэта маё каханне, якое я знайшла ў Віцебску, мой цяперашні муж (вядомы спявак), — гаворыць **Святлана СЛАЎКАВІЧ (Сербія)**, Гран-пры 1997 года. — «Базар» я шчыра люблю. Дзякуй за мае Гран-пры, «Славянскі базар»! Дзякуй, Віцебск!

— Я жыву ў ЗША. Вучуся ў адной з самых прэстыжных у ЗША акцёрскіх школ і музычным інстытуце, — расказвае **Тэона ДОЛЬНІКАВА (Расія)**, Гран-пры 2001 года. — Сабрала гурт. Пішам музыку. Безумоўна, хочам стаць вядомымі на ўвесь свет «зоркамі». Агучвала мультфільм кампаніі Дыснея.

— Галоўнае — правільна ўспрымаць перамогу. І ведаць, што рабіць далей. Несумненна, перамагчы на «базары» было вельмі прыемна, — дзеліцца ўспамінамі **Максім САПАЦЬКОЎ (Беларусь)**, Гран-пры 2003 года. — Многае змянілася. Выступаю пад творчым псеўданімам Макс Лоранс. Хачу пажадаць усім тым выканаўцам, якія толькі пачынаюць, удачы. Яны вельмі дастойныя спевакі — мяне вельмі ўразілі. Хочацца, каб у краінах, якія яны прадстаўляюць, ганарыліся імі. Хочацца пажадаць, каб на ўсё жыццё яны захавалі памяць аб выступленні ў Віцебску. На цяперашнім фестывалі адбылася прэм'ера маёй песні, якую напісаў яшчэ восем гадоў таму ў цягніку.

— Калі стаў уладальнікам Гран-пры, многага дасягнуў, — расказвае **Пётр ЯЛФІМАЎ (Беларусь)**, Гран-пры 2004 года. — Для мяне «Базар» стаў стартавай пляцоўкай у маёй кар'еры спевака. Добры старт.

— Я перамагла, калі была яшчэ зусім юнай. Мне тады было ўсяго 17 гадоў, — дзеліцца ўспамінамі **Наталля КРАСНЯНСКАЯ (Украіна)**, Гран-пры 2007 года. — Палюбіла Віцебск. І было нават такое, што закахалася тут. Праўда, цягнулася гэта нядоўга. Мне заўсёды прыемна тут бываць. Сустракацца са знаёмымі мне людзьмі. Дарэчы, я таксама агучваю ўкраінскую версію мультфільмаў знакамітай студыі Дысней.

— Вельмі прыемна быць тут, кожны год вяртацца сюды. Акрамя ўсяго іншага, у Віцебску жыве мая бабуля, так што «Базар» для мяне — фактычна родны дом, — расказвае **Паліна СМОЛАВА (Беларусь)**, Гран-пры 2005 года. — Віцебск — мая другая радзіма. Зараз я жыву ў Маскве. Выйшла замуж.

— На жаль, не ўсе ў Літве ведаюць пра фестываль у Віцебску, — расказвае **Донатас МАНТВІДАС (Літва)**, Гран-пры 2008 года. — Памятаю, баяўся гледачоў, выходзіць на сцэну. Але ж здолеў сабрацца і перамог. Пішу песні, вершы, займаюся аранжыроўкай. Перамог у шоу «Танцы з зоркамі». Шмат падзей у маім жыцці. Стараюся развівацца як спявак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Водгукі «Базару»

ТРЭБА СЯБРАВАЦЬ КУЛЬТУРНА

Беларусь зацікаўлена ў двухбаковым супрацоўніцтве з Украінай у рамках рэгіянальнай праграмы Савета Еўропы «Кіеўская ініцыятыва».

Пра гэта і не толькі ішла гаворка ў Віцебску падчас сустрэчы міністраў культуры дзвюх краін Паўла Латушкі і Міхаіла Кулыняка. Калі міністры культуры прыязджаюць у Віцебск, то стараюцца скарыстаць выдатную магчымасць вырашыць адразу некалькі спраў.

Павел Латушка, міністр культуры Беларусі, і яго ўкраінскі калега Міхаіл Кулыняк не проста прыехалі «пабазарыць» у Віцебск, а мелі рабочую сустрэчу, дзе абмяркоўвалі пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы культуры. Беларусь, напрыклад, зацікаўлена ў супрацоўніцтве з вядучымі ВНУ Украіны ў сферы культуры: была б выдатная магчымасць замежных стажыровак для студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў беларускіх вышэйшых навучальных устаноў сферы культуры і мастацтва. І паколькі ў нашай краіне заканадаўча ствараюцца больш спрыяльныя ўмовы для развіцця кінагаліны, то гэта можа зацікавіць кінематаграфістаў з Украіны, якія маглі б стаць патэнцыйнымі партнёрамі. Таксама абмяркоўвалася пытанне абменных гастроляў паміж Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы і Нацыянальным тэатрам імя Івана Франко. Бібліятэкі, музеі, іншыя ўстановы культуры Беларусі і Украіны таксама зацікаўлены ў супрацоўніцтве.

Супрацоўнічаць нас вымушае і агульная памяць, і сённяшняе жыццё. Лепшы прыклад з апошніх значных акцый — усталяванне ў Кіеве помніка беларускаму пісьменніку Уладзіміру Караткевічу паводле ініцыятывы Міністэрства культуры нашай краіны, але пры садзейнічанні ўкраінскага боку.

Ларыса ЦІМОШЫК.

БПС-БАНК

В связи с повышением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, ОАО «БПС-Банк» с 13 июля 2011 года устанавливает следующий размер процентов по вновь привлекаемым и действующим депозитам физических лиц в белорусских рублях:

Наименование	Срок привлечения	Размер процентов (годовых)		
депозит и карт-счет «Пенсионный»	до востребования	20% (СР)		
«Баланс интересов»	1 год	за 1-й – 4-й месяцы	за 5-й – 10-й месяцы	за 11-й – 12-й месяцы
		27% (СР + 7)	28% (СР + 8)	29% (СР + 9)
«Перспективный»	18 месяцев	29% (СР+9)		
«К совершенно-летию»	2 года	23% (СР + 3)		
	3 года	24% (СР + 4)		

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:

- **148** (в стационарной сети);
- МТС **(029) 5-148-148, 2-148-148**;
- Velcom **(044) 77-00-148, 77-55-148**.

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2010 г. (млрд. руб.): январь – 6,1; февраль – 6,3; март – 7,3; апрель – 6,6; май – 6,9; июнь – 7,0; июль – 7,3; август – 8,1; сентябрь – 7,6; октябрь – 7,1; ноябрь – 7,2; декабрь – 6,5.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 08.06.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк»

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПУЦІН: ЗША ПРОСТА ХУЛІГАНЯЦЬ, УКЛЮЧАЮЧЫ СВОЙ ДРУКАРСКІ СТАНОК

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін назваў хуліганствам спробы ЗША вырашыць свае бюджэтныя праблемы за кошт дадатковай эмісіі валюты. Адпаведную заяву ён зрабіў на сустрэчы з эканамістамі Расійскай акадэміі навук у Маскве.

«Мы, дзякуй богу ці па няшчасці, не можам друкаваць рэзервовыя валюты. А яны што робяць? Хуліганяць проста, станок уключаюць і раскідваюць на ўвесь свет, вырашаючы свае першачарговыя задачы», — сказаў Пуцін. Ён таксама дадаў, што ЗША выкарыстоўваюць сваю «манаполію» на друкаванне грошай «па поўнай праграме».

ЖЫХАРЫ ЛІТВЫ ЎСЁ МЕНШ ВЕРАЦЬ У РЫНКАВУЮ ЭКАНОМІКУ І ДЭМАКРАТЫЮ

У Літве скарацілася колькасць людзей, якія лічаць свабодны рынак і дэмакратыю лепшай палітычнай сістэмай, паведамляюць інфармагенцтвы.

Даследаванне Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця і Сусветнага банка, праведзенае ў 29 краінах — посткамуністычных, балканскіх і былога Варшаўскага дагавору, паказала, што ў Літве колькасць прыхільнікаў дэмакратыі за апошнія чатыры гады моцна паменшылася: калі ў 2006 годзе іх было каля 55%, то ў 2010 годзе — ужо 40%. Менш прыхільнікаў дэмакратыі, чым у Літве, толькі ў Расіі, Латвіі і Сербіі.

Прыхільнікаў рынкавай сістэмы эканомікі ў Літве аказалася і таго менш — толькі 34% рэспандэнтаў лічаць рынкавую эканоміку лепшай эканамічнай сістэмай. У 2006 годзе такіх было 40%. Значна больш расчараваных у рынку аказалася сярод жыхароў такіх краін, як Польшча, Харватыя, Румынія, Расія, Сербія і Латвія.

ГАЗЕТЫ МЭРДАКА ШПІЁНІЛІ ЗА БЫЛЫМ БРЫТАНСКІМ ПРЭМ'ЕРАМ БРАЎНАМ

Яшчэ дзве газеты медыяімперыі Руперта Мэрдака аказаліся ўцягнутымі ў скандал з праслухоўваннем тэлефонаў. Паводле інфармацыі брытанскіх CMI, The Sunday Times і The Sun шпіёнілі за былым прэм'ер-міністрам краіны Гарданам Браўнам.

Паліцыя праінфармавала былога прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Гордана Браўна пра тое, што выданні The Sunday Times і The Sun, як мяркуецца, таксама незаконна атрымлівалі інфармацыю пра асабістыя справы экс-прэм'ера ў той час, калі ён займаў пасаду міністра фінансаў. «Браўну прадстаўлена інфармацыя пра ўмяшанне ў асабістае жыццё», — заявіў прэс-сакратар экс-прэм'ера. Сям'я шакіравана маштабамі крымінальнай актыўнасці і незаконнай дзейнасці, накіраванымі на збор асабістых звестак.

Паводле інфармацыі інтэрнэт-партала радыёстанцыі «Рэха Масквы», Руперт Мэрдак разглядае магчымасць продажу ўсіх прыналежных яму брытанскіх газет. Пра гэта паведаміў амерыканскі журналіст і біёграф медыямагната Майкл Вулф. Прыняць гэта рашэнне Мэрдак можа з-за скандалу з праслухоўваннем тэлефонных гутарак супрацоўнікамі газеты News of the World, якая была закрыта па рашэнні медыямагната.

КОШТ ПЛАТНАГА НАВУЧАННЯ Ў ВНУ Ў НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ БУДЗЕ ПАВЫШАНЫ Ў МЕЖАХ 20 ПРАЦЭНТАЎ

ПЕРШЫ намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр ЖУК адзначыў, што павышэнне кошту навучання неабходна для забеспячэння нармальнага функцыянавання ўстаноў. Паводле яго слоў, павышэнне кошту да 20 працэнтаў — гэта мінімум, які дасць магчымасць нармальна функцыянаваць ВНУ краіны.

Аляксандр Жук таксама адзначыў, што ў розных ВНУ павышэнне цаны можа адрознівацца. «Кожная ВНУ павялічвае кошт у залежнасці ад сваіх рэальных затрат», — растлумачыў ён. У прыватнасці, у БДУ прынята ўжо рашэнне, што з новага навучальнага года плата за навучанне павысіцца толькі на 11 працэнтаў.

Паводле слоў першага намесніка міністра, цяпер прадугледжваецца змяненне суадносін па падрыхтоўцы спецыялістаў на дзённай і завочнай форме ў прыватных ВНУ.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.07.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	5 004,00	1 чэшская крона	286,52
▼ 1 еўра	6 948,55	1 польскі злоты	1 717,23
1 латвійскі лат	9 795,44	▼ 1 расійскі рубель	176,30
1 літоўскі літ	2 012,59	1 украінская грыўня	626,28

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ

USD	28,3842
10 UAH	35,5313
10000 BYR	56,8822
EUR	39,5051

Агенцтва Уладзімира Гуцалюка

«АДКАЗЫ НА ПІСЬМОВЫЯ ЗВАРОТЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫКЛАДЗЕНЫ НА МОВЕ ЗВАРОТУ»

Міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь Віктар ГАЛАВАНАЎ праспавёў пра ўжо прынятыя альбо магчымыя змены ў асобных законах і кодэксах нашай краіны.

Так, паводле яго слоў, праект новага Кодэкса аб шлюбе і сям'і, мяркуецца, скароціць тэрмін чакання для рэгістрацыі маладажонаў.

— Зараз у нас тэрмін ад 15 дзён. Тры месяцы ўжо мала хто дае. Згодна з новым кодэксам, які дэпутаты ўжо падтрымалі ў першым чытанні, будзе тэрмін ад трох дзён, калі ёсць адпаведныя дакументы. Напрыклад, калі муж альбо жонка з'язджае некуды на пастаяннае месца жыхарства. Гэта будзе вырашаць службовая асоба загса. Што тычыцца скасавання шлюбу, то ў некаторых выпадках будзе прадастаўлена магчымасць суду скасоўваць шлюб у той тэрмін, які просяць заяўнікі. Але гэта калі няма спрэчкі аб дзецях, іх пражыванні, няма значнага аб'ёму маёмасці і г.д.

Праблемай зараз з'яўляецца, паводле слоў Віктара Галаванава, і работа судоў па спагнанні грашовых сродкаў з даўжнікоў. Значная іх колькасць наўмысна ўхіляецца ад выканання грашовых абавязкаў. Пры гэтым яны раз'язджаюць на дарагіх машынах, жывуць у асабняках і выдатна абстаўленых кватэрах.

— Даўжнікі навучыліся ўтойваць сваю маёмасць, афармляць яе на іншых асоб, працаваць без афармлення працоўных адносін і такім чынам утойваць свой заробак. Мы бачым гэтыя праблемы, пастаянна ўносім прапановы па ўдасканаленні заканадаўства. Зараз, да прыкладу, унеслі прапановы па карэкціроўцы Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса. Прапаноўваем прадугледзець, у прыватнасці, часовае абмежаванне права даўжніка на кіраванне механічным транспартным сродкам адпаведнай катэгорыі, забарону выдачы даўжніку пасведчання кіроўцы.

Падобныя абмежаванні мяркуецца ўстанавіць таксама ў дачыненні права кіравання маламернымі судамі і права палявання. Выключэнне складуць даўжнікі, якія выкарыстоўваюць транспартныя сродкі ў сувязі з інваліднасцю альбо ў якасці адзінага сродку для атрымання прыбытку. Дадаткова прапанавалі ўстанавіць адміністрацыйную адказнасць за прадастаўленне даўжніком непраўдзівых звестак аб сваіх правах на маёмасць і аб непаведамленні аб звальненні з працы, аб новым месцы працы, месцы атрымання пенсіі, іншых даходаў ці месцы жыхарства.

У нашай рэспубліцы даўно наспела неабходнасць прыняцця новага Жыллёвага кодэкса. Міністр юстыцыі адзначыў некалькі асноўных асаблівасцяў новага законапраекта.

— Праект Кодэкса прадугледжвае для ўласнікаў жылога памяшкання, якія ўхіляюцца без уважлівых прычын на працягу не менш чым тры месяцы запар ад поўнай платы за камунальныя паслугі, прымусовае (па рашэнні суда) яго адчужэнне. Істцом па такіх справах будзе выступаць мясцовы выканаўчы і распарадчы орган.

— У прыватнасці, праектам Жыллёвага кодэкса прадугледжана права суда прыняць рашэнне аб прымусе адчужэння ўласнікам, які не пагасіў запазычанасць за камунальныя паслугі, свайго жылога памяшкання. У выпадку, калі на працягу года пасля ўступлення ў законную сілу рашэння суда памяшканне не будзе адчужана, яно падлягае прымусоваму продажу з публічных таргоў.

Таксама ў новай рэдакцыі Кодэкса прадугледжана магчымасць прымусовага высялення асоб, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. Калі грамадзянін робіць немагчымым пражыванне іншых асоб у доме, на працягу трох месяцаў запар не ўносіць плату за камунальныя паслугі, мясцовыя выканкамы будуць мець права звярнуцца ў суд з іскам аб прымусе ўласніка да адчужэння жылога памяшкання.

— Акрамя таго, у праекце прадастаўляецца права як уласніку жылога памяшкання, так і мясцовым органам улады здаваць жылыя памяшканні за плату ў часовае карыстанне на аснове дагавора арэнды жылога памяшкання. У цяперашнім заканадаўстве прадугледжана здача жылля толькі ў наём. Мяркую, што гэтая норма будзе садзейнічаць развіццю арэндных адносін у рэспубліцы і дапаможа вырашыць грамадзянам праблемы за кошт магчымага зніжэння платы за жыллё пры заключэнні дагавора арэнды жылога памяшкання.

30 чэрвеня на пасяджэнні Савета Рэспублікі быў адобраны законапраект «Аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб». Акрамя прадугледжаных дзейным заканадаўствам пісьмовай і вуснай формы звароту, праектам закона ўводзіцца рэгуляванне электроннай формы звароту. Гэта звязана, як адзначыў міністр юстыцыі, з тым, што сёння многія дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі маюць афіцыйныя інтэрнэт-сайты, электронныя адрасы, электронная форма звароту атрымала шырокае прымяненне на практыцы. Законапраект устанаўлівае абавязак для дзяржаўных органаў і арганізацый разглядаць электронныя звароты ў парадку, вызначаным для пісьмовых зваротаў. Пісьмовыя адказы на пісьмовыя звароты павінны быць выкладзены на мове звароту.

Адным з нововвядзенняў закона з'явілася прадстаўленне права па рашэнні кіраўніка органа, арганізацыі прымяняць пры ажыццяўленні асабістага прыёму аўдыя- і відэазапіс, кіна- і фотаздымку. Гэта магчыма пры ўмове, што заяўнік будзе праінфармаваны аб прымяненні тэхнічных сродкаў да пачатку прыёму. Такая норма накіравана як на абарону правоў грамадзян, так і інтарэсаў дзяржаўных органаў, паколькі дазволіць выключыць бяздоказныя спасылкі на злоўжыванні падчас правядзення асабістага прыёму службовымі асобамі.

Яшчэ адной інавацыяй праекта закона з'явілася заканадаўчае замацаванне права заяўніка адклікаць свой зварот у любы час да разгляду звароту па сутнасці.

Надзея ДРЫЛА.

Сярод загінулых на цеплаходзе «Булгарыя» сваякі апазналі беларускую грамадзянку

Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі.

Паводле інфармацыі аддзялення беларускага пасольства ў Расіі, у горадзе Казань учора раніцай сярод знойдзеных цел загінулых сваякі апазналі грамадзянку Беларусі. У сувязі з тым, што дакументы грамадзян Беларусі, якія знаходзіліся на патанулым судне, зніклі, цяпер аддзяленне пасольства займаецца афармленнем усіх неабходных дакументаў, а таксама пытаннямі дастаўкі цела загінулай на радзіму. Як паведамлялася раней, у спісах тых, хто знаходзіўся на патанулым на Волзе цеплаходзе «Булгарыя», было два грамадзяніны Беларусі, адзін з якіх застаўся жывы. Пасажырскі цеплаход «Булгарыя», на борце якога знаходзілася больш як 170 чалавек, патануў 10 ліпеня днём на Волзе.

АЗЕРБАЙДЖАНСКАЯ НАФТА ЎЖО Ў БЕЛАРУСІ

Азербайджанская лёгкая нафта гатунку «Айзеры лайт» пачала паступаць на лінейную вытворча-дыспетчарскую станцыю (ЛВДС) «Мазыр» ААТ «Гомельтранснафта Дружба», адкуль яе па меры назапашвання будзе браць Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. Такім чынам, азербайджанская нафта можа паступіць на прадпрыемства ўжо на днях, паведамілі БЕЛТА ў ААТ «Мазырскі НПЗ».

Пакуль рана гаварыць, калі сапраўды пачнецца перапрацоўка. Для гэтага на заводзе павінен быць назапашаны пэўны аб'ём нафты. Хутчэй за ўсё, прадпрыемства пачне перапрацоўку азербайджанскай нафты ўжо на гэтым тыдні.

Азербайджанскую нафту «Айзеры лайт» Мазырскі НПЗ будзе перапрацоўваць гэтак жа, як і венесуэльскую, у сумесі з расійскай сыравінай «Юралс», па адпрацаванай прадпрыемствам тэхналогіі. «Айзеры лайт» мае высокі патэнцыял выпрацоўкі светлых нафтапрадуктаў.

Лінейная вытворча-дыспетчарская станцыя «Мазыр» — галаўная станцыя ААТ «Гомельтранснафта Дружба». Тут нафтавы паток, які ідзе ад усходняй граніцы Беларусі, разгалінуецца: частка яго прадаўжае рух на захад — у Польшчу і Германію, частка накіроўваецца на поўдзень — ва Украіну, Венгрыю, Славакію, Чэхію. Адсюль жа сыравіна паступае на Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. На ЛВДС «Мазыр» паступае не толькі расійская і казахстанская нафта, але і нафта, здабытая ў радовішчах «Рэчыцанафты». Нафта па трубаправодах паступае ў рэзервуарны парк станцыі, які ўяўляе сабой 26 рэзервуараў рознай ёмістасці, дзе можа захоўвацца каля 300 тыс. т нафты.

Кантракт на пастаўку нафты з Азербайджана заключаны паміж ЗАТ «Беларуская нафтавая кампанія» і Дзяржаўнай нафтавай кампаніяй Азербайджана (SOCAR). Па гэтым кантракце ў 2011 годзе будзе пастаўлена да 4 млн т нафты. Дастаўка ажыццяўляецца ў порт «Паўднёвы» (Украіна), а потым трубаправодным транспартам Адэса—Броды і «Дружба» — на Мазырскі НПЗ. Дагавор на прапампоўку вуглевадародnай сыравіны з выкарыстаннем нафтаправода Адэса—Броды заключаны паміж ЗАТ «Беларуская нафтавая кампанія» і ААТ «Укртранснафта».

Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Свіціну Уладзіміру Уладзіміравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — **СМЕРЦЮ БАЦЬКІ**.

КОШТ ПЛАТНАГА НАВУЧАННЯ Ў ВНУ Ў НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ БУДЗЕ ПАВЫШАНЫ Ў МЕЖАХ 20 ПРАЦЭНТАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У гэтым годзе плануецца набраць не больш як 60 працэнтаў абітурыентаў на завочную форму навучання, раней гэта лічба дасягала 70 працэнтаў. Астатнія абітурыенты будуць залічвацца на дзённую форму навучання. У перспектыве **колькасць абітурыентаў-завочнікаў будзе змяншацца ва ўсіх ВНУ краіны,** сказаў Аляксандр Жук. У першую чаргу гэта дасць магчымасць значна палепшыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. «Мы за колькасцю не гонімся», — падкрэсліў першы намеснік міністра. Паводле яго слоў, скарочаны набор на юрыдычныя і эканамічныя спецыяльнасці і набор замежных студэнтаў.

Аляксандр Жук паведаміў, што лічбы прыёму ў ВНУ краіны апошнім часам стабілізаваліся. У гэтым годзе набор абітурыентаў на бюджэтную дзённую форму навучання скарочаны на 300 чалавек, на платную — на 800 чалавек.

Гаворачы аб **размеркаванні выпускнікоў**, Аляксандр Жук адзначыў, што гэтыя пытанні адрэгуляваны ў адукацыйным кодэксе, які ўступае ў дзеянне з 1 верасня. «З верасня мы пераходзім на падрыхтоўку спецыялістаў на дагаворнай аснове. Усе студэнты будуць заключаць дагаворы, у якіх будуць агаворвацца ў тым ліку пытанні размеркавання», — праінфармаваў ён.

Калі выпускнік ВНУ, бюджэтнік, адмаўляецца працаваць па размеркаванні, у гэтым выпадку прадугледжана кампенсацыя кошту навучання. Выпускнік павінен вярнуць дзяржаве сродкі, затрачаныя на яго падрыхтоўку. Калі ён адмаўляецца кампенсаваць сродкі, пытанне будзе разглядацца ў судовым парадку. У кожнай установе адукацыі будзе створана камісія, якая прыме рашэнне або аб кампенсацыі сродкаў дзяржаве, або аб вызваленні ад кампенсацыі.

У ВНУ другога патоку як дзяржаўнай, так і прыватнай форм уласнасці (акрамя завочнай і вячэрняй формы атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю) на ўсе формы атрымання адукацыі дакументы будуць прымацца з 16 па 25 ліпеня (на ваенныя факультэты — з 16 па 23 ліпеня).

Да ВНУ **другога патоку** належаць вышэйшыя навучальныя ўстановы дзяржаўнай і прыватнай форм уласнасці, за выключэннем ВНУ МУС, МНС, міністэрстваў абароны і культуры. Абітурыенты павінны паступаць у ВНУ тры сертыфікаты ЦТ або два, калі ў ВНУ будзе праведзены ўнутраны экзамен па прадмеце. Унутрывузаўскія экзамены чакаюць абітурыентаў толькі па творчых дысцыплінах (малюнак, музыка, танец, сачыненне і інш.), літаратуры і фізічнай культуры.

Пры паступленні на спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «праваznаўства», «эканамічнае права», «журналістыка» (у тым ліку калі яна з'яўляецца дадатковай спецыяльнасцю), «міжнародная журналістыка», «мытная справа» трэба мець спецыяльную рэкамендацыю пасля праходжання прафесійна-псіхалагічнай гутаркі. Гэты дакумент павінны мець усе, хто выбраў дзённую, вячэрнюю або завочную формы атрымання адукацыі (у тым ліку дыстанцыйную), навучанне за скарочаныя тэрміны, а таксама тыя, хто будзе вучыцца на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі.

Пры паступленні абавязкова будзе ўлічвацца **сярэдні бал дакумента аб адукацыі**. Такім чынам залічэнне абітурыентаў у ВНУ на навучанне за кошт сродкаў бюджэту і на ўмовах аплаты на месцы па ўсіх формах атрымання адукацыі праводзіцца па конкурсе на аснове агульнай сумы балаў, падлічанай па выніках здачы ўступных іспытаў і сярэдняга бала дакумента аб адукацыі.

Ад абітурыентаў, якія вытрымалі ўступныя іспыты, але **не прайшлі па конкурсе на дзённую бюджэтную форму** навучання, для ўдзелу ў конкурсе ў гэтай жа ВНУ на завочную і вячэрнюю формы атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту (акрамя ВНУ сельскагаспадарчага профілю) дакументы будуць прымацца па 2 жніўня. Ад абітурыентаў, якія вытрымалі ўступныя іспыты, для ўдзелу ў конкурсе на дзённую, завочную і вячэрнюю формы атрымання адукацыі на ўмовах аплаты — па 4 жніўня.

Залічэнне па **раздзельным конкурсе абітурыентаў** — выпускнікоў гарадскіх і сельскіх устаноў адукацыі будзе ажыццяўляцца толькі на бюджэтныя месцы. Залічэнне абітурыентаў на ўмовах аплаты будзе праходзіць па агульным конкурсе.

Як падкрэсліў Аляксандр Жук, апошнія гады ў абітурыентаў **узрастае цікавасць да спецыяльнасцяў тэхнічнага, будаўнічага, тэхналагічнага профіляў, інфармацыйных тэхналогій.** Аб гэтым сведчыць значнае павелічэнне конкурсу на гэтыя спецыяльнасці і павышэнне прахадных балаў. У гэтым годзе некаторыя беларускія ВНУ, у прыватнасці БДУ, БДУІР, БНТУ адкрываюць набор на некалькі суперсучасных спецыяльнасцяў, у тым ліку ў сферы нана- і біятэхналогій, касмічнай індустрыі, іншых інавацыйных сферах. Для ўсіх гэтых спецыяльнасцяў ВНУ падрыхтавалі ўжо адпаведны кадравы склад: вучоных, педагогаў, метадыстаў.

Беларускія ВНУ прыватнай формы ўласнасці ў 2011 годзе павялічаць прыём на дзённыя аддзяленні. Паводле слоў першага намесніка міністра, калі ў мінулым годзе прыём на завочную форму навучання ў ВНУ прыватнай формы ўласнасці складаў амаль 70 працэнтаў ад агульнага прыёму (у некаторых ВНУ паказчык дасягаў да 90 працэнтаў), то ў гэтым годзе на завочную форму навучання ў прыватныя ВНУ будзе прынята не больш як 60 працэнтаў першакурснікаў. «Перад міністэрствам пастаўлена задача скараціць колькасць студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі ў гэтых ВНУ да 25 працэнтаў, што паступова будзе рэалізавана», — адзначыў Аляксандр Жук і падкрэсліў, што пры гэтым колькасць месцаў на дзённым аддзяленні ў гэтых ВНУ будзе павялічвацца. У прыватныя ВНУ запланавана прыняць больш як 14 тыс. студэнтаў, з іх на дзённую форму атрымання адукацыі — 6 тыс., завочную — 9 тыс.

Гэтым летам прыём на ўзровень вышэйшай адукацыі будуць ажыццяўляць 55 вышэйшых навучальных устаноў: 45 дзяржаўнай формы ўласнасці, 10 — прыватнай. На ўсе формы атрымання адукацыі ў ВНУ запланавана прыняць амаль 105 тыс. чалавек, у тым ліку на дзённую форму 57,2 тыс. (у параўнанні з мінулым года прыём павялічыўся на 2,8 тыс.), на завочную — 48,1 тыс. студэнтаў. На навучанне за кошт сродкаў бюджэту запланавана прыняць 32,9 тыс. студэнтаў, што на 1 тыс. менш, чым у мінулым годзе, з іх на дзённую форму — 25 тыс., завочную — 7,9 тыс. чалавек.

МІНІНФАРМ АДКЛІКАЎ З ВГС ІСК АБ СПЫНЕННІ ВЫПУСКУ «НАШАЙ НІВЫ»

Міністэрства інфармацыі Беларусі адклікала з Вышэйшага гаспадарчага суда іскавую заяву аб спыненні выпуску газеты «Наша Ніва», паведамілі БЕЛТА ў міністэрстве.

Іск адкліканы «ў сувязі са зваротам рэдакцыі выдання і магчымасцю пазасудовага ўрэгулявання сітуацыі, зыходзячы з прынцыпу свабоды сродкаў масавай інфармацыі», растлумачылі ў Мінінфарме. Разам з тым тут падкрэслілі, што патрабаванні Міністэрства інфармацыі да рэдакцыі гэтага СМІ абгрунтаваныя і прад'яўлены ў адпаведнасці з нормамі Закона «Аб сродках масавай інфармацыі» ў сувязі з неаднаразовым парушэннем яго палажэнняў.

Абзац

◢ За паўгода ў Беларусі на чыгунцы пацярпелі 107 чалавек. З іх 52 чалавекі загінулі, 38 атрымалі траўмы, а 17 скончылі жыццё самагубствам.

◢ **У Маладзечанскім раёне аўтамабіль МАЗ камбіната хлебапрадуктаў урэзаўся ў будынак Цюрлёўскага сельскага савета. 48-гадовы кіроўца грузавіка загінуў на месцы здарэння. Іншых пацярпелых няма. Прычыну трагедыі высвятляе міліцыя. Прычына смерці шафёра пакуль не ўстаноўлена.**

◢ У рэанімацыю мінскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі 11 ліпеня быў прывезены трохгадовы хлопчык, які сур'ёзна пацярпеў у выніку аўтааварыі. Дзіця было пасажырам аўтамабіля «Опель Зафіра», якім кіраваў яго бацька. ДТЗ адбылося прыкладна ў дзве гадзіны дня. П'яны кіроўца «Опеля» сутыкнуўся з грузавіком «МАН», які рухаўся ў спадарожным кірунку. Пасля гэтага «Опель» працягнуў рух і яшчэ раз сутыкнуўся з аўтамабілем «Фальксваген Пасат». У выніку аварыі хлопчык атрымаў адкрытую чэрапна-мазгавую траўму цяжкай ступені, удар галаўнога мозга і пералом асновы чэрапа.

◢ **У Браславе здарыўся пажар на гандлёвым рынку, што належыць прыватнаму прадпрыемству «Віталіч». Інцыдэнт адбыўся ў 5 гадзін вечара. Пажар узнік у гандлёвым павільёне. У выніку агнём знішчана 45 гандлёвых месцаў. Пацярпелых няма, прычыны высвятляюцца.**

◢ Аўтамабіль Volkswagen Passat збіў двух веласіпедыстаў. Кіроўца паспрабаваў збегчы. ДТЗ адбылося ў в.Сялец Магілёўскага раёна. У выніку аварыі адзін веласіпедыст (хлопец 1993 г.н.) загінуў, другі дастаўлены ў бальніцу. Беглага кіроўцу ўдалося хутка затрымаць. Як аказалася, ён жыў у той жа вёсцы Межысеткі, што і пацярпелыя.

Поўны абзац

◢ **У Англіі пчолы «ўзялі ў палон» наведвальнікаў кандытарскай — рой дзікіх насякомых заблакіраваў усе выхады. Насякомыя абляпілі вітрыны і дзверы ўстановы так шчыльна, што наведвальнікі нават не бачылі, што адбываецца звонку. У такой «асадзе» пакупнікам і персаналу давялося правесці цэлых тры гадзіны. Людзей раздражняў і шум ад насякомых — па словах відавочцаў, ён нагадваў роў самалёта. Дзверы і вокны давялося забарыкадаваць каробкамі, бо «палоннікі» баяліся, што пчолы ўварвуцца ў памяшканне. Спецыялісты, якія прыбылі рataваць «асаджаных», справіліся са сваёй задачай на працягу некалькіх хвілін. Па меркаванні экспертаў, пчолы прыляцелі ўслед за маткай, аднак пакуль невядома, адкуль узяўся такі гіганцкі рой.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Спорт-тайм

БАТЭ ЗНОЎ ЕДЗЕ НА ПОЎНАЧ

Сёння ў Белфасце барысаўскі БАТЭ правядзе першы матч другога кваліфікацыйнага раўнда розыгрышу Лігі чэмпіёнаў сезону 2011-2012 супраць чэмпіёна Паўночнай Ірландыі клуба «Лінфілд». Іншыя першыя матчы раўнда адбыліся ўчора ўвечары.

ЮРЫЙ ПУНТУС ПАКІДАЕ БРЭСТ

Галоўны трэнер брэсцкага «Дынама» Юрый Пунтус пасля чарговага паражэння сваёй каманды падаў у адстаўку, і ўчора на пасяджэнні праўлення клуба яна была прынята. Выконваць абавязкі галоўнага трэнера прызначаны Сяргей Кавальчук.

ПЕРШАЯ ПЕРАМОГА

Баскетбалісткі моладзевай зборнай Беларусі (да 20 гадоў) атрымалі першую перамогу на чэмпіянаце Еўропы ў Сербіі.

У першым матчы турніру за 13-16-я месцы нашы спартсменкі перайгралі каманду Румыніі — 64:50. Учора ўвечары беларускі сустракаліся з камандай Германіі. На папярэднім этапе кантынентальнага першынства нашы баскетбалісткі пацярпелі тры паражэнні — ад Галандыі (42:75), Францыі (52:81) і Італіі (51:82), заняўшы апошняе месца ў групе С.

МАРАДОНА ТРАПІЎ У АВАРЫЮ

Легендарны футбаліст і былы галоўны трэнер зборнай Аргенціны Дыега Марадона трапіў у аўтааварыю на ўскраіне аргенцінскай сталіцы Буэнас-Айрэс.

Машына цяперашняга настаўніка клуба «Аль-Васл» з ААЭ па нявысветленых прычынах сутыкнулася з аўтобусам. Аднак Марадона, які накіроўваўся ў бальніцу да сваёй маці, пазбег сур'ёзных траўмаў. Акрамя Марадоны, у аўтамабілі знаходзілася і яго сяброўка Вераніка Ахеда, якая таксама сур'ёзна не пацярпела.

УЦЕКАЧОЎ ЗАТРЫМАЛІ АГУЛЬНЫМІ СІЛАМІ

МУС Беларусі выказвае падзяку грамадскасці за дапамогу ў вышуку і затрыманні злачынцаў, якія 27 чэрвеня збеглі з ізалятара часовага ўтрымання Асіповіцкага РАУС.

На момант уцёкаў двое мясцовых жыхароў — Ш. (1978 г.н., раней неаднаразова судзімы) і Г. (1987 г.н., раней неаднаразова судзімы) былі асуджаны за крадзеж і дастаўляліся ў вышэйназваны аддзел міліцыі для правядзення следчых дзеянняў. На месца здарэння тэрмінова выбыла кіраўніцтва УУС Магілёўскага аблвыканкама, спецыялісты МУС. Асабовы склад асіповіцкай міліцыі быў падняты па трывозе. Да пошукавых мерапрыемстваў прыцягваліся і ваеннаслужачыя. Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў ад грамадзян была атрымана інфармацыя, дзякуючы якой 2 ліпеня праваахоўнікі затрымалі спадара Г. Бегламу злачынцу актыўна дапамагаў хавацца ад міліцыі яго знаёмы. У дачыненні да апошняга заведзена крымінальная справа, сам ён узяты пад варту. 11 ліпеня ў лясным масіве каля вёскі Дварок Асіповіцкага раёна быў затрыманы і Ш. Як і ў першым выпадку, не без дапамогі мясцовых жыхароў. Зараз абодва ўцекачы зноў размешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання Асіповіцкага РАУС.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Кватэрнае пытанне

ХТО КАМУ ПАВІНЕН ПЛАЦІЦЬ

Мы, маладая сям'я, летась, у сакавіку, унеслі першы ўзнос на будаўніцтва кватэры. Дом абяцалі здаць у снежні 2010 г., але работы замарозілі, а цяпер патрабуюць аплаціць яшчэ 10% ад кошту кватэры.

Пытанне, ці існуюць нарматыўныя тэрміны будаўніцтва і адказнасць за іх парушэнне?

В. МАТАЛЫГА, *Дзяржынскі раён.*

Працягласць будаўніцтва жылога дома залежыць ад шэрагу фактараў і характарыстык будынка (асаблівасці канструктыўнай схемы, паверхавасць, агульная плошча, наяўнасць падвала, тэхнічнага гарышча, убудаваных або прыбудаваных нежылых памяшканняў, працягласць падрыхтоўчага перыяду і ўзвядзення падземнай часткі будынка, умовы правядзення работ і інш.).

Працягласць будаўніцтва канкрэтнага жылога дома вызначаецца зыходзячы з гранічных нарматываў працягласці будаўніцтва жылых дамоў у адпаведнасці з Інструкцыяй, зацверджанай пастановай Мінбудархітэктуры ад 4 красавіка 2007 года № 7 (у рэдакцыі пастаноў ад 30 ліпеня 2007 г. № 13 і ад 22 снежня 2008 г. № 59) і пры наяўнасці адпаведнага абгрунтавання ўстанаўліваецца праектам арганізацыі будаўніцтва (ПАБ), а таксама ўказваецца ў дагаворы (кантракце) будаўнічага падраду, калі іншае не было прадугледжана ўмовамі таргоў па выбары падрадчыка.

Напрыклад, у адпаведнасці з названай Інструкцыяй (дадатак 2) гранічны нарматыў працягласці будаўніцтва жылых дамоў з канструкцый буйнапанэльнага і аб'ёмна-блочнага домабудавання складае для дзесяціпавярховага жылога дома агульнай плошчай 9000 тыс. кв. метраў серыі 90 — 7 месяцаў (серыі М-464 — 8 месяцаў).

Гранічны нарматыў працягласці будаўніцтва дзесяціпавярховага жылога дома агульнай плошчай 7000 тыс. кв. метраў з сценавых кладкавых выбараў складае 11,5 месяца, а такога ж дома маналітных сістэм — 9 месяцаў.

Што датычыцца адказнасці, то, у адпаведнасці з артыкулам 12.10 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, невыкананне службовымі асобамі юрыдычнай асобы або індывідуальнымі прадпрымальнікамі абавязацельстваў перад грамадзянамі па дагаворах на набыццё, будаўніцтва, рэканструкцыю жылых памяшканняў у тэрміны, прадугледжаныя названымі дагаворамі, цягне накладанне штрафу ў памеры ад пяцідзесяці да ста базавых велічынь.

У пісьме не названы прычыны затрымкі будаўніцтва дома. У вызначаных заканадаўствам выпадках устаноўлены дагаворам тэрмін уводу шматкватэрнага жылога дома ў эксплуатацыю можа працягвацца.

Напрыклад, пры долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў тэрмін уводу жылога дома ў эксплуатацыю вызначаецца ў дагаворы з улікам нарматыўных тэрмінаў будаўніцтва, прадугледжаных праектнай дакументацыяй, і не можа перавышаць трох гадоў з дня заключэння дагавора з дольшчыкам.

У выпадку, калі своечасоваму выкананню абавязацельстваў па дагаворы перашкаджалі пацверджаныя рашэннем суда або іншых упаўнаважаных дзяржаўных органаў надзвычайныя абставіны (іншыя, якія не залежаць ад бакоў), якія нельга прадухіліць, то працягласць тэрміну выканання абавязацельстваў прыпыняецца і з дня спынення такіх абставін працягваецца.

Калі будаўніцтва жылога дома не можа быць завершана ў вызначаны ў дагаворы тэрмін (пры адсутнасці віны забудоўшчыка), ён не пазней чым за два месяцы да заканчэння названага ў дагаворы тэрміну абавязаны накіраваць дольшчыку адпаведную інфармацыю і прапанову аб унясенні змянення ў дагавор. Змяненне прадугледжанага дагаворам тэрміну ажыццяўляецца шляхам падпісання дадатковага пагаднення да дагавора, у якім прадугледжваецца змяненне тэрміну будаўніцтва і іншых звязаных з гэтым умоў дагавора.

У любым выпадку кантроль за парадкам заключэння і выканання бакамі дагавораў будаўніцтва павінен ажыццяўляцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, якія выдалі забудоўшчыку дазвольную дакументацыю на долевае будаўніцтва шматкватэрнага жылога дома.

Спрэчкі, якія ўзнікаюць пры выкананні дагавора будаўніцтва, вырашаюцца таксама ў судовым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Віктар САВІЦКІ.

КАЛІ ШЛЮБ ПЕРШЫ...

З другой жонкай (яна прапісана ў інтэрнаце) і дзіцем я жыву ў кватэры сваіх бацькоў. Каб хоць некалі пабудаваць сваю, хадзіў у выканкам, хацеў стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў. Аднак нашай маладой сям'і (мне 28, жонцы 25) адмовілі. Ці законна гэта?

В. С., *г. Гродна.*

Норма аб тым, што маладыя сям'і (у тым ліку тыя, што жывуць сумесна з бацькамі незалежна ад узроўню забяспечанасці жылой плошчай) прымаюцца на асобны ўлік асоб з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў была прадугледжана п. 8 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 1996 г. № 358 «Аб мерах па паляпшэнні жыллёвых умоў моладзі». У адпаведнасці з Указам ад 3 чэрвеня 2008 г. № 292 гэта норма прызнана страціўшай сілу.

Адначасова Указам № 292 унесены адпаведныя змяненні і дапаўненні ў Палажэнне аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выдзялення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565). У прыватнасці, п.п. 3.1.11 Палажэння выкладзены ў новай рэдакцыі, якая прадугледжвае, што асобамі з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў прызнаюцца тыя, хто ўпершыню ўступіў у шлюб (абое сужэнцаў), калі ніводны з іх не мае ва ўласнасці кватэры або аднакватэрнага жылога дома і (або) не з'яўляецца наймальнікам асобнай кватэры або асобнага аднакватэрнага жылога дома па дагаворы найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду ў населеным пункце па месцы прыняцця на ўлік.

Паколькі ў мужа гэта, трэба разумець, другі шлюб, адмова ў прыняцці сям'і на кватэрны ўлік цалкам правамерная.

Віктар САВІЦКІ.

Напярэдадні

WEEKEND У СЯРЭДНЯВЕЧНЫМ МСЦІСЛАВЕ

У выхадныя ў горадзе Мсціславе адбудзецца традыцыйнае свята сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст».

Раніцай 16 ліпеня ў саборы Аляксандра Неўскага і кармеліцкім касцёле адбудуцца малебны: праваслаўныя і каталікі будуць маліцца пра мсціслаўцаў, якія загінулі за Айчыну на палях бітваў у розныя часіны. Потым тэатралізаванае шэсце рыцарскіх клубаў краіны накіруецца на цэнтральную плошчу горада, да помніка Пятру Мсціслаўцу, дзе і адбудзецца ўрачыстае адкрыццё свята.

На Замкавай гары, дзе яшчэ летась з'явіўся стылізаваны пад сярэднявечча драўляны гарадок і рысталішча, пройдуць рыцарскія турніры. На іх выступяць і суседзі-расіяне — удзельнікі ваенна-спартыўнага аб'яднання «Варта» са Смаленскай вобласці. Спаборніцтвы мечнікаў і лучнікаў, бугурты заўсёды прыцягваюць увагу мноства людзей. Лепшых рыцараў адзначаць і ўзнагародзяць на другі дзень свята, 17 ліпеня.

У гарадскім скверы раскінецца горад майстроў, будуць працаваць сельскагаспадарчыя падворкі, выступяць калектывы мастацкай самадзейнасці, «Мсціслаўскі шынок» і карчма запросяць на дэгустацыі і абеды.

Аднак яшчэ больш каштоўная частка рыцарскага фэсту — гэта арганізацыя экскурсій, у тым ліку па помніках старажытнага Мсціслава. Звычайна Іезуіцкі калегіум, вежы і скляпенні Кармеліцкага касцёла закрытыя для наведнікаў. Аднак на час свята ёсць унікальная магчымасць пабачыць велічныя архітэктурныя помнікі Мсціслава не толькі звонку. Тым больш што каштуюць экскурсіі сімвалічных грошай.

Да ўсяго гэтага прыкладаюцца багатая канцэртная праграма, вогненнае шоу, феерверк і запуск нябесных ліхтарыкаў і начная моладзевая дыскатэка.

Усе падрабязнасці пра свята можна даведацца на сайце mstislavl.mogilev-region.by. Для тых, хто ўжо зацікавіўся рыцарскім фэстам, мясцовыя ўлады паведамляюць у тым ліку пра варыянт размяшчэння ў палатачным гарадку, на добраўпарадкаванай пляцоўцы ў гарадскім парку.

Ілона ІВАНОВА.

Пытальнік

Як даведацца пра лёс рэпрэсіраваных родных?

Куды звярнацца адносна рэпрэсіраваных у 1937 годзе? Гаворка пра Бярэзінскі раён, які раней, да вайны, знаходзіўся ў складзе Магілёўскай вобласці, а пасля вайны перайшоў у Мінскую вобласць. Маіх чатырох дзядзькаў і дзеда выслалі ў 1937 годзе. Была рэабілітацыя, але на іх яе не даслалі. І я зараз хачу ведаць: за што іх пасадзілі — непісьменных людзей, якія працавалі ў калгасе? Куды звярнацца, да каго?

Генадзь Францавіч ПЯТКЕВІЧ, *г. Мінск.*

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь на наш запыт паведамілі, што да вайны Бярэзінскі раён уваходзіў у склад Мінскай вобласці. Звесткі пра рэпрэсіраваных могуць быць у кнізе «Памяць» гэтага раёна, таму заяўн

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 ліпеня 2011 г. № 22 (260)

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

ЗМЯНЯЦЬ ПСІХАЛОГІЮ, ПРЫВІВАЦЬ ПАЧУЦЦЁ АСАБІСТАЙ АДКАЗНАСЦІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёлета па ініцыятыве старшыні Мінаблвыканкама Барыса БАТУРЫ на Міншчыне былі распрацаваны адзіныя Патрабаванні да добраўпарадкавання індывідуальных жылых забудоў на тэрыторыі вобласці. Месяц таму гэтае пытанне было разгледжана на пасяджэнні Прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў. Чым была абумоўлена неабходнасць увядзення Патрабаванняў і што зменіцца пасля іх укаранення, мы папрасілі расказаць старшыню Мінаблсавета Святлану ГЕРАСІМОВІЧ.

— Раней патрабаванні да добраўпарадкавання змяшчаліся ў розных адміністрацыйных артыкулах, якія тычыліся архітэктурнай службы, землеўпарадчай, санітарнай, экалагічнай і г.д. — патлумачыла Святлана Міхайлаўна. — Цяпер мы акумулявалі іх у адным месцы, аптымізавалі, пакінулі самае важнае. У Патрабаваннях дакладна прапісана, што павінна рабіць улада (як выканаўчая, так і прадстаўнічая) на тэрыторыі вобласці, а што — самі людзі. Цяпер да ўсіх гаспадароў індывідуальных жылых забудоў прад'яўляюцца адзіныя патрабаванні ў плане добраўпарадкавання. Стала прасцей кантраляваць працэс навядзення парадку, кожны ведае, што ён абавязаны зрабіць.

Напрыклад, раней шмат спрэчак у вясковых жыхароў узнікала наконт таго, дзе заканчваюцца іх «межы адказнасці» ў плане добраўпарадкавання. Некаторыя заяўлялі: тое, што знаходзіцца па-за іх дваром, іх не тычыцца. Цяпер у Патрабаваннях дакладна прапісана: тэрыторыя да сярэдзіны вуліцы насупраць двара — гэта таксама «зона адказнасці», і гаспадар павінен упарадкаваць яе — своечасова абкасіць, па магчымасці высадзіць кветкі і г.д. Там не павінна складзіравацца ніякіх будматэрыялаў, як у нас людзі прывыклі рабіць — пясок, бярвенні, шыфер ляжыць на вуліцы тыднямі і месяцамі. Гэтага нельга дапускаць. Уся тэрыторыя павінна быць чыстай і ўпарадкаванай. Калі на ўчастку вядуцца будаўнічыя работы, значыць, усе матэрыялы павінны знаходзіцца ў дварах, а не за яго межамі. Абавязкова трэба акрэсліць межы ўчастка — хоць бы стужкай ці сеткай. Ніхто не вымушае адразу ўстанаўліваць капітальную агароджу, не пабудаваўшы саму хату, але абазначыць межы ўчастка неабходна. А то ж бывае, што ўздоўж усёй вуліцы валяюцца будаўнічыя матэрыялы. А калі работы вядуцца марудна, то ўчастак яшчэ і бур'янам зарасці паспявае.

— Ці прапісаны ў Патрабаваннях штрафныя санкцыі?

— Мы былі вымушаны іх прадугледзець для тых, хто не рэагуе на папярэджанні ўлады. Увогуле, у Адміністрацыйным кодэксе маецца 21 артыкул, згодна з якімі гаспадароў індывідуальных жылых забудоў, землеўладальнікаў і карыстальнікаў зямлі можна прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці за неналежнае ўтрыманне сваіх дамоў, тэрыторый і зямельных участкаў. У нашых Патрабаваннях мы прапісалі меры спагнання адным радком: штраф ад 5 да 50 базавых велічынь.

Хачу адзначыць, што штраф выпісваецца ў тым выпадку, калі чалавек неаднойчы быў папярэджаны аб сваім парушэнні і, тым не менш, нічога не зрабіў для выпраўлення сітуацыі. Спачатку мы (дэпутаты, работнікі раённых службаў, старшыні сельскіх Саветаў, старэйшыны) кожнаму домаўладальніку раздалі пад роспіс гэтыя Патрабаванні, каб людзі атрымалі магчымасць азнаёміцца, патлумачылі, што ва ўсіх нас адна агульная задача — зрабіць нашу вобласць прыгожай, упарадкаванай, чыстай, і што для гэтага вялікіх сродкаў не трэба (тую ж траву ля хаты абкасіць, фасад пафарбаваць, смецце прыбраць і г.д.). Апроч таго, адпаведная інфармацыя была змешчана ў абласной і раённай прэсе, агучана на радыё і тэлебачанні. Былі прыняты ўсе меры для таго, каб давесці Патрабаванні да насельніцтва. Згодна з Канстытуцыяй, у беларускіх грамадзян ёсць не толькі правы, але і абавязкі, і людзі павінны гэта ўсведамляць.

Перш чым наказваць рублём, тым людзям, у якіх на прыдворавай тэрыторыі былі выяўлены парушэнні, выдаюцца прадпісанні па навядзенні парадку. Гэта яшчэ не фінансавае пакаранне, а толькі папярэджанне. У ім пазначаны тэрмін, за які гаспадар павінен выправіць парушэнні. А вось калі прадпісанні не аказалі ніякага ўздзеяння і патрабаванні ўлады былі праігнараваны, тады справа можа дайсці да штрафавання. Але гэта не тычыцца адзінокіх састарэлых і ветэранаў. Гэтым людзям улада сама дапамагае навесці парадак на тэрыторыі.

Асабіста я не выступаю за масавае штрафаванне. Гэта ўжо апошні сродак паўплываць на чалавека. Усім нам — і дэпутатам, і вулічкамам з дамкамамі, і старэйшынам — трэба як мага часцей сустракацца з людзьмі, праводзіць тлумачальную работу, пераконваць у тым, што сёння жыць трэба годна, і без добраўпарадкавання не абысціся. Многае змянілася. Звярніце ўвагу: сёння домікі, якія будуюцца на вёсцы, выглядаюць зусім інакш, чым старыя хаты (і я тут маю на ўвазе не толькі дамы заможных грамадзян, а звычайнае сацыяльнае жыллё, напрыклад, для тых жа маладых спецыялістаў). Новыя катэджы выглядаюць годна. Натуральна, на адпаведным узроўні павінна быць і добраўпарадкаванне прыдамовай тэрыторыі. Неабходна змяняць псіхалогію, прывіваць пачуццё асабістай адказнасці і звычку жыць у чысціні і парадку.

— Раскажыце, калі ласка, што канкрэтна робіцца ў вобласці ў гэтым кірунку?

— Адным са шляхоў рэалізацыі гэтай задачы з'яўляецца арганізацыя спаборніцтваў па добраўпарадкаванні. Кожны год ва ўсіх сельсаветах вобласці праводзяцца конкурсы на лепшы падворак, на ўзорную вуліцу і ўзорную вёску. Вынікі друкуюцца ў мясцовай прэсе. Асобныя раёны (у прыватнасці, Слуцкі) фотаздымкі пераможцаў па кожным сельсавеце і аб'ектаў іх добраўпарадкавання змясцілі на вялікім інфармацыйным шчыце. Цяпер усе, хто прыходзяць у райвыканкам, могуць убачыць узорных гаспадароў падворкаў. Гэта — таксама стымул. Абапіраючыся на такіх руплівых гаспадароў, мы імкнёмся прапагандаваць добраўпарадкаванне як лад жыцця.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

НА ШТО ПАТРАЦІЦЬ «КРУГЛЕНЬКУЮ СУМУ»?

Важнай крыніцай атрымання дадатковых сродкаў у мясцовыя бюджэты Смалявіцкага раёна становяцца аўкцыёны па продажы зямельных участкаў. Наш карэспандэнт папрасіў старшыню Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандра Ляхоўскага пракаментаваць новыя падыходы да папаўнення бюджэту Саветаў.

– Цяжка знайсці не заклапочаны сваім фінансавым становішчам сельсавет. Гэта і зразумела. Не перакідчыць усяго таго, на што сельвыканкамам не хапае грошай. Ад іх пастаянна патрабуюць адрамантаваць гэта, зрабіць тое... І так бясконца. Таму пошук дадатковых крыніц фінансавання аб'ектыўна з'яўляецца неад'емнай часткай паўсядзённай работы сельскіх Саветаў. У гэтым сэнсе ў Азярыцка-Слабадскім сельсавеце знайшлі выйсце, якое адпавядае духу сучасных рынкавых стасункаў. Тут ужо не першы раз праводзяць аўкцыёны і па продажы зямельных участкаў фізічным асобам пад будаўніцтва жылых індывідуальных дамоў. Першы досвед на гэтай ніве аказаўся ўдалым. Заробленыя грошы тады пайшлі на добраўпарадкаванне вёсак, таксама быў завершаны рамонт будынка сельвыканкама. Сёння ў ім створаны ўсе ўмовы для працы, сустрэч з насельніцтвам.

Чарговы аўкцыён у Азярыцка-Слабадскім сельсавеце прайшоў адносна нядаўна — напрыканцы мая. У вёсцы Азярыцкая Слабада адзін участак быў прададзены за 113 мільёнаў рублёў. А ў вёсцы Сасновая прадалі тры ўчасткі, атрымаўшы хоць і меншыя, але таксама нядрэнныя грошы: адпаведна 70, 71 і 73 мільёны. Усяго ўдалося выручыць больш за 300 мільёнаў рублёў. Пагадзіцеся, даволі кругленькая сума для сельсавета з невялікім насельніцтвам — чатыры з паловай тысячы чалавек. На яго тэрыторыі 28 населеных пунктаў, у кожным — свае праблемы.

Узнікае пытанне: куды пойдуць гэтыя грошы? Як і было загадзя вызначана дэпутатамі раённага Савета, у першую чаргу — на добраўпарадкаванне населеных пунктаў сельсавета, на тэрыторыі якога адбыўся продаж зямлі. Частка сродкаў, напрыклад, будзе выдаткавана на вырашэнне праблемы з забеспячэннем чыстай пітной вадой вёскі Вішня.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

С 13 июля 2011 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.07.2011 № 287, размер ставки рефинансирования установлен в размере 20 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 2 процентных пункта с 13.07.2011.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 , выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

Запланавалі — зробім?

Нам патэлефанавалі жыхары вёскі Мікулічы Кавалёўскага сельсавета Бабруйскага раёна з нараканнямі на нездавальняючы стан дарогі ад іх вёскі да могілак і папрасілі сталічных журналістаў разабрацца ў сітуацыі. Па каментарыі мы звярнуліся да ***старшыні Кавалёўскага сельскага Савета дэпутатаў Сяргея ПАЦЫЕНКІ****.*

Ён пацвердзіў, што пакуль дарога выглядае не лепшым чынам, асабліва пасля дажджу, і патрабуе падсыпкі.

— На гэты год у цэлым па сельсавеце мы планавалі правесці падсыпку 1300 метраў дарог, — расказаў старшыня. — Мы ўключаны ў раённую праграму рамонту дарог, на якую з бюджэту сёлета будзе выдаткавана 300 мільёнаў рублёў. У тым ліку там прадугледжаны грошы і на падсыпку згаданага ўчастка да могілак у Мікулічах. Гэта грунтовая дарога. Яе працягласць прыблізна 300 метраў, і ў асобных месцах яе трэба падсыпаць.

На момант нашай тэлефоннай размовы з Сяргеем Пятровічам прадугледжаныя на рамонт дарогі мэтавыя грошы з бюджэту яшчэ не паступілі.

Старшыня Савета патлумачыў, што дарогі населеных пунктаў Кавалёўскага сельсавета перададзены на баланс ЖКГ, а пад'езды да могілак, згодна з заканадаўствам, — на баланс дарожных арганізацый. Аднак менавіта дарога да могілак у Мікулічах чамусьці «выпала» з агульнага плана перадачы, ёй сельвыканкам цяпер займаецца асобна. Аднак гэтая акалічнасць не стане прычынай тармажэння рамонтных работ, запэўніў Сяргей Пятровіч. Грошы будуць асвоены па прызначэнні адразу пасля таго, як іх пералічыць бюджэт.

Пакуль што ў сухое надвор'е праехаць да мікуліцкіх могілак на машыне можна, адзначыў старшыня сельскага Савета, хоць дарога сур'ёзна церпіць ад транспарту СВК (недалёка — калгаснае поле). Спецтэхніка разбівае грунт, таму дарогу трэба перыядычна падсыпаць.

— Увогуле, да гэтых могілак ёсць выдатны іншы пад'езд — з боку вуліцы Палявая, — дадаў кіраўнік сельвыканкама, — але людзі хочуць мець упарадкаваным і гэты ўчастак, значыць, адрамантуем і яго. Тым больш што гэта ёсць у планах.

У чаканні абяцаных грошай на рамонт сельскі Савет робіць тое, што можа. У прыватнасці, зімой звяртаўся ў мясцовае СВК «Калгас імя А. Неўскага» па дапамогу ў расчыстцы дарог і вуліц вёсак сельсавета ад снегу. СВК мае неабходную спецтэхніку і заўсёды ідзе насустрач.

Калі ж па нейкіх прычынах бюджэтныя грошы, прадугледжаныя на рамонт пад'езду да могілак у Мікулічах, затрымаюцца, Сяргей Пятровіч плануе зноў звярнуцца ў СВК па дапамогу — прывезці грунт і зрабіць падсыпку.

— У цэлым стан нашых дарог я ацэньваю як добры, паколькі большая іх частка заасфальтаваная, — падкрэсліў Сяргей Пятровіч. — Грунтовых дарог у нас мала. Ёсць і гравійныя, але большасць — асфальтаваныя.

Вяртаючыся да дарогі ў Мікулічах, старшыня дадаў:

— Людзі сёння жывуць добра, а хочуць жыць яшчэ лепш. Гэта — нармальная з'ява. Да гэтага трэба імкнуцца і павышаць камфортнасць пражывання. Важна, каб гэта рабілася не ў аўральным парадку, а планава, паэтапна: запланавалі — зрабілі. Тады і станоўчых вынікаў будзе больш.

Інга МІНДАЛЁВА.

«ШЭРЫФ» З КРАЎЦОЎКІ

Васіля Чапурнога, дэпутата Цярухскага сельскага Савета, мясцовыя жыхары толькі так і называюць: «Наш шэрыф». Ён жыве ў вёсцы Краўцоўка Гомельскага раёна, што адносіцца да ААТ «Саўгас-камбінат «Сож». І ўсё, што адбываецца ў населеным пункце і навокал, — яго клопат. Як прыемнае, так і адмоўнае. За сваю больш чым 30-гадовую працу ў мясцовай гаспадарцы ён не толькі зарэкамендаваў сябе адказным у выкананні даручэнняў кіраўніцтва, але і ў мясцовага насельніцтва аўтарытэт заваяваў бясспрэчны.

Зараз яго пасада — кіраўнік аддзялення саўгас-камбіната «Сож». А гэта значыць, што даводзіцца ажыццяўляць кіраўніцтва людзьмі і падчас пасяўной, і падчас уборачнай, і падчас корманарыхтоўчай кампаніі. І ферма мясцовая яму падначаленая. І хоць сёння Васілю Віктаравічу 62, пра адпачынак размова не ідзе. Прынамсі, як і пра адпачынак ад грамадскай працы:

— Патрэбна машына, патрэбны трактар — іду да дырэктара, да агранома. Пераконваць нікога не даводзіцца, усе разумеюць, колькі важна для той жа пенсіянеркі агарод ускапаць. Наконт дроў для старых таксама неабходна патурбавацца, ці пахаванне арганізаваць... Усё ў жыцці здараецца — як не дапамагчы.

Пенсіянеры свайго «шэрыфа» любяць. За безадмоўнасць і сапраўдны ўдзел у іх жыцці. Яго асноўнае крэда: добрых і дрэнных людзей не павінна быць. Усе роўныя, і патрабаванні да ўсіх аднолькавыя — у залежнасці ад канкрэтнага ўчынка.

— Калі ёсць магчымасць, даю чалавеку ўсвядоміць яго памылку. Але калі разумення няма, у наступны раз даравання не будзе. Тады прымаем самыя сур'ёзныя меры. Хоць людзі ў нас пераважна ўсе добрасумленныя і прыстойныя.

А што датычыцца тых, хто з законам праблемы мае... Васіль Віктаравіч больш за ўсё не любіць п'яніц, асабліва жанчын, якія сябруюць з бутэлькай. Як і паўсюль, у гаспадарцы сёння працуе дастаткова абавязаных па Дэкрэце Прэзідэнта № 18. Менавіта яны часцей за ўсё ствараюць праблемы. Існуе думка, што іх з працы ўсё роўна не выганяць. Здараецца, што пасля зарплаты яны знікаюць на некалькі дзён — пакуль усе грошы не прап'юць. Але ў Чапурнога такі нумар не праходзіць. Спачатку тут спрабуюць уздзейнічаць маральна, праз грамадскасць. А калі гэта не дапамагае, тады паведамляюць у міліцыю і сумесна прымаюць меры да такіх «працаўнікоў».

Прынамсі, цеснае супрацоўніцтва з Гомельскім РАУС для Васіля Чапурнога — звычайная справа. З участковым інспектарам даводзіцца і ў начныя рэйды хадзіць, глядзець, каб хто бульбу ці сена гаспадарскае не скраў.

— Варту трымаем у пастаяннай напрузе, — гаворыць Васіль Віктаравіч. — Аднойчы паступіла інфармацыя, што ў раёне наркаманы з'явіліся. Ужо на наступны дзень разам з участковым іх затрымалі, а потым і групу выклікалі. Быў выпадак: паднімае мяне пенсіянер і паведамляе, што краму рабуюць. Тут жа ўзяў вартаўнікоў і пакуль міліцыя сюды да нас ехала, сладзеяў са здабыткам затрымалі. Было, што залезлі сладзеі да 90-гадовай пенсіянеркі. Яе дачка выскачыла ў акно, а старую стукнулі моцна. Падняў людзей, і да прыезду супрацоўнікаў міліцыі мы ўжо ведалі, хто гэта зрабіў...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
Цептер Банк

ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»
Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б
эл. адрес: info@zepterbank.by.
Тел. 331 89 49, факс 331 89 48

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2011	01.07.2010
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	4 785,7	2 015,7
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	21 225,2	3 369,2
5	Средства в банках	1104	125 586,3	17 079,2
6	Ценные бумаги	1105	2 483,9	18 094,6
7	Кредиты клиентам	1106	108 729,6	44 001,7
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	10 813,7	8 378,7
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Прочие активы	1111	1 561,9	1 374,2
13	ИТОГО активы	11	275 186,3	94 313,3
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	7 558,4	-
16	Средства банков	1202	10 710,2	5 511,4
17	Средства клиентов	1203	69 946,9	27 607,9
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	22 632,2	7 385,6
19	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
20	Прочие обязательства	1206	107 891,9	1 083,6
21	ВСЕГО обязательства	120	218 739,6	41 588,5
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	42 030,0	42 030,0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	2 101,5	2 101,5
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	1 306,3	37,0
27	Накопленная прибыль	1215	11 008,9	8 556,3
28	ВСЕГО капитал	121	56 446,7	52 724,8
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	275 186,3	94 313,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ с 1 января 2011 г. по 30 июня 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.01.2011–30.06.2011	01.01.2010–30.06.2010
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	7 797,5	6 070,9
2	Процентные расходы	2012	2 408,9	1 039,9
3	Чистые процентные доходы	201	5 388,6	5 031,0
4	Комиссионные доходы	2021	1 481,9	386,5
5	Комиссионные расходы	2022	629,0	91,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	852,9	294,9
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	14,2	14,4
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	9 440,9	706,5
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	7 131,7	214,2
12	Прочие доходы	208	140,6	0,2
13	Операционные расходы	209	5 266,6	3 792,6
14	Прочие расходы	210	1 502,4	321,4
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	1 936,5	1 718,8
16	Налог на прибыль	212	478,3	218,8
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	1 458,2	1 500,0

Председатель Правления **Дворников Игорь Андреевич**

Главный бухгалтер **Нестерова Галина Чеславовна**

Дата подписания «08» июля 2011 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 13 ноября 2008 года № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214 БИК 153001820

ЗМЯНЯЦЬ ПСІХАЛОГІЮ, ПРЫВІВАЦЬ ПАЧУЦЦЁ АСАБІСТАЙ АДКАЗНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Цяпер у нас якраз праводзяцца святы вуліц, а крыху пазней пройдуць і святы вёсак. І калі раней на свяце вёскі ўшаноўвалі лепшыя дынастыі, заслужаных жыхароў, то цяпер — з улікам новых падыходаў да тэмы добраўпарадкавання тэрыторый — будзем адзначаць і гаспадароў самага ўпарадкаванага падворка, узорнай вуліцы.

Вялікі плён дае актыўнае ўзаемадзеянне ўсіх арганізацый, размешчаных на тэрыторыі сельскага савета, са школамі. У якасці станоўчага прыкладу назаву школу ў вёсцы Сарочы (Сарочскі сельсавет Любанскага раёна). Яны распрацавалі ўласны праект — конкурс «Наш дом, наша школа, наша вёска», у якім бяруць удзел вучні ўсіх класаў. Конкурс праводзіцца ў тры этапы (лепшы дом, лепшы клас у школе, лепшая вуліца ў вёсцы). Важна, што да гэтага далучаюцца і дзеці, і бацькі, і настаўнікі. Галоўны акцэнт пры падвядзенні вынікаў конкурсу робіцца менавіта на работу саміх вучняў (што дзеці зрабілі па ўпрыгожванні свайго дома і навядзенні парадку на ўчастку, як упрыгожылі сваю вёску і г.д.). Адміністрацыя школы і сельскі Савет знайшлі магчымасць уручыць вучням-пераможцам прызы за добраўпарадкаванне. А гэта і ёсць маральнае выхаванне, якое ідзе з дзяцінства.

У Сарочах мы наведалі мясцовы Дом культуры, дарэктар якога, Фёдар Фёдаравіч Крупянькоў, адначасова з'яўляецца і старэйшынам вёскі. Гэта жвавы, энергічны чалавек, які пастаянна «прасоўвае» тэму добраўпарадкавання, вядзе тлумачальную работу, развешвае ў ДК фотаздымкі лепшых двароў, лепшай вуліцы. Дзякуючы такой зладжанай працы ўсіх структур, у гэтай вёсцы ўсюды чысціня і парадак.

Такім чынам, вынікі ў плане добраўпарадкавання будуць відавочнымі, калі ёсць узаемадзеянне ўсіх, хто пражывае, працуе на канкрэтнай тэрыторыі, і нават тых, хто туды прыязджае (я маю на ўвазе дачнікаў).

— Пра добраўпарадкаванне мы гаворым не першы год. Прыемна адзначыць, што на Міншчыне за апошні час многае змянілася да лепшага. Як асабіста вы ацэньваеце сітуацыю сёння: ці наведзены парадак у Мінскай вобласці на належным узроўні?

— Тэмай добраўпарадкавання трэба займацца пастаянна, штодзённа. Яна не павінна ператварацца ў нейкую разавую кампанію. Сказаць, што на сёння ў вобласці ўжо ўсё зроблена, я не магу, аднак станоўчы зрух па навядзенні парадку відавочны. Для павышэння эфектыўнасці навядзення парадку ў сельскай мясцовасці, для таго, каб на месцах лягчэй вырашаліся пытанні, якія часам узнікаюць пры рэалізацыі мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні, за канкрэтнымі сельсаветамі мы замацавалі адказных работнікаў райвыканкамаў і дэпутатаў абласнога Савета. У прыватнасці, шмат праблем з'яўляецца пры ліквідаванні міні-палігонаў (звалак). Для гэтага патрэбна тэхніка, сродкі, якіх можа не мець сельвыканкам. А калі за сельсаветам замацаваны кіраўнік ці намеснік старшыні райвыканкама альбо старшыня райсавета, то ім на сваім узроўні расцэй знайсці ўнутраныя рэзервы для вырашэння задачы, чым старшыні сельскага Савета.

Напрыклад, ва Уздзенскім раёне ўсяго 9 сельсаветаў, за трыма з іх замацаваны старшыня райвыканкама, за астатнімі шасцю — тры яго намеснікі. Раз на тыдзень там праводзіцца планёрка, прысвечаная тэме добраўпарадкавання, дзе старшыня раённага Савета пытаецца: што зроблена, што пакуль не, па якіх прычынах, дзе патрэбна дапамога? Пры такім падыходзе многія пытанні вырашаюцца значна больш аператыўна і эфектыўна.

— Ліквідаванне міні-палігонаў на Міншчыне павінна завяршыцца да 1 верасня. Ці ўсе раёны паспеюць укласціся ў тэрмін?

— Некаторыя раёны ў нас пакуль адстаюць ад графіка. Кожны тыдзень мы праводзім абласныя рабочыя нарады па гэтай тэме, арганізуем рэйды, выязджаем дэпутацкімі групамі — «трасём» раёны, каб яны не запавольвалі напружанага тэмпу. Асобных кіраўнікоў у рэгіёнах, дзе праца прасоўваецца яшчэ недастаткова хутка, даводзіцца і караць...

— На вашу думку, што з'яўляецца асноўнай прычынай адставання асобных рэгіёнаў: недахоп сродкаў ці ўсё ж чалавечы фактар?

— Менавіта апошняе. Гэта і недастатковая работа з людзьмі, і недахоп арганізаванасці. Сродкі ва ўсіх прыкладна аднолькавыя, а як яны выкарыстоўваюцца — гэта ўжо іншае пытанне.

Увогуле працы па навядзенні парадку ў вобласці яшчэ хапае. Так, паралельна з ліквідаваннем міні-палігонаў трэба заключаць дагаворы на вываз смецця — і з насельніцтвам, і з садаводчымі таварыствамі. У нас ёсць раёны, дзе дагаворы заключаны са 100% жыхароў, а ёсць і такія, дзе гэты паказчык — 70%. Куды ж дзяваецца астатняе смецце, ад тых гаспадароў, хто не заключыў дагавор? Выкідваецца ў лес, у палосы адводу і г.д. Мы сёння актыўна працуем з садаводчымі таварыствамі (бо, як паказвае практыка, дачнікі любяць пакідаць смецце ў неналежных месцах), больш жорсткія патрабаванні прад'яўляем да работы лясніцтваў, каб кожны больш адказна ставіўся да чысціні на сваім участку, кантраляваў сітуацыю і, калі трэба, прымаў неабходныя меры да парушальнікаў і г.д. Інакш караем саміх леснікоў. Усе службы павінны працаваць належным чынам. І калі ад кожнага падворка мы наладзім вываз смецця, то ў службы ЖКГ будзе куды менш працы.

— Гаворачы аб добраўпарадкаванні, не магу абмінуць пытанне фінансавання. Раскажыце, калі ласка, дзе і якія сродкі пад гэта прадугледжаны?

— Сёлета, па распараджэнні старшыні аблвыканкама Барыса Батуры, падтрыманым абласным Саветам дэпутатаў, кожнаму раёну вобласці было дадаткова выдаткавана па 2 мільярды рублёў менавіта на добраўпарадкаванне тэрыторый. Пры гэтым раёны мелі права самастойна размяркоўваць і выкарыстоўваць гэтыя сродкі такім чынам, як палічаць неабходным (на асфальтаванне вуліц, на ўстаноўку агароджаў, на ліквідаванне міні-палігонаў і г.д.). Кожны райвыканкам разам з райсаветам самі прымалі рашэнне, на што накіраваць гэтыя 2 мільярды.

Варта нагадаць, што сельвыканкамы маюць магчымасць самастойна зарабляць грошы (за кошт правядзення зямельных аўкцыёнаў, здачы ў арэнду пабудоў і г.д.), якія таксама могуць накіроўваць на добраўпарадкаванне. Апроч таго, раёнам была пастаўлена задача ў свой бюджэт на 2011 год закладаць пэўныя сумы на ліквідаванне міні-палігонаў. Міншчына — пакуль што адзіная вобласць, якая сёлета накіравала па лізінгу ў раёны 100 смеццевозаў, падмацаваўшы такім чынам матэрыяльна-тэхнічную базу камунальнай гаспадаркі на месцах, каб забяспечыць бесперабойны вываз смецця... Пры зацвярджэнні абласнога бюджэту на 2011 год мы заклалі значную суму на будаўніцтва інжынернай інфраструктуры (электрычных сетак, водаправодаў і г.д.) там, дзе выдзяляюцца ўчасткі пад індывідуальнае будаўніцтва. Увогуле, крыніц шмат, але не трэба забывацца пра тое, пра што мы ўжо казалі вышэй: шмат што ў плане добраўпарадкавання можна зрабіць і без прыцягнення значных сродкаў.

— Падводзячы вынікі першага паўгоддзя, якія рэгіёны можна назваць сярод тых, хто найбольш плённа папрацаваў у плане добраўпарадкавання?

— Узгадаю Бярэзінскі і Любанскі раёны. Там актыўна вядзецца знос старога жылля, а вызваленыя ўчасткі вяртаюцца ў севазварот ці адводзяцца пад будаўніцтва новага жылля, заменены агароджы, прыбрана гніллё, уздоўж многіх вуліц высаджаны кветкі, разбіты клумбы, належным чынам арганізаваны вываз смецця. Там бачна, што мясцовыя органы ўлады сапраўды шмат працуюць з насельніцтвам.

— З улікам няпростай эканамічнай абстаноўкі ў краіне ці не было б лагічным «адкласці» тэму добраўпарадкавання да лепшых часоў?

— У любой няпростай абстаноўцы адразу выяўляецца шмат рэзерваў, у людзей з'яўляецца шмат ініцыятыў. І нам, дэпутатам, трэба ўсю энергію накіроўваць на падтрымку ініцыятыў людзей, на іх заахвочванне і ўкараненне вартых таго ідэй.

Інга МІНДАЛЁВА.

НА ШТО ПАТРАЦІЦЬ «КРУГЛЕНЬКУЮ СУМУ»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Рэльеф у вёсцы даволі складаны — сцэльныя ўзгоркі. А ваданосны слой залягае прыкладна на глыбіні 80 метраў, да якога дзедаўскім спосабам — рыдлёўкай і ломам — дабрацца вельмі складана. Цяпер дзякуючы аўкцыёну з'явілася магчымасць зрабіць свідравіну неабходнай глыбіні, вада з якой заўсёды будзе празрыстай і смачнай.

Старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета Святлана Максіменка, энергічны і ініцыятыўны кіраўнік, бадай, адна з першых прадстаўнікоў мясцовай улады здолела ацаніць выйгрышнае геаграфічнае становішча, якое займае Азярыцка-Слабадскі сельсавет: непадалёку ад Мінска. А непасрэдна праз тэрыторыю сельсавета праходзіць аўтамабільная траса міжнароднага значэння Брэст—Мінск—Масква, ці як у народзе яе называюць, — маскоўская шаша. Сам сельсавет мяжуе з Мінскім раёнам. Карацей, вельмі прывабная тэрыторыя для заможных мінчан, якія могуць дазволіць сабе набыць за салідную суму кавалак зямлі побач са сталіцай. Калі быць зусім дакладным, свой першы аўкцыён Святлана Аляксандраўна правяла, калі яшчэ працавала старшынёй Прылепскага сельскага Савета (потым ён быў аб'яднаны з Азярыцка-Слабадскім і старшынёй была абрана Максіменка).

Дэпутаты раённага Савета, якія, дарэчы, пастаянна і прадметна разглядаюць у камісіях праблематыку добраўпарадкавання тэрыторый населеных пунктаў, навядзення парадку на зямлі, вырашылі рэгулярна праводзіць такія аўкцыёны. Досвед Азярыцка-Слабадскога сельсавета, які першым у раёне пачаў продаж зямлі за сур'ёзныя грошы, мяркуем з часам распаўсюдзіць ва ўсіх іншых сельскіх Саветах раёна. Ужо прайшлі аўкцыёны ў Пліскім і Усяжскім сельсаветах. Праўда, там зямля не такая дарагая, як у Азярыцкай Слабадзе, але ж выручаныя 14 мільёнаў рублёў аказаліся вельмі дарэчы для выканкамаў. На чарзе — аўкцыён у Жодзінскім сельсавеце.

Зароблены грошы плануецца накіраваць на рамонт вясковых вуліц, аднаўленне агароджы і, зразумела, на ліквідацыю стыхійных звалак, якія па віне нядобрасумленных дачнікаў узнікаюць рэгулярна. Толькі паспявай прыбіраць кучы бытавых адходаў і будаўнічага смецця. У Смалявіцкім раёне некалькі дзясяткаў садовых таварыстваў, іх прысутнасць аказвае істотны ўплыў на экалогію раёна, выклікае забруджванне навакольных лясоў і палёў. Цяпер у разгары дачны сезон, і мясцовай уладзе зноў трэба наводзіць парадак у рыдарожным хмызняку і суседніх з дачнымі пасёлкамі лясах. На зароблены «аўкцыённыя» грошы выканкамы наймаюць тэхніку для вывазу смецця і неарганізаваных звалак.

Мяркуецца, што з пачаткам актыўнага будаўніцтва горада-спадарожніка (хутка пачнецца ўзвядзенне першых чатырох жылых дамоў) узрасце цікавасць да набыцця зямельных участкаў у раёне. І не толькі тых, якія знаходзяцца непадалёку ад маскоўскай шашы, але і ў больш аддаленых ад цэнтральнай аўтамагістралі месцах. Усё ж жаданне займець свой уласны домік у вёсцы ці ў маляўнічым кутку прыроды, думаю, будзе прысутнічаць і ў жыхароў горада-спадарожніка. Так што мы маем права разлічваць на доўгатэрміновую перспектыву правядзення аўкцыёнаў.

На першы погляд здаецца, што не ва ўсіх сельскіх Саветах ёсць магчымасць зарабіць на продажы зямлі — маўляў, хто паедзе ў «глыбінку» будавацца? Думаю, гэта пытанне часу. З пашырэннем горада-спадарожніка будзе паступова «ахоплена» зямельнымі аўкцыёнамі большасць навакольляў нашых населеных пунктаў. Вядома, гандляваць надзеламі трэба ў разумных межах. Бо зямля — тое багацце, якім неабходна ашчадна распараджацца. Так, сёння мы пакуль прадаём яе фізічным асобам толькі на індывідуальнае будаўніцтва жылля. З часам — хто ведае? — можа, будзем дазваляць набыццё зямельных участкаў праз аўкцыёны юрыдычным асобам, скажам, сталічным прадпрыемствам рознай формы ўласнасці — для адкрыцця баз адпачынку для свайго персаналу, прадпрымальнікам для ўзвядзення забаўляльных цэнтраў, невялікіх прадпрыемстваў па аказанні паслуг. Дэпутаты раённага Савета будуць карэктаваць сваю зямельную палітыку ў залежнасці ад эканамічнай і экалагічнай сітуацыі ў раёне, попыту на зямельныя надзелы, стварэння ў краіне рынку зямельнай уласнасці.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Смалявіцкі раён.

ГОМЕЛЬ ПАВЯЛІЧЫЦЦА НА 5,3 ТЫС. ГА

Гомель павялічыцца на 5340,4 га. Рашэнне аб гэтым прынята на чарговай сесіі Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў, перадае БЕЛТА.

Тэрыторыя абласнога цэнтра вырасце за кошт перадачы ў адміністрацыйнае падпарадкаванне Гомельскага гарсавета і Гомельскага гарвыканкама пасёлкаў Ярохава, Заляддзе, Сцяг Працы, Іпуць, Мядзведжы Лог, Прыазёрны, вёсак Раманавічы і Галавінцы, часткі зямель Улукаўскага сельсавета, мікрараёна жылой забудовы Новае Жыццё, 15-га мікрараёна і іншых.

У Гомельскім гарвыканкаме ўдакладнілі, што на працягу апошніх пяці гадоў жыллёвае будаўніцтва ў абласным цэнтры ў асноўным рэалізоўвалася ў межах горада. Уключэнне дадатковых зямель вырашыць праблему дэфіцыту тэрыторый для сядзібнага і шматкватэрнага жыллёвага будаўніцтва і своечасовага іх асваення ў мэтах выканання жыллёвай праграмы. У адпаведнасці з абласной праграмай развіцця будаўнічага комплексу Гомельскай вобласці на 2008—2015 гады сяроднегадавы ўвод жылля для Гомеля, пачынаючы з 2011 года, павінен складаць 500 тыс. кв.м жылля ў год. Да 2020 года горад плануе пабудаваць 6 млн кв.м. агульнай плошчы жылля.

«ШЭРЫФ» З КРАЎЦОЎКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Між іншым, сам Васіль Віктаравіч родам з Украіны. Але калісьці даўно праходзіў тут тэрміновую вайсковую службу, пазнаёміўся з мясцовай прыгажуняй, ды так і застаўся на Беларусі жыць. Пачынаў брыгадзірам у Дзікалаўцы, а зараз вось кіраўнік аддзялення ААТ «Саўгас-камбінат «Сож». І заўсёды, апроч асноўнай працы, браў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Тэхнік Ларыса Дубадзелава гаворыць, што Васіль Чапурны строгі, але справядлівы:

— А інакш нельга... Чалавек усё жыццё тут пражыў, ведае ўсё пра кожнага. З раніцы на машыну — і цэлы дзень, як вавёрка ў коле. Сямёнаўка, Дзікалаўка, Лядцы, Краўцоўка. Ва ўсіх гэтых вёсках ён ведае кожнага жыхара, іх дзяцей і ўнукаў. Працаваць з людзьмі ў наш час вельмі складана. У паляводчую брыгаду ходзіць шмат пенсіянераў. Толькі ён знаходзіць да іх падыход. Падыдзе, папытае... Іх жа кантраляваць не трэба. А маладых туды накіруй, Васілю Віктаравічу трэба за імі стаяць і кантраляваць.

Старшыня Цярухскага сельскага Савета Анатоль Петрушэня адзначае, што такі дэпутат — гэта проста знаходка для вёскі:

— Любая праца ім заўсёды выконваецца добрасумленна — і грамадская, і вытворчая. Былі выпадкі, у шэсць раніцы прыязджаю — ён ужо на працы, а ў дзесяць вечара ён яшчэ на працы. Ён жа — галоўны памочнік і ў сельскім Савеце. Я маю дзякуючы яму поўную інфармацыю: як крама працуе, як — ФАП, як — індывідуальныя прадпрымальнікі. Ён ніколі не кажа: не магу ці не буду. Калі штосьці не атрымліваецца (напрыклад, узімку дарогі не расчышчаны своечасова), я ў рэальным часе атрымліваю інфармацыю для рэагавання. Часцей за ўсё, Чапурны спраўляецца з праблемамі сам і толькі дакладае, што зроблена. А не так даўно да грамадскай работы далучылі і жонку Васіля Віктаравіча — Надзею Іванаўну. Сёння яна — старшыня ветэранскай арганізацыі. Надзея Іванаўна ў якасці сацыяльнага работніка яшчэ і дапамагае бездапаможным людзям, інвалідам. Тандэм у іх выдатны!

Падтрымку ад Васіля Чапурнога жыхары Краўцоўкі і суседніх вёсак бачаць штодня. І гавораць, што такія аўтарытэтныя і паважаныя людзі павінны быць у кожным населеным пункце. Тады на зямлі парадку будзе больш.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Парадак паводле стандарту

Ці не кожнаму з нас даводзілася назіраць такую карціну: літаральна побач у адной вёсцы стаяць дыхтоўны дом, нібыта з рэкламнага буклета, а побач — хата-развалюха. Прычым не сакрэт, што перш-наперш падобны кантраст тлумачыцца не столькі рознымі магчымасцямі, колькі простым жаданнем гаспадароў.

Бюджэт Кіраўскага раёна залежыць ад датацый практычна на 70 працэнтаў, і сам па сабе гэты факт — відавочны «мінус». Аднак нельга не адзначыць: выключна спасылкі на абмежаванасць сродкаў ніколі не былі слушнымі. За апошні час у раёне змаглі добраўпарадкаваць і абгарадзіць практычна ўсе вясковыя могілкі, тут паступова аднаўляюцца калодзежы, ліквідуюцца старыя і ўжо небяспечныя для людзей дрэвы. Больш складанай аказалася толькі сітуацыя з дарогамі: з пачатку года змаглі адрамантаваць усяго сем вясковых вуліц — з улікам цяперашніх рэалій грошы на астатнія рамонты пакуль пераведзены ў рэзерв.

— Вядома, скідваць з рахункаў рэальныя магчымасці нельга, заўсёды даводзіцца вызначаць, куды накіроўваць грошы ў першую чаргу, складаць адпаведныя графікі, — распавядае старшыня Кіраўскага райсавета Надзея Каранкевіч. — Сапраўды, зрабіць усё і адразу нерэальна. Аднак пакрысе справы рухаюцца, і тут бянтэжыць адно — абыякавасць некаторых людзей, спадзяванні, што «нехта прыйдзе — штосьці зробіць». Даволі красамоўным у гэтым плане можна лічыць прыклад аграгарадкоў. Пры іх стварэнні многім паставілі новыя платы. Аднак калі адны з гаспадароў іх даглядаюць, то іншыя — не лічаць гэта патрэбным. І, як вынік, нібыта новыя платы прыходзяць у заняпад.

Існуе думка, што парадак на падворку — справа выключна прыватная. Гэта адназначна не так. Больш за тое, падобныя меркаванні могуць прывесці да непрыемнасцяў. Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях нават вызначае дакладныя пакаранні. Так, самавольнае адхіленне ад схем ці праектаў землеўпарадкавання можа закончыцца штрафам ад 10 да 30, загрувашчванне вуліц, дварою і зямлі агульнага карыстання будаўнічымі матэрыяламі і іншымі прадметамі — да 5, парушэнне іншых правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў — да 25, а парушэнне заканадаўства аб абыходжанні з адходамі — ад 5 да 50 базавых велічынь. Плюс да таго, ад 1 да 15 базавых велічынь можа абысціся парушэнне правілаў ўтрымання сабак або кошак (сёння базавая велічыня адпавядае 35 тысячам рублёў).

> **“Трава павінна быць скошана ад дома да дарогі, плот — адрамантаваны, сад — дагледжаны, а на двары і ў агародзе не павінна быць пустазелля.**

— Безумоўна, штраф — гэта сапраўды крайняя мера, — адзначае Надзея Каранкевіч. — І перад яе выкарыстаннем практыкуюцца меры прэвентыўныя — выдача прадпісанняў з указаннем, што і ў якія тэрміны трэба зрабіць. І толькі калі прадпісанне не выконваецца — складаецца пратакол аб парушэнні з санкцыямі. Прычым нельга не заўважыць, што ў абсалютнай большасці выпадкаў прадпісанні ўсё ж такі дзейнічаюць.

Праўда, тут жа нельга абмінаць асаблівасці той або іншай сітуацыі. Бо адна справа — калі папярэджанне атрымлівае працаздольны і цалкам здаровы чалавек. І іншы прыклад — адзінокія пенсіянеры ці інваліды.

— Калі зразумела, што той жа адзінокі пенсіянер абкасіць траву каля дома не ў стане, то яму даецца падказка — заказаць гэтую паслугу можна ў камунгасе, — распавядае Надзея Каранкевіч. — Аднак практыкуецца і іншы варыянт. Калі стары або нямоглы чалавек мае на тэрыторыі раёна працаздольных і здаровых дзяцей, то мы звяртаемся з прадпісаннем менавіта да іх. Пры гэтым заўсёды звяртаецца ўвага на наступнае: паводле Кодэкса аб шлюбе і сям'і, «дзеці абавязаны клапаціцца аб бацьках і аказваць ім дапамогу». І ў тым ліку — дапамогу ў навядзенні парадку на падворку і тэрыторыі вакол яго. А калі такой дапамогі пасля прадпісання няма, то ўзнікаюць усе падставы для прыцягнення дзяцей да адказнасці — зноў жа, на падставе Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях.

Асобная тэма — старыя закінутыя хаты. Іх колькасць паступова павялічваецца, і ці не самае складанае тут — знайсці спадчыннікаў дома. Аднак нават калі ўдаецца, узнікае іншая праблема. Сапраўды, некаторыя са спадчыннікаў адразу ж даюць згоду на знос. Аднак некаторыя рабіць гэта не спяшаюцца: маўляў, выйдзем на пенсію — пераедзем сюды жыць.

— Нічога страшнага тут няма, такое жаданне — цалкам зразумелае, — пагаджаецца Надзея Каранкевіч. — Аднак пры адной умове: у час, які пройдзе «да пенсіі», нехта ўсё роўна павінен даглядаць дом і падтрымліваць парадак на падворку. І калі догляду няма — для спадчыннікаў магчымы варыянт таго ж прадпісання і адміністрацыйнай адказнасці.

Між тым, адносіны да падобных патрабаванняў — вельмі розныя. І калі адны цалкам успрымаюць заўвагі, то іншыя — пачынаюць спрачацца. І казаць аб «перадузятасці».

— Каб больш прадметна размаўляць з уласнікамі і спадчыннікамі, мы плануем вызначыць, што ўсё ж маецца на ўвазе пад належным утрыманнем дамоў і тэрыторый каля іх; інакш кажучы — вызначыць пералік канкрэтных патрабаванняў, — падкрэслівае Надзея Каранкевіч. — У прыватнасці, на мой погляд, гэтыя патрабаванні наступныя: трава павінна быць скошана ад дома да дарогі, плот — адрамантаваны, сад — дагледжаны, а на двары і ў агародзе не павінна быць пустазелля. А плюс да таго, пажадана, каб у тым жа двары раслі кветкі. Словам, мы маем намер прапанаваць пэўны стандарт. І надалей сачыць за тым, каб гэты стандарт вытрымліваўся.

Сяргей ГРЫБ.
Кіраўскі раён.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫКАРЫСТАЛЬНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2011 года.

Краіна здароўя

Выпуск № 40 (276)

Прамая лінія

З НАВУШНІКАМІ Ў МЕТРО?

ВОСЬ І НЕЎРЫТ СЛЫХАВОГА НЕРВА

Дзесьці пасля 40 гадоў слых, як і зрок, пачынае паступова пагаршацца з аб'ектыўнай прычыны — павольнага старэння арганізма. Хоць, вядома ж, і сярод 80-гадовых ёсць такія, хто чуе, як у васямнаццаць. Як правіла, такая здольнасць абумоўлена спадчынным фактарам. Аднак акрамя спадчыннасці і аб'ектыўнага старэння ёсць і іншыя фактары, якія «спрыяюць» праблемам са слыхам. Узяць хоць навакольнае асяроддзе. За апошнія гады яно стала куды больш агрэсіўным для нашых вушэй, чым гэта было раней, калі большасць насельніцтва пражывала на вёсцы, а значыць, у цішыні. Зараз жа гараджане фактычна пастаянна — і днём, і ноччу — знаходзяцца пад шумавым уздзеяннем. Між тым вушы, як і любы іншы орган, мае патрэбу ў адпачынку. Нават ціхі, але пастаянны шум уздзейнічае на нервовыя клеткі ўнутранага вуха, і яны, як любыя клеткі, таксама «стамляюцца». Зразумела, на стан слыху будзе ўплываць і праца на шумнай вытворчасці. Цесным чынам са станам здароўя органа слыху звязаны стан здароўя носа і прыдаткавых пазух. Паталогія апошніх, напрыклад, гаймарыты, сінусіты, скрыўленне насавой перагародкі — усе формы абцяжаранага дыхання — будуць спрыяць таму, што паступова пачнуцца праблемы і з вушамі. Акрамя таго, паўплываць могуць нават агульныя захворванні, якія

Фота Ганны ПЯСЕЦКАЙ.

сістэмна ўздзейнічаюць на арганізм. Гэта павышаны артэрыяльны ціск, атэрасклероз, гіперхалестэрынемія, цукровы дыябет, шыйны астэахандроз, і як вынік, дрэнны кровазварот галаўнога мозга.

З усяго пералічанага вынікае, што колькасць вушных паталогій, безумоўна, расце і будзе расці далей. Асабліва калі ўлічыць, што расці будзе і працягласць жыцця сучаснікаў. Кожны з нас павінен, з аднаго боку, не дапускаць грубых памылак, — скажам, не карыстацца навушнікамі ў транспарце, не захапляцца калупаннем вушэй ватнымі палачкамі, забяспечваць поўную цішыню ў начны час, а з другога — своечасова звяртацца да ўрача-атарыналарынголага або ўрача-сурдолага пры першых падазрэннях на пагаршэнне слыху, а таксама добра лячыць усю вуха-горла-насавую паталогію. Спецыялісты — тыя ж сурдолагі — сёння ёсць ва ўсіх абласных і некаторых буйных гарадах, такіх як Бабруйск ці Баранавічы. У сталіцы для дзяцей арганізаваны сурдалагічны кабінет пры 3-й клінічнай бальніцы, а для дарослых такі ж у бліжэйшы час будзе працаваць пры 4-й бальніцы.

А на вашы пытанні адказала загадчыца дарослага сурдалагічнага аддзялення кансультатыўнай паліклінікі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра атарыналарынгалогіі Ніна КАСЦЮК.

☎— Клецк, Вольга Мікалаеўна. Маці перанесла аперацыю на жоўцевым пузыры. Пасля наркозу яна амаль перастала чуць, дакладней, гукі чуе, але яны зліваюцца. На Сухой, у Цэнтры добрага слыху, ёй паставілі дыягназ «тугавухасць» і прапанавалі насіць слыхавы апарат. Яна карыстаецца лічбавым слыхавым апаратам, кажа, што гукі чуваць, а вось разабраць словы амаль немагчыма. У галаве шуміць, гудзе, вушы баляць...

— Ей наогул ніякага лячэння не прызначалі?

— У яе высокі ціск, яна перанесла мікраінсульт, і таму нейкія неўралагічныя кроплі капалі...

— Калі вы кансультаваліся на Сухой і там вам сказалі, што ў маці — нейрасенсорная тугавухасць, парэкамендавалі слыхавы апарат, то трэба думаць, што размова ідзе пра цяжкае зніжэнне слыху. Аднавіць слых пры такім дыягназе, на жаль, немагчыма. Тым не менш, прызначаецца медыкаментознае лячэнне-падтрымка, што паспрыяе захаванню слыху і паляпшэнню разборлівасці маўлення.

— Яна спачатку зусім нічога не чула, але нейкія мазі прымяняла і пачала крыху лепш чуць...

— Тут трэба глядзець. Магчыма, у яе проста былі і праблемы прастуднага характару, што, зразумела, можна і трэба лячыць.

— А да вас на прыём можна трапіць?

— Можна, бярыце накіраванне і запісваецеся па нумары бясплатнай рэгістратуры: 8 (017) 200 84 50. Або калі захочаце прыехаць без накіравання, то запісвацца трэба па нумары платных паслуг: 8 (017) 226 49 52.

☎— Мінск, Маргарыта Барысаўна. Мне 42 гады, дачцэ — 18. Я заўважыла, што ў апошнія два гады, калі надыходзіць дажджлівае надвор'е, то ў нас пачынаецца насмарк, пасля чаго праблема пераходзіць на вушы. Прычым калі холадна, то мы ходзім у галаўных уборах, але гэта ўсё роўна не ўратоўвае. Як нам прадухіліць праблему з вушамі?

— Тут можа быць два варыянты. Магчыма, праблема развіваецца з-за таго, што вы своечасова не лечыце насмарк.

— Але ж раней ніколі такога не было...

— Вы паказваліся лор-урачу?

— Так, нам сказалі, што патрэбна аперацыя, паколькі ў нас вялікія насавыя хады, адсюль пастаянна ідзе ўскладненне на вушы...

— Мне здаецца, вы крыху не так зразумелі. Вялікія насавыя хады — гэта наадварот добра. Тады нос добра дыхае. А калі яны вузкія або ёсць скрыўленне перагародкі, тады з гэтым сапраўды трэба нешта рабіць. Калі, як у вашым выпадку, ёсць такая анатамічная асаблівасць — вушы хварэюць следам за носам, значыць, трэба вельмі ўважліва лячыць насмарк. Іншая справа, якім чынам прыводзіць нос у парадак? Можна медыкаментозна, а калі гэта ўжо не будзе дапамагаць, то хірургічна... Бывае так, што ў чалавека ёсць пэўнае слабае месца. Нехта падхопіць інфекцыю, і ў яго абавязкова з'яўляецца кашаль, а ў другога — насмарк або атыт. Часта гэта адбываецца па тым жа сцэнарыі, што і ў нашых бацькоў. Таму калі ў маці часта здараюцца атыты, то і ў дачкі можа быць тое ж самае. Прычым наўрад ці размова ідзе пра нейкую адну інфекцыю, якая дае ўскладненне на вушы. Як правіла, мы «падхопліваем» розныя інфекцыі.

— Можа, трэба якую-небудзь прафілактыку праводзіць?

— Прафілактыка толькі адна ў гэтым выпадку — своечасовае лячэнне носа. Як толькі захварэлі, у першы ж дзень пачынайце актыўна лячыцца — ногі папарце, гарчычнікі на лыткі пастаўце, пачынайце прымяняць сасудазвужальныя кроплі для носа, і тады, як правіла, да атыту справа не даходзіць.

— А што найбольш дзейснае падыдзе для носа?

— Ёсць добры прэпарат біяпарокс — мясцовы антыбіётык, які мы рэкамендуем пацыентам у першыя дні захворвання. Гэта аэразоль, якім можна саніраваць і нос, і горла.

— А калі ўжо з'явілася ўскладненне?

— А калі вушы пачалі балець, то трэба ісці да лор-урача, паколькі формы атытаў бываюць розныя і, адпаведна, розным будзе лячэнне.

— Ноччу я часта прачынаюся ад таго, што нашы суседзі шумяць. Ці можна карыстацца бірушамі? Гэта не шкодна?

— Па меры неабходнасці імі можна карыстацца, гэта не шкодна.

☎— Ліда, Валянціна. Муж у сакавіку адчуў шум у левым вуху, звярнуўся да ўрача. Яму выпісалі курс лячэння — бетасцін 16, неўрабекс, кропельніца 10 дзён — пірацэтам і вінпацэцін. Ён гэта прайшоў, але паляпшэння не адчуў. Праўда, пакуль прымаў бетасцін, то было крышку лепш. Потым урач накіраваў нас у Гродна да сурдолага, які правёў аўдыяметрыю і рэнтгенаграфію ўнутраных слыхавых праходаў. Паставілі дыягназ — левабаковая нейрасенсорная страта слыху. І зноў прапісалі бетасцін 24 на тры тыдні, затым бетасцін 16 на два тыдні. Шум як быў у вушах, так нікуды не прапаў. Якія зараз існуюць сучасныя метады лячэння гэтага захворвання і куды нам можна звярнуцца?

— Паколькі размова ідзе пра нейрасенсорную тугавухасць, выяўленую звыш трох месяцаў назад, значыць, мы гаворым пра хранічную нейрасенсорную тугавухасць, а ў гэтым выпадку такіх метадаў, якія б стопрацэнтна гарантавалі зніжэнне вушнога шуму і спыненне страты слыху, няма. Лячэнне можа нешта змяніць у лепшы бок, калі распачата на працягу літаральна першага месяца. А пасля трох, як правіла, застаецца тое, што ўжо ёсць... У сэнсе пазбаўлення ад шуму ў вушах зараз яшчэ можна паспрабаваць фізіялячэнне — іголкарэфлексатэрапію, баракамеру, калі няма супрацьпаказанняў да такога лячэння. Існуюць і медыкаменты, якія могуць уздзейнічаць на іншыя пункты гэтага паталагічнага ланцуга, які абумоўлівае шум. Так што, вось тут яшчэ можна нешта спрабаваць.

— А можна трапіць да вас на кансультацыю?

— Можаце ўзяць накіраванне ў свайго лор-урача па месцы жыхарства і запісацца да мяне ці іншага спецыяліста па нумары рэгістратуры — 8 (017) 200 84 50 або платных паслуг — 8 (017) 226 49 52.

— А шум можна выдаліць поўнасцю?

— Зноў жа, стопрацэнтную гарантыю вам ніхто не дасць і шанс аў прыпыніць працэс не так шмат. Але ваш муж выкарыстаў яшчэ не ўвесь тэрапеўтычны арсенал.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

Май на ўвазе!

ЧАМУ МУЧЫЦЬ СМАГА?

Наш арганізм устроены так хітра і мудра, што калі ўзнікаюць нават невялікія збоі ў рабоце якіх-небудзь органаў і сістэм, ён адразу ж пасылае сігналы SOS. Напрыклад, што можа азначаць пастаянная смага, якая адольвае чалавека? Простая асаблівасць арганізма або прадвеснік нейкай хваробы? Таму ёсць некалькі прычын.

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА.

1. Недахоп вадкасці

Гэта часцей за ўсё здараецца ў гарачую пару года. Калі чалавек п'е мала, арганізм «уключае» своеасаблівы ахоўны механізм, які ратуе яго ад абязводжвання. Пры гэтым перасыхае слізістая абалонка рота, завастраюцца рысы твару, западаюць вочы, скура становіцца сухой і адрузлай. Ныркі «берагуць» каштоўную вільгаць, таму чалавек вельмі рэдка наведвае прыбіральню.

Што рабіць: у спякоту, пры ўзмоцненай фізічнай нагрузцы, моцным паценні, страце крыві, апёках, ванітах і дыярэі трэба піць значна больш. Натуральна, як толькі водная раўнавага ў арганізме адновіцца — такая «ахоўная» смага знікне.

2. Цукровы дыябет

Пастаянная смага і частае мочаспусканне — першыя сімптомы каварнага і грознага захворвання. Гэта звязана з парушэннем балансу гармонаў, якія рэгулююць водна-салявы абмен.

Што рабіць: здаць аналізы, каб даведацца ўзровень цукру ў крыві, і калі ён павышаны, неадкладна звярнуцца да ўрача-эндакрынолага, які прызначыць адпаведнае лячэнне.

3. Лішак гармонаў

Моцная смага часта ўзнікае пры павышанай функцыі парашчытападобных залоз (размешчаны на шыі каля шчытападобнай залозы). Хвароба выклікае і іншыя змены: адчуваюцца болі ў касцях, хуткая стамляльнасць, мышачная слабасць, рэзкае пахудзенне, могуць выпадаць зубы. Кальцый, які вымываецца з касцей, афарбоўвае мачу ў белы колер.

Што рабіць: патрэбна лячэнне ў эндакрынолага.

4. Праблемныя ныркі

Смага амаль заўсёды адзначаецца пры піелянефрыце, гламерулянефрыце, гідранефрозе, полікістозе нырак. Гэта тлумачыцца тым, што хворыя ныркі не здольны ўтрымліваць ваду, у выніку чаго ўзнікае павышаная патрэба ў вадкасці. Прычым смага захоўваецца нават тады, калі колькасць мачы, якая выдзяляецца, змяншаецца і з'яўляюцца ацёкі. У гэтым выпадку смага паказвае на існуючую ныркавую недастатковасць.

Што рабіць: абавязкова пракансультавацца ў нефролага. Не звяртаючы ўвагі на хваробу, можна дачакацца сур'ёзных ускладненняў, калі дапамагчы чалавеку змогуць толькі гемадыяліз або перасадка ныркі.

5. Неўралагічныя праблемы

Часам моцная смага з'яўляецца пасля траўмаў галаўнога мозга або нейрахірургічных аперацый. Хвароба, як правіла, амаль заўсёды пачынаецца востра: хворы нават можа назваць дзень і гадзіну, калі гэта адбылося. Развіваецца нецукровы дыябет. Пры гэтым хворыя выпіваюць і па дзесяць, і па дваццаць літраў вады ў суткі, а смага ўсё роўна не знікае. Уся справа ў дэфіцыце гармонаў, што абмяжоўваюць мочаспусканне.

Што рабіць: тэрмінова звярнуцца да доктара, лепш да неўрапатолага.

6. Лекі-правакатары

Прыём некаторых медыкаментозных прэпаратаў выклікае сухасць у роце, таму чалавек шмат п'е. Так, у прыватнасці, дзейнічаюць некаторыя сродкі для паніжэння артэрыяльнага ціску (напрыклад, клафелін), антыгістамінныя лекі, прэпараты лячэння бранхіяльнай астмы і інш.

Што рабіць: параіцца з доктарам, ці можна замяніць гэтыя прэпараты.

7. Смага на «нервовай глебе»

Падобная «псіхалагічная» смага назіраецца часцей за ўсё ў жанчын. Да яе могуць далучыцца капрызы, раздражняльнасць, плаксівасць, прыгнечаны настрой.

Што рабіць: паспрабуйце «падмануць» свой арганізм, намачыце вусны альбо нахіліцеся да вады і зрабіце некалькі глытальных рухаў, прапалашчыце рот. Часам гэтага бывае дастаткова, каб падобная псеўдасмага знікла.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

На заметку

КАЛІ ТЭМПЕРАТУРА ПАВЕТРА ЗАШКАЛЬВАЕ...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Летняя спякота становіцца пакутай для многіх людзей Яна часта з'яўляецца прычынай цеплавых удараў, абвастрае хранічныя захворванні і ўвогуле робіць жыццё некамфортным. Што рабіць, каб захаваць і здароўе, і здольнасць працаваць у такіх умовах?

Для тых, хто працуе

Будзьце асцярожнымі, выходзячы з прахалоднай кватэры на вуліцу. У першую чаргу гэта датычыцца людзей з хваробамі сардэчна-сасудзістай і дыхальнай сістэм. Абавязкова надзявайце лёгкі галаўны ўбор, а калі будзеце ехаць у наземным транспарце і паездка будзе працяглай — бярыце з сабой што-небудзь для пітця. Лепей, калі гэта будзе ўзвар ці мінералка. І ні ў якім разе не стрымлівайце смагу — на думку спецыялістаў, чалавек павінен выпіваць у дзень не менш за 2,5 літра вады.

Калі на вашым працоўным месцы няма кандыцыянера або вы працуеце на адкрытым паветры — пастарайцеся дамовіцца з працадаўцам, каб вашы рабочыя гадзіны былі раніцай ці ўвечары. Вядома, што павышэнне тэмпературы паветра на кожны градус пасля + 26°С зніжае працаздольнасць чалавека на 10%, інакш кажучы, нават калі вы застаняцеся ў спякоту ў офісе, ваш працадаўца будзе не ў захапленні ад вашай работы. А аптымальным рашэннем будзе, безумоўна, адпачынак дзе-небудзь побач з вадой.

Для тых, хто адпачывае

Салярый: промні штучнага сонца хоць і надаюць лёгкі загар, але не прыводзяць у дзеянне абарончыя механізмы скуры. Калі вы прыехалі на курорт, перад гэтым пахадзіўшы ў салярый, усё роўна карыстайцеся сродкамі ад сонца.

Самазагар: сродак, які выклікае пігментацыю, уздзейнічае толькі на верхнія пласты скуры. Трымаецца такі «загар» 3-7 дзён. Гэты метад зусім бяскшодны.

Дзіця на пляжы: дзіцячая скура безабаронная перад ультрафіялетавымі промнямі. Выходзячы на пляж, выбірайце прэпарат з максімальнай ступенню абароны і змазвайце ім дзіця з ног да галавы. Пасля купання нанясіце крэм на скуру яшчэ раз. Панамка абароніць галаву і вочы. Дзецям да двух гадоў трэба быць у цені.

Абарона для валасоў: ад сонечных ваннаў валасы губляюць вільгаць, выцвітаюць і сякуцца. Абараніць іх дапамогуць панама, капялюш або хусцінка, але гэтага недастаткова. Карысна раніцай змазваць валасы спецыяльным алеем, змываючы яго ўвечары. Больш зручна карыстацца ахоўнымі лакамі. Лепей змяніць ваш шампунь на экстрамяккі з серыі «пасля сонца».

Як харчавацца ў спякоту

Старайцеся выбіраць посныя прадукты, у спякоту не ешце смажаных, вострых, салёных, тлустых страў. Яны ўзмацняюць смагу і даюць залішнюю нагрузку на сэрца. Для лета ідэальна падыходзяць салаты з агуркоў, памідораў і зеляніны, тушаная капуста, морква, баклажаны, супы з агародніны, халаднік, суп-пюрэ і, зразумела, ягады і садавіна. Клубніцы, дыня, апельсіны, грэйпфрут, яблыкі не толькі падсілкуюць вас вітамінамі, але і выратуюць ад смагі, бо ў іх каля 90% вады.

Падрыхтавала Вольга ШАЎКО.

Смачнае — карысна

МАЛЕНЬКІЯ ДЫ ЎДАЛЕНЬКІЯ

Як прыемна гуляць па летнім лесе: цешыцца дрэвамі, кветкамі, дыхаць свежым паветрам і заадно збіраць «жывыя» вітаміны. Адны з самых смачных і карысных дзікіх ягад — чарніцы. Яны — незаменны сродак для падтрымання добрага зроку і выдатны памагаты ў барацьбе са старэннем арганізма.

Хімічны склад гэтых ягад надзвычай багаты: карацін, вітаміны С, групы В, РР, пекцінавыя і дубільныя рэчывы, мноства незаменных арганічных кіслот (лімонная, шчаўлевая, яблычная і інш.), мінералы і мікраэлементы (марганец, магній, натрый, калій, жалеза). Усе гэтыя рэчывы шмат у чым і вызначаюць унікальныя лекавыя ўласцівасці чарніц.

Сёння нават школьніку вядома, што **чарніцы здольныя павышаць вастрыню зроку** (асабліва ўначы) і здымаць стомленасць вачэй ад працы пры штучным асвятленні. Навукоўцы даказалі дабратворны ўплыў ягад і на кровазварот у сятчатцы, таму чарніцы асабліва карысныя лётчыкам, шафёрам, праграмістам.

Чорныя ягады **дабратворна ўплываюць і на сардэчна-сасудзістую сістэму.** Вызначана, што чарніцы перашкаджаюць утварэнню тромбаў, зніжаюць узровень кальцыю ў сценках сасудаў, які з'яўляецца прычынай жорсткасці артэрый. А вось амерыканскія даследчыкі выявілі, што антацыяны, на якія багатыя чарніцы, дзякуючы сваёй здольнасці прыгнятаць актыўнасць свабодных радыкалаў, запавольваюць працэс старэння.

Флаваноіды, якія змяшчаюцца ў чарніцах, **засцерагаюць слізістую страўніка,** павялічваючы выдзяленне неабходнай слізі. У выніку гэтага змяншаецца рызыка раздражнення слізістай пры павышанай кіслотнасці або ад ужывання аспірыну, алкаголю.

Карысная і здольнасць чарніц **выводзіць з арганізма солі,** таму яны рэкамендуюцца пры камянях у нырках і падагры. Лічыцца таксама, што рэгулярнае ўжыванне ягад знікае рызыку развіцця анкалагічных захворванняў.

І яшчэ. У лісцях і парастках чарніц выяўлены рэчывы, здольныя зніжаць колькасць цукру ў крыві.

УВАГА! Загана чарніц — пры ўжыванні ў вялікай колькасці яны выклікаюць запоры.

НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ

● **Пры гіпертаніі.** 4 ч. лыжкі ягад заліць шклянкай вады пакаёвай тэмпературы, настойваць 8 гадзін (лепш ставіць на ноч). Выпіць дробнымі порцыямі на працягу дня.

● **Пры дыярэі, хваробах страўніка, энтэрыце і пякотцы.** 1 ст. лыжку сухіх ягад заліць 2 шклянкамі гарачай вады, піць па 60 мл 4 разы на дзень да яды. Гэтым настоем можна паласкаць ротавую поласць пры стаматыце.

● **Пры дыябеце.** Настой: 15 г сухога лісця заліць 400 мл кіпеню, настойваць гадзіну, затым працадзіць. Прымаць па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень. Адвар: 50 г лісця кіпяціць у 1 л вады 20 хвілін, затым працадзіць. Піць па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень.

● **Мазь з пладоў:** свежыя або звараныя ягады расціраюць такім чынам, каб яны набылі кансістэнцыю мазі. Прымяняюць вонкава, накладаючы тоўстым слоем на пашкоджанае месца (экзэма, апёкі, як болесуцішальнае пры рэўматызме, падагры). Змена марлевай павязкі праводзіцца штодзень.

ВЫБІРАЕМ ЧАРНІЦЫ

● Свежыя ягады маюць шэрабелы налёт, яны выглядаюць пругкімі і «ўзрываюцца» пры націсканні, распырскваючы сок.

● Звяртайце ўвагу на чысціню ягад. Гаворка ідзе пра адсутнасць лішніх галінак і лісцікаў, паколькі гандляр, які паважае пакупнікоў, паклапоціцца аб чысціні прадукту і не стане падманваць, набаўляючы вагу лісцікамі і іншымі атрыбутамі лесу.

● Зразумела, што, акрамя ўсяго іншага, ягады павінны быць цэлымі, не спрасаванымі ў тары.

● Прыемным крытэрыем выбару ягад можа стаць і іх памер!

ДАРЭЧЫ

● Назва «чарніцы» звязана са здольнасцю ягад афарбоўваць, чарніць губы, зубы, пальцы.

● На Русі чарніцы называлі «маладзільнымі ягадамі». Лічылася, што яны амаладжваюць арганізм. Таксама існавала меркаванне, што ў доме, дзе ядуць чарніцы і суніцы, лекару рабіць няма чаго.

● Падчас Другой сусветнай вайны англійскія лётчыкі елі чарніцы з мэтай паляпшэння зроку ўначы і ў прыцемках.

● З гэтых ягад мастакі выраблялі пурпурныя і фіялетавыя фарбы, а пры змешванні соку пладоў з іншымі кампанентамі атрымлівалі фарбу для шэрсці і тканін.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ЧАРНІЧНЫЯ ЛАСУНКІ

ЗАПЯКАНКА РЫСАВАЯ З ЧАРНІЦАМІ

Вам спатрэбіцца: *каша рысавая — 2 шклянкі, чарніцы — 1 шклянка, яйка — 1, цукар — 1 ст. лыжка.*

Зварыць рысавую кашу на малацэ, астудзіць, дадаць 1 сырое яйка і старанна перамяшаць. Палову сумесі выкласці на форму, змазаную маслам, разраўняць, затым выкласці прамытыя і перабраныя ягады, а на іх астатнюю частку кашы з яйкам. Верхнюю частку пірага разраўняць, змазаць яйкам і пасыпаць цукрам. Выпякаць, пакуль не падрумяніцца верх запяканкі.

ХЛЕБНЫ ПІРОГ З ЧАРНІЦАМІ

Парэзаць 4 кавалкі белага хлеба на вялікія кубікі, пакласці на бляху і запячы пры 190 градусах на працягу 10 хвілін. Астудзіць. Узбіць 4 яйкі, 420 мл малака, 1 ч. лыжку ванільнай пудры і 3 ст. лыжкі цукру. Выкласці хлеб у невысокую форму, пасыпаць 250 г чарніц і заліць яечнай сумессю. Зверху пасыпаць 25 г здробненага міндалю і пакінуць на 30 хвілін перад выпечкай. Запякаць 40 хвілін да залацістай скарыначкі.

Невылечны штам ганарэі — новая пагроза чалавецтву

Вынік мутацыі — новы штам ганарэі, неўспрымальны да антыбіётыкаў. З такой трывожнай заявай выступілі навукоўцы. Аналіз бактэрый, якія правакуюць развіццё гэтага захворвання, выявіў унікальны тып мікраарганізмаў, які вельмі эфектыўны.

Навукоўцы са шведскай Даведачнай лабараторыі папярэджваюць: інфекцыя можа стаць новай сусветнай пагрозай і ёсць вострая неабходнасць у прарыве ў фармакалогіі. Першы выпадак выяўлення рэзістэнтнага штама H041 ужо зафіксаваны ў Японіі. Даследчыкі выявілі генетычныя мутацыі, адказныя за неўспрымальнасць ганарэі да ўсіх антыбіётыкаў класа цэфаласпарынаў. Тым часам шэраг экспертаў упэўненыя, што асноўны ўпор трэба рабіць на прадухіленне распаўсюджвання інфекцыі, а не на пошукі лячэння. Пакуль з гэтым спраўляюцца прэзерватывы, бо ганарэя — адна з самых распаўсюджаных у свеце хвароб з тых, якія перадаюцца палавым шляхам. Пры гэтым каля 50% хворых жанчын не маюць сімптомаў. Аналагічная сітуацыя з 2—5% мужчын. Калі гэтае захворванне не лячыць, то магчыма развіццё незваротных наступстваў для арганізма.

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мозырская торговая компания «Полесье», (продавец) извещает о проведении 15 августа 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объекта	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб
1	Здание старого холодильника площадью 268,0 кв.м (инв. № 330/С-8158), с асфальтным покрытием площадью 174,0 кв.м	г. Мозырь, ул. Ветровая, 21	98 568 120	9 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье», ул. Ветровая, 21, 247760, г. Мозырь.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Мозырская торговая компания «Полесье») **р/с № 3012203350014 в отделении ОАО «Белагропромбанк» г. Мозырь МФО 151501945, УНП 400082468, ОКПО 01568553 по 11 августа 2011 года включительно.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по 11 августа 2011 включительно.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом - доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитной организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству Республики Беларусь.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продаются одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 16 августа 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования, условия продажи	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Якубовского, район ОАО «Обувь»	0,0292	2 года	установка и обслуживание торгового павильона	740100000001005923	1 365 953	4 473 000	403 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

Представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельный участок расположен на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельного участка в аренду: согласование типа павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителю аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона составляет 7 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 10.08.2011 года до 17.00**.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

РРБ-Банк

Закрытое акционерное общество «Акционерный банк реконверсии и развития» www.rrb.by

220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18. ЗАО «РРБ-Банк»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.07.2011	на 01.07.2010
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	13576,5	13959,7
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	204605,1	33446,2
5	Средства в банках	1104	54446,9	41803,3
6	Ценные бумаги	1105	-	0,9
7	Кредиты клиентам	1106	314567,6	150988,2
8	Производные финансовые активы	1107	53289,3	825,8
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	12441,8	8307,7
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	5440,7	5523,7
12	Прочие активы	1111	4993,2	1980,8
13	ИТОГО активы	11	663361,1	256836,3
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	107445,5	-
16	Средства банков	1202	90850,9	52868,3
17	Средства клиентов	1203	333574,6	119905,6
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	30004,1	-
19	Производные финансовые обязательства	1205	4492,7	2721,1
20	Прочие обязательства	1206	1950,1	1071,9
21	ВСЕГО обязательства	120	568317,9	176566,9
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	55768,7	55768,7
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	3520,5	3520,5
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	2255,2	1797,6
27	Накопленная прибыль	1215	33498,8	19182,6
28	ВСЕГО капитал	121	95043,2	80269,4
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	663361,1	256836,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.07.2011	на 01.07.2010
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	25634,6	13380,4
2	Процентные расходы	2012	14453,5	4931,6
3	Чистые процентные доходы	201	11181,1	8448,8
4	Комиссионные доходы	2021	16900,8	11330,0
5	Комиссионные расходы	2022	1194,7	157,8
6	Чистые комиссионные доходы	202	15706,1	11172,2
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	83,1
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(65129,3)	3712,5
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	67668,6	(1368,2)
11	Чистые отчисления в резервы	207	6089,3	1126,5
12	Прочие доходы	208	2636,3	1526,5
13	Операционные расходы	209	14537,6	11731,8
14	Прочие расходы	210	1455,6	1282,9
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	9980,3	9433,7
16	Налог на прибыль	212	1931,7	1601,7
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	8048,6	7832,0

Председатель Правления **Ю.Г. Мартынов**

Главный бухгалтер **Е.Е. Петрович**

Дата подписания «11» июля 2011 г.

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 21 от 31.01.2008. УНП 100361187

НЯПТУН НІКОЛІ НЕ ЗНАХОДЗІЎСЯ ЛЯ МОРА

Вада або «далёкая планета»?

Калі ў Старажытным Рыме пачыналася засуха, рыбакі заставаліся без улову, а маракі не маглі адшукаць шлях дадому, то кожны ведаў, што вырашыць усе гэтыя праблемы толькі бог мора. Але іншы час — і новыя погляды. Цяпер вера ў нейкія асаблівыя здольнасці міфічнага бога выклікае хіба што шчырую ўсмешку. Аднак, насуперак скептыкам, Няптун усё ж ёсць. І ёсць у нашай Беларусі.

ЧАСАМ ЖАРТЫ — РЭЧ СУР'ЁЗНАЯ

Пры жаданні дабірацца сюды можна двума маршрутамі — як з Кіраўска, так і з Бабруйска. Аднак у любым выпадку тут трэба арыентавацца на буйную вёску, а дакладней, ужо на аграгарадок Жылічы. Па сутнасці, яго і варта лічыць тым самым «канчатковым пунктам прызначэння». Бо калі б не дарожны паказальнік, то разабрацца, дзе заканчваюцца Жылічы і дзе пачынаецца пасёлак Няптун, амаль немагчыма.

— Мы прыехалі сюды ў 1955 годзе — тады тут, у цяперашнім пасёлку Няптун, стаялі толькі тры хаты, — узгадвае пенсіянерка, былая настаўніца геаграфіі і завуч Жыліцкай сярэдняй школы Ева Іванаўна Зайкоўская. — І калі неўзабаве ўзнікла пытанне аб будаўніцтве, то нечакана высветлілася, што «пустой» зямлі ў Жылічах амаль няма. Тады муж падумаў і прапанаваў выйсце — ставіць хату ў пасёлку Няптун. Прычым знайшоў «жалезны» аргумент: тут рэчка, а ў ёй — рыба. І рыбы было шмат. Бывала нават такое: пойдзеш паліваць агарод, зачарпнеш вядро ў Добасне, а ў тым вядры — уюн.

Палац — прынада для турыстаў.

Падобнае суседства — зусім не выпадковае. Многія з мясцовых распавядаюць: дзесьці ў 30-х гадах мінулага стагоддзя адзін з жыхароў Жыліч па прозвішчы Нагуль вырашыў пабудавацца крыху наводдаль ад вёскі. І менавіта гэтая «адлегласць ад цывілізацыі» адыграла сваю ролю. Жартам сталі казаць прыкладна так: пасяліўся — нібы на ўскрайку Сусвету. Або «нібы на планеце Нептун».

Аднак існуе і іншая, не менш папулярная версія. Новы пасёлак узнік у балоцістай мясціне, літаральна на самым беразе рэчкі Добасна з яе шматлікімі невялікімі прытокамі і адтокамі. Вось і ўзгадалі тутэйшыя жартаўнікі імя старажытнарымскага бога. Бо сапраўды — вады і вільгаці было заўсёды шмат.

— Няхай сабе каля Жыліч і Няптуна няма свайго лесу і грыбоў-ягад, але гэтыя месцы — вельмі прыгожыя, — заўважае Ева Зайкоўская. — Рэчка, парк і нават панскі палац — адметнасцяў тут шмат. Аднак перш-наперш варта сказаць пра нашых людзей. Яны надзвычай спакойныя, ураўнаважаныя, а яшчэ — вельмі працавітыя. Магчыма, таму яны ніколі і не жылі бедна.

АД ЦЫБУЛІ З СУТАРЭННЯ ДА ПАРЭЧАК

Рыбалка — проста хобі. І зразумела, што асноўны даход дае зусім не яна. Нехта з мясцовых жыхароў заняты ў сельгаспрадпрыемстве «Жылічы» — гаспадарцы па-сапраўднаму моцнай. Іншыя ж маюць свой невялікі бізнэс або працуюць у сацыяльнай сферы, і ў тым ліку — у вядомым Жыліцкім сельскагаспадарчым каледжы.

Аднак асноўная праца — далёка не ўсё. Ці не ўсе жыхары пасёлка Няптун трымаюць свіней, курэй, качак, а многія — кароў і нават коней. А да таго ж ці не ўсе актыўна займаюцца агародніцтвам. Прычым што адметна — без асаблівай аглядкі на «высокія» і «нізкія» сезоны.

Так, узімку ў сутарэннях дамоў вырошчваюцца цыбуля і радыска. У чэрвені тут капаюць і прадаюць бульбу — яе садзяць на агародах напрыканцы сакавіка — у пачатку красавіка «пад плёнку». А вось ліпень — час парэчак. Іх тут нямала, сёння ўявіць вясковыя вуліцы без машын нарыхтоўшчыкаў проста немагчыма. І, дарэчы, нарыхтоўшчыкі едуць не толькі з Кіраўска, але і з суседніх Жлобінскага і Рагачоўскага раёнаў.

— Цяпер кілаграм чорных парэчак сталі прымаць па пяць тысяч рублёў, і такая цана даволі выгадная, — усміхаецца жыхар пасёлка Няптун Яўген Аляксандравіч Філіпенка. — Сапраўды, збіраць ягады не так і проста — будуць балець рукі-ногі. Аднак справа ўсё ж вартая, бо здай тры кашы — і атрымай 140 тысяч. А гэтая капейка — не лішняя.

Тры кошыкі — 140 тысяч.

САМА НАЗВА — ТУРЫСТЫЧНЫ БРЭНД

Запытайся, што мае цяперашні Няптун, і пачуеш у адказ — нічога. Аднак асаблівай бяды тут нібыта няма. Бо зноў жа зусім побач — Жылічы. А значыць, і ўся «стандартная» для аграгарадка інфраструктура — ад школы, дзіцячага садка і амбулаторыі да крамаў, лазні і банкаўскага філіяла. У Жылічах ёсць нават кавярня. А плюс да таго — і свая невялікая царква.

— На першы погляд, статыстыка не ўражвае: у цяперашнім пасёлку Няптун жыве крыху больш за сто чалавек, і ў тым ліку — усяго дзесяць дзяцей, — зазначае старшыня Дабасненскага сельвыканкама Галіна Шчур. — Аднак лічбы не павінны ўводзіць у зман. Запісваць Няптун у спіс «неперспектыўных» населеных пунктаў адназначна нельга. Так, нехта з моладзі паступае вучыцца і ў рэшце рэшт застаецца жыць у гарадах. Аднак людзі адсюль не «бягуць». Хутчэй наадварот: многія перакананы, што, дзякуючы суседству з аграгарадком і вельмі добрым, урадлівым землям, лепш жыць якраз тут. Таму ў цяперашнім пасёлку няма ніводнай закінутай хаты. Калі той або іншы дом вызваляецца — яго адразу ж купляюць. А нехта і будуецца самастойна.

Прычым у будучыні гэтае месца можа стаць яшчэ больш прывабным. Сёлета ў Жылічах завершыцца аднаўленне часткі колішняга панскага палаца. У адрамантаваных памяшканнях размесціцца музычная школа і бібліятэка. Але ці не галоўнае — палац стане больш прывабным для турыстаў.

— Зразумела, што палац і размешчаны каля яго стары парк будзе неабходна даглядаць, а турыстаў — накарміць, — зазначае Галіна Шчур. — Такім чынам, з'яўляюцца добрыя магчымасці для стварэння новых працоўных месцаў, і гэтыя перспектывы не прывідныя — у нас ужо распачалося будаўніцтва другой прыватнай кавярні. А што ж да цікавасці з боку падарожнікаў, то сумнявацца не выпадае: панскі палац і сама назва пасёлка зробяць сваю справу. Таму адна з задач на заўтра — адрадзіць тэатралізаванае свята Нептуна. Быў час, калі яно ладзілася ў нас ці не штогод — на Купалле.

Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.

Кіраўскі раён.

Новая хваля-2011

ПАДРЫХТАВАЦЬ ЮЗАРЫ ДА «НОВАЙ ХВАЛІ»

прадзюсары разлічваюць за паўтары тысячы еўра

БЕЛАРУСЬ на конкурсе маладых выканаўцаў «Новая хваля-2011» прадставіць малады спявак Юрый Наўроцкі — ён жа Юзары. Хлопцу ўсяго 20 гадоў, аднак ён ужо мае вопыт выступлення ў Пецярбургскім мюзік-холе і «Еўрабачанні». Пра тое, з якім настроем спявак адпраўляецца на конкурс у Юрмалу, ён распавёў журналістам.

— У мяне карцінка склалася даўно, як усё будзе, — я ведаю, якія песні буду выконваць і прыблізна ведаю канцэпцыю сваіх музычных нумароў, — гаворыць **прадстаўнік Беларусі на «Новай хвалі», спявак Юзары**. — А вось як там усё сыграецца, невядома. Толькі Усявышні ведае, як «карты лягуць». Спадзяюся, удасца паказаць тое, што мы падрыхтавалі.

Між іншым, як сцвярджае прадзюсар спевака Іна Радаева, ніякіх гарантый таго, што ўсё запланаванае, з чым едзе беларуская каманда ў Юрмалу, з'явіцца ў рэшце рэшт на сцэне, няма.

— За 10 дзён праходзяць сапраўды цікавыя рэчы, — зазначае Радаева. — Артысту, калі можна так сказаць, наноў «прашываюць» мозг. Дзядзя Ваня паехаў туды адным чалавекам, а прыехаў зусім іншым артыстам. Мы ехалі туды са сваім рэпертуарам, у выніку прыйшлося некалькі разоў яго перайначваць і змяняць. Для артыста гэта добрая школа і добрая праверка: ці здольны ты змяніцца настолькі, каб выстаяць.

АДКУЛЬ ЮЗАРЫ РОДАМ?

Юзары (Юрый Наўроцкі) нарадзіўся і вырас у Беларусі. Сёння спявак вучыцца ў Санкт-Пецярбургу на 4-м курсе Пецярбургскага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (факультэт эстрады і джазавага вакалу). Бацька артыста мае музычную адукацыю па класе трубы, маці — салістка Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

Хто будзе прыдумляць касцюмы для Юзары?

За кожным з удзельнікаў «Новай хвалі-2011» замацаваны пэўны дызайнер. Менавіта яны будуць адказваць за канцэртныя касцюмы артыстаў, у якіх тыя выйдуць на сцэну. У Юзары такі дызайнер таксама ёсць. Аднак пакуль густ дызайнера беларусам зусім не даспадобы:

— Гэта зусім не тое, што нам трэба, — крытыкуе дызайнера Радаева. — Эскізы касцюмаў, якія ён выслаў нам па інтэрнэце, катэгарычна не падыходзяць. Гэта абсалютна не стыль Юзары. Застаецца спадзявацца, што ўсё ж мы знойдзем з ім агульную мову.

Спецыяльнага прыза ад Пугачовай сёлета не будзе

«Усё, што будзе гучаць на «Новай хвалі» ў беларускім нумары, будзе зроблена маімі рукамі», — заяўляе спявак Юзары. Як вядома, пакуль прадстаўнік нашай краіны ўсё робіць сам: піша тэксты і аранжыруе. Яго ініцыятыву падтрымлівае і маці Галіна Грамовіч, якая з'яўляецца яго педагогам па вакале.

— «Новая хваля» — гэта ўсяго толькі яркі старт, — лічыць Радаева. — Але мы будзем вельмі старацца ўзяць калі не прызавое месца, то, як мінімум, спецыяльны прыз. Ала Пугачова па аб'ектыўных прычынах сёлета не прыедзе. Замест яе будзе нейкі вельмі значны прадзюсар-гігант, які зацвердзіць свой музычны прыз. І як мы ўжо даведаліся, хутчэй за ўсё гэта будзе магчымасць працы ў вельмі прасунутым амерыканскім «лэйбле». Было б добра атрымаць якраз гэты прыз.

Фінансавыя расходы на падрыхтоўку беларускага канкурсанта, як прызнаецца прадзюсар, зведзены да мінімуму. Па словах Іны Радаевай, калі на конкурс ездзіў Дзядзя Ваня, іх уласных грошай было патрачана 1,5 тысячы еўра.

— Я не думаю, што ў выпадку з Юрам мы выйдзем за межы гэтай сумы, — заявіла Радаева.

Ілья ЛАПАТО.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ТЫМ ЧАСАМ:

Свой багаж рэпертуару на дзіцячы конкурс «Новая хваля-2011» у Артэк рыхтуе і беларуска Алена Гразнова, якая прадставіць Беларусь на дзіцячым конкурсе. Як прызналася дзяўчынка, да ад'езду яшчэ палова месяца, аднак ужо сёння яна вельмі актыўна рыхтуецца да яго. Акрамя вакалу, дзяўчына рыхтуе і сувеніры — магніцікі з мульцяшнай выявай Лены і адмысловыя майкі з яе лагатыпам.

Інфляцыя за паўгода склала 36,2 працэнта

Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў чэрвені 2011 года ў параўнанні са снежнем 2010 года склаў 136,2 працэнта, у параўнанні з маем 2011-га — 108,6 працэнта.

Індэкс цэн вытворцаў прамысловай прадукцыі ў чэрвені ў параўнанні з маем склаў 121,3 працэнта, у тым ліку на інвестыцыйныя тавары цэны павялічыліся на 20,1 працэнта, на прамежкавыя тавары — на 26 працэнтаў, на спажывецкія тавары — на 13,6 працэнта.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Браканьер з нажом

Майстар аховы рыбгаса «Сялец» (Бярозаўскі раён) паспрабаваў на тэрыторыі гаспадаркі затрымаць браканьера, які незаконна лавіў рыбу.

Невядомы дастаў нож і нанёс майстру мноства ўдараў у шыю, жывот, твар... і ўцёк.

Пасядзелі «па-суседску»...

У в. Рабковічы (Баранавіцкі раён) два суседы селі выпіць, а калі кульнулі па чарцы, пачалі высвятляць адносіны.

Падчас сваркі 76-гадовы схапіў нож і ўдарыў 52-гадовага, які і сканаў на месцы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Тэлефонная хвароба

Дзень 13 ліпеня ўвайшоў у гісторыю ў 1876 годзе. Аляксандр Бэл атрымаў патэнт на прыбор, які стаў прататыпам сучаснага тэлефона: ён паслаў па правадах першае гукавое паведамленне, якое было перададзена з дапамогай электрычнасці.

Гэта быў грандыёзны крок у тэхнічным прагрэсе, які праз сотню гадоў прывёў нас да невялікай бесправадной прылады, якую можна знайсці сёння ў кожнага ў кішэні, — мабільнага тэлефона.

Аднак ці варта казаць толькі аб адной карысці тэлефона, калі пра яе кажуць усе і ўсюды? Нашай задачай з'яўляецца папярэджанне ад згубнага ўплыву мабільніка. З'явіўшыся не так даўно, мабільны тэлефон ужо стаў абавязковым атрыбутам нашага жыцця. І спарадзіў у грамадстве бясконцую дыскусію аб суадносінах шкоды і карысці ад выкарыстання гэтага дасягнення сучасных тэхналогій.

Калі мабільнік працуе, то ён стварае вакол сябе электрамагнітнае поле. Падчас гутаркі пад яго ўплывам знаходзіцца мозг чалавека, які размаўляе. Гэты ўплыў можа стварацца дадатковую рызыку пагаршэння здароўя і можа спрыяць у першую чаргу пагаршэнню памяці, увагі, здольнасці да навучання, паніжэнню якасці сну, развіццю павышанай стамляльнасці, паніжэнню хуткасці рэакцыі. Змены ў самаадчуванні могуць наступіць ужо праз год-два, калі чалавек не будзе прытрымлівацца правілаў карыстання мабільным тэлефонам.

Наогул жа сітуацыя з небяспекай мабільных тэлефонаў шмат у чым нагадвае сітуацыю з курэннем: з аднаго боку, ёсць навуковыя звесткі аб патэнцыйнай небяспецы электрамагнітнага поля, а з іншага — інтарэсы галіны сувязі, якія яна прадстаўляе. Ды і грамадства ў цэлым жадае быць мабільным, каб атрымліваць эканамічныя выгады. Гэта і перашкаджае пачуць небяспечныя здагадкі і прагнозы.

Аднак за здароўем трэба сачыць, і гэтага ніхто не адмяняў. І як жа ратавацца карыстальнікам мабільнай сувязі?

- Варта пазбягаць частага размяшчэння тэлефона каля вуха. Купіце сабе навушнікі. Хоць лекары ўсё яшчэ не на сто працэнтаў упэўнены, што гэта дапамагае. Але не шкодзіць жа?
- Пры куплі новенькага мабільніка абавязкова правярайце, ці адпавядае ён патрабаванням стандарту бяспекі. Патрабуйце копію сертыфіката на пэўную мадэль.
- Выбірайце сотавую кампанію, якая забяспечвае максімальна шчыльнае размяшчэнне рэтранслятараў. Чым больш тэлефон напружваецца ў пошуках базавай станцыі, тым больш шкодная доза, якую атрымлівае ваш мозг.
- Аддавайце перавагу тэлефонам сярэдніх памераў: чым менш тэлефон — тым больш дакладны ўдар будзе выпрабоўваць галаўны мозг. Тым больш, што малюсенькія трубкі ўжо не ў модзе.
- Не варта размаўляць па мабільніку ў транспарце: адбіваючыся ад яго металічнага корпуса, выпраменьванне тэлефона павялічваецца ў некалькі разоў.
- Не трымайце трубку каля вуха, чакаючы адказу абанента. Глядзіце на экран і падносьце тэлефон да вуха, калі злучэнне адбылося. Ёсць версія, што менавіта ў гэты час мабільны найбольш шкодны.
- Уначы кладзіце тэлефон як мага далей, за 1,5-2 метры ад ложка. І выпраменьванне менш, і верагоднасць праспаць таксама зніжаецца. Бо, каб выключыць будзільнік на тэлефоне, трэба будзе ўстаць.
- Калі носіце акуляры ў металічнай аправе, падчас гутаркі па тэлефоне іх лепш здымаць.
- Лепш не карыстацца тэлефонам у зоне слабага дзеяння сігналу (напрыклад, на вакзалах і ў аэрапортах, у зачыненых памяшканнях, у метро, у скляпах), бо інтэнсіўнасць электрамагнітнага выпраменьвання ўзрастае ў дзясяткі разоў.
- І паспрабуйце не балбатаць па мабільніку цэлы дзень! Гаварыць можна не даўжэй за тры хвіліны, і пры гэтым паміж гутаркамі трэба рабіць паўзу хвілін на пятнаццаць.

Не так шмат людзей прыслухоўваюцца да падобных парад. І чым акажацца ў будучыні падобнае неасцярожнае стаўленне да праблемы, сёння прадказаць немагчыма. Чыста гіпатэтычна ўсё можа скласціся і так: выпраменьванне сотавых тэлефонаў пагаршае працу мозга; такім чынам, знізіцца інтэлектуальны патэнцыял, будуць прымацца не самыя лепшыя рашэнні — а значыць, магчымы і рэгрэс чалавецтва. Магчыма, гэта ўжо некаторае перабольшванне, але ўздзеянне электрамагнітнага поля на мозг, выкліканае мабільнай сувяззю, сапраўды не вывучанае і непрадказальнае...

Ганна БУРАК,

студэнтка факультэта журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ.

ТЕХНОБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2011 года

Наименование банка: **ОАО «Технобанк»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01.07.2011	01.07.2010
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		29626,5	15951,1
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		14,4	31,4
4	Средства в Национальном банке	1103		41078,0	16981,8
5	Средства в банках	1104		71932,6	25085,2
6	Ценные бумаги	1105		18815,1	15099,7
7	Кредиты клиентам	1106		330939,8	202695,6
8	Производные финансовые активы	1107		-	7,4
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		66,5	50,8
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		72459,2	76676,3
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		9293,2	1274,6
12	Прочие активы	1111		56241,9	58877,6
13	**ИТОГО АКТИВЫ**	**11**		**630467,2**	**412731,5**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		292,6	-
16	Средства банков	1202		90969,8	32150,9
17	Средства клиентов	1203		343972,3	201018,4
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		63526,7	14960,9
19	Производные финансовые обязательства	1205		9,4	29,4
20	Прочие обязательства	1206		9919,8	65106,6
21	**ВСЕГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**	**120**		**508690,6**	**313266,2**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		46586,9	46450,4
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		7171,0	7060,6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		43714,2	34758,5
27	Накопленная прибыль	1215		24304,5	11195,8
28	**ВСЕГО КАПИТАЛ**	**121**		**121776,6**	**99465,3**
29	**ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ**	**12**		**630467,2**	**412731,5**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2011 года

Наименование банка: **ОАО «Технобанк»**

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01.07.2011	01.07.2010
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		17405,5	19379,0
2	Процентные расходы	2012		14665,8	9474,4
3	**Чистые процентные доходы**	**201**		**2739,7**	**9904,6**
4	Комиссионные доходы	2021		14761,1	9133,8
5	Комиссионные расходы	2022		5258,6	1583,6
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**		**9502,5**	**7550,2**
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		2,8	1,1
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		810,5	35,6
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		27965,0	6497,1
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(1104,5)	(280,1)
11	Чистые отчисления в резервы	207		6496,1	1217,7
12	Прочие доходы	208		8520,4	11641,5
13	Операционные расходы	209		27139,1	29333,0
14	Прочие расходы	210		1596,7	2215,2
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		13204,5	2584,1
16	Налог на прибыль	212		275,8	857,6
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**12928,7**	**1726,5**

И.о. Председателя Правления **Д.М. Богуш**

Главный бухгалтер **Н.А. Кузьмицкая**

06 июля 2011 года

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010 г.

Гэта мы, Госпадзі

ЖАХ НА АГАРОДЗЕ

У вёсцы Капусціна Кіраўскага раёна знайшлі труп дзяўчыны, якую забілі паўтара года таму.

У адным з вясковых дамоў моладзь святкавала надыход 2010 года, і 2 студзеня на агульным вельмі нецвярозым фоне дзве сяброўкі нешта не падзялілі. Адна стукнула другую сякерай па галаве, а мёртвае цела закапала на агародзе. Сваякі забітай дзяўчыны яе не шукалі і ў міліцыю не звярталіся: меркавалі, што тая з'ехала. Але некалькі дзён таму пра злачынства выпадкова даведаўся адзін з сялян. Калі прыехала міліцыя, абвінавачаная не стала адмаўляцца і спакойна паказала месца пахавання. Ёй толькі 20 гадоў, але забойцы пагражае тэрмін зняволення ад 6 да 15 гадоў.

Алена КАЗЛОВА.

«А чаму б не аб'явіць 2012-ы годам ініцыятывы моладзі па адраджэнні пасля Чарнобыля?»

Надзея ДРЫЛА

ЧЫМ мы можам быць карысныя жыхарам Краіны ўзыходзячага сонца? Калі ў Беларусі з'явіцца альбом-даведнік па пацярпелых раёнах? Якія намаганні прыкладаюцца, каб павысіць прывабнасць гэтых раёнаў не толькі для турыстаў, але і для маладых спецыялістаў? Пра гэта і не толькі размаўляем з дырэктарам Беларускага аддзялення Расійска-беларускага інфармацыйнага цэнтра (далей БАРБІЦ. — Аўт.) па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Інстытута радыялогіі МНС Беларусі Зояй ТРАФІМЧЫК.

Постчарнобыльскі вопыт Беларусі запатрабаваны ў свеце

— Не так даўно нашу краіну наведала дэлегацыя спецыялістаў сельскай гаспадаркі з Японіі...

— Пасля выбуху на «Фукусіме-1» у японцаў з'явіліся тыя ж самыя праблемы, што былі ў нас пасля чарнобыльскай аварыі. Тады, у цяжкія для Беларусі часы, Японія аказвала нашай краіне дапамогу як у пастаўцы медабсталявання, так і ў правядзенні навуковых даследаванняў. Зараз жа мы таксама адразу адгукнуліся на просьбу японскіх калег, таму сёння яны будуць пачынаць праводзіць свае даследаванні не з нуля, а абапіраючыся на назапашаны ў Беларусі вопыт.

— Якія пытанні асабліва цікавілі японцаў падчас візіту?

— Як атрымаць чыстую прадукцыю, як вызначыць дапушчальныя ўзроўні наяўнасці радыенуклідаў у вадзе, паветры, глебе, прадуктах харчавання... Іх зацікавілі прыборы радыяцыйнага кантролю, вытворчасць якіх мы асвоілі. Сёння складана сказаць, якая канкрэтна інфармацыя будзе карыснай для японцаў, бо ў нас ёсць адрозненні ў структуры той жа глебы, прадуктах. Японскія калегі расказвалі аб нармаванні ўтрымання радыенуклідаў у рысе, бамбуку, грыбах шыітаке. А мы ў Беларусі не вырошчваем ні першае, ні другое, ні трэцяе. За чатыры дні японцы наведалі не толькі наш цэнтр, але і пазнаёміліся з работай Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС, Інстытута глебазнаўства і аграхіміі, Інстытута радыялогіі. Дарэчы, пасля прэзентацыі працы нашага цэнтра госці сказалі, што па вяртанні на радзіму будуць прапаноўваць, каб такі цэнтр быў створаны і ў Японіі.

— Прыезд японцаў даказвае, што Беларусь успрымаецца ў свеце не толькі як найбольш пацярпелая пасля аварыі на ЧАЭС краіна...

— Так, але і як краіна, якая назапасіла ўнікальны вопыт пераадолвання наступстваў катастрофы. За мяжой з павагай адгукаюцца аб тым, як у нас арганізаваныя радыяцыйны кантроль, сістэма аздараўлення дзяцей, інфармацыйная праца з насельніцтвам, як быў створаны і вядзецца рэестр пацярпелых. Таму, лічу, сёння мы маем поўнае права пазіцыянаваць сябе ў якасці краіны-эксперта.

Ці з'явіцца ў Беларусі мемарыял адселеным вёскам?

— У Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пазіцыя адносна наладжвання турыстычных экскурсій у зону адселенне адназначная — адмоўная. Што вы думаеце наконт гэтага?

— На дадзены момант «чалавек з вуліцы» ў зону адсялення, у тым ліку і ў Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік, трапіць не можа. Наведванне яе прафесійнае, строга рэгламентаванае: ладзіцца толькі па пропусках. «Масавае» наведванне гэтых месцаў не прадбачыцца і ў перспектыве», так бы вам адказалі ў Дэпартаменце. Я ж заўважыла, што ў людзей той самы Палескі запаведнік, які знаходзіцца за калючым дротам, выклікае страх, боязь, а то і наогул варожыя адносіны. Таму ўяўляецца важным павярнуць нашу работу ў іншы бок. Трэба выхоўваць пазнавальны інтарэс да падобных, хоць і небяспечных, аб'ектаў. Выпускнікі экалагічнага ўніверсітэта імя Сахарава таксама кажуць, што трэба больш прасоўваць магчымасць знаёмства з гэтымі аб'ектамі. Гэта можа быць як верталётная экскурсія, так і бяспечны маршрут памяці. Таксама ініцыятыўныя маладыя людзі прапаноўваюць стварыць віртуальны музей пад адкрытым небам «Палескі запаведнік». Каб насельніцтва разумела, што там адбываецца. Не ўсе, напрыклад, ведаюць, што там ёсць музей, пчаліная ферма, вядзецца навукова-практычная дзейнасць. На маю думку, мы разам з Палескім запаведнікам і Дэпартаментам усё ж такі павінны пашукаць шляхі разумнага і, падкрэсліваю, бяспечнага, знаёмства з гэтымі аб'ектамі. Ёсць цікавыя прапановы, але яны павінны быць абгрунтаваны спецыялістамі. Маецца ў нас і яшчэ адна ідэя. Пад Мінскам пасля вайны з'явіўся мемарыяльны комплекс «Хатынь». Можа, праз пэўную колькасць гадоў варта было б стварыць такі ж мемарыял, толькі адселеным пасля Чарнобыля вёскам...

Каб не думалі пра пацярпелыя раёны толькі ў негатыве

— Існуе думка, што моладзь не надта ахвотна едзе па размеркаванні ў пацярпелыя раёны. А той, хто і паехаў, пасля двухгадовай адпрацоўкі адразу ж з'язджае адтуль.

— Гэта не стопрацэнтная тэндэнцыя. Ёсць нямала прыкладаў, калі маладыя людзі застаюцца там, стваральваюць сем'і. І нават не тыя, якія родам адтуль. Каб такіх прыкладаў станавілася больш, наш цэнтр апошнім часам і стаў больш актыўна працаваць з моладдзю.

— Раскажыце пра гэта, калі ласка, падрабязней.

— Сёлета стварылі пілотнае інфармацыйнае радыеэкалагічнае аб'яднанне ва ўніверсітэце імя Куляшова ў Магілёве. Мы ўжо прыязджалі да іх тройчы. На сустрэчы запрашалі беларускіх навукоўцаў, якія працуюць па чарнобыльскай тэматыцы, каб яны кампетэнтна, без скажоных фактаў, інтэрпрэтавалі існуючыя міфы-стэрэатыпы.

Малюнкі беларускіх дзетак на тэму «Чарнобыль: мінулае, сучаснасць, будучыня» высока ацэньваюцца за межамі краіны. Былі нават прапановы, каб асобныя з іх выставіць на аўкцыёне.

У чэрвені скончыліся два конкурсы: конкурс эсэ студэнтаў ВНУ і ССНУ «Пацярпелыя раёны: мой погляд у будучыню» і конкурс ідэй па стварэнні сацыяльнай рэкламы чарнобыльскай тэматыкі «Моладзь — адраджэнню, развіццю, будучыні!». Конкурс сацыяльнай рэкламы праводзілі сярод маладых людзей, якія працуюць у 21 найбольш пацярпелым раёне, каб распрабаваць вывіць і прасунуць нейкія новыя прадукты. Там жыве 1 млн 100 тысяч нашых суайчыннікаў. Нехта, можа, мае брэнд па вырошчванні бульбы альбо клубніц, нехта пакажа культурную спадчыну свайго мястэчка. Каб людзі не думалі пра гэтыя раёны як выключна пра чарнобыльскую зону, у негатыве. Дарэчы, мы рыхтуем разам з музеем Кандрата Крапівы па даручэнні ўрада альбом-даведнік па пацярпелых раёнах. У даведніку будуць сабраныя славутасці раёнаў: унікальныя абрады, прыродныя, культурныя, гістарычныя помнікі. Сярод іх — Блакітная крыніца ў Слаўгарадзе, крыніца ў Краснаполлі, векавыя дубы... Усё гэта можа выклікаць цікавасць замежных турыстаў. Прэзентацыя альбома запланавана на канец ліпеня.

— Што тычыцца конкурсу эсэ, магчыма, моладзь выступіла з нейкімі цікавымі прапановамі, якія маюць права на жыццё?

— Напрыклад, адзін малады чалавек прапаноўвае аб'явіць 2012 год годам ініцыятывы моладзі па адраджэнні пасля Чарнобыля. Многія шкадуюць у сваіх эсэ, што школьныя падручнікі змяшчаюць вельмі мала інфармацыі па чарнобыльскай катастрофе, дзеяннях Беларусі па пераадоленні яе наступстваў. Каб у школьніка ў заставаўся негатыў у памяці назаўсёды, маладыя людзі прапануюць працаваць над зменай вучэбных праграм. Выпускнік жа ўніверсітэта імя Сахарава і слухач Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце прапануе стварацьмясцовыя аб'яднанні моладзі і школьнікаў. Матывуе гэта тым, што ініцыятыва знізу і прынясце адказнасці на сябе за жыццё на сваёй тэрыторыі будзе дзейсным у плане адраджэння пасля Чарнобыля. Ідэй шмат. Самыя цікавыя з іх будзем прапаноўваць Дэпартаменту для рэалізацыі. Акрамя таго, асобных выпускнікоў, якія ўдзельнічалі ў конкурсе, плануем запрасіць на працу ў наш цэнтр. Іншым арганізацыям, якія працуюць па чарнобыльскай тэматыцы, прапануем таксама звярнуць увагу на гэтых неабыякавых маладых людзей.

Сацыяльна-эканамічныя праекты на «ўра» ўспрымаюцца мясцовымі жыхарамі

— У інтэрнэце на форумах можна прачытаць, што рэспубліка не займаецца чарнобыльскай тэмай, актыўна асвойвае забруджаныя землі...

— Даводзіцца чуць падобныя нараканні, але, як правіла, ад людзей, якія далёкія ад гэтай тэмы. Такім я раю зайсці на сайт Дэпартамента і азнаёміцца з Дзяржаўнай праграмай на пяцігодку па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы, якая прынятая і рэалізуецца. Кампетэнтна заяўляю, што праз 25 гадоў пасля катастрофы наша краіна па-ранейшаму праводзіць увесь комплекс ахоўных мерапрыемстваў. Акрамя таго, новая праграма накіравана і на сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых раёнаў. Напрыклад, каб мясцовае насельніцтва не хадзіла ў лес па ягады і грыбы, плануецца запусціць праекты па вырошчванні культываваных буйнаплодных буякоў, журавін, вешанак. У межах мінулай праграмы запушчаны і зараз рэалізуецца праект фермера ў Століне «Яблыневы сад», праект па вытворчасці таварнай канціны ў Слаўгарадскім раёне, праект «Палескія сыры» ў Хойніцкім раёне і інш. Гэтыя праекты паказалі жыццяздольнасць, іх вельмі добра ўспрымае насельніцтва. І нядзіўна, бо гэта і новыя працоўныя месцы, і чыстая і якасная прадукцыя, і сімпатычныя ўпакоўкі, і новыя тэхналогіі. Падыход да праектаў вельмі строгі. Гэта бюджэтнае фінансаванне, перш чым яны будуць рэалізаваны, павінны прайсці навукова-тэхнічную экспертызу. Што тычыцца, як вы сказалі «актыўнага» ўводу земляў у абарот. Некаторыя землі сапраўды ўводзяцца ў абарот, але тут важна сказаць пра тое, наколькі жорсткая ў Беларусі гэта працэдура. Пытанне разглядаецца на нацыянальным узроўні — мясцовыя ўлады звяртаюцца да абласных інстанцый, пытанне ўважліва вывучае міжведамасны савет. Можна прывесці нямала выпадкаў, калі запыты мясцовай улады на расшырэнне выкарыстоўвання земляў не былі задаволены. Калі ёсць нейкае незаконнае ўвядзенне, маюцца сур'ёзныя адміністрацыйныя спагнанні.

...

Напрыканцы размовы Зоя Іванаўна запрасіла ўсіх цікаўных і неабыякавых стаць актыўнымі наведнікамі сайта www.rbic.by. Там можна даведацца, што робіцца ў рэспубліцы ў сферах жыцця, якія маюць адносіны да чарнобыльскіх праблем. Цэнтр таксама выпускае часопіс «Адраджаем родную зямлю», які выходзіць штомесяц у друкаваным і электронным варыянце. Прычым у электронную рассылку БАРБІЦ гатовы ўключыць усіх ахвотных. Для гэтага дастаткова накіраваць запыт на адрас info@rbic.by з указаннем сваёй электроннай скрыні.

ТАКСІСТА ВЫРАТАВАЎ ВЫПАДАК...

22-гадовы непрацоўны і 16-гадовы навучэнец ПТВ напалі з кухонным нажом на гродзенскага таксіста, які шпіталізаваны са шматлікімі раненнямі, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага абл-выканкама.

Начныя пасажыры селі ў таксі на прывакзальнай плошчы абласнога цэнтра, каб паехаць на дачу за горадам. Па дарозе яны размаўлялі з кіроўцам пра цяжкасці яго прафесіі, цікавіліся заробкамі, а за вёскай Каробчыцы папрасілі звярнуць у лясны масіў. І тут жа пасажыр на заднім сядзенні, не чакаючы спынення машыны, накінуўся на таксіста з нажом. Іншамарка «Кія» ўрэзалася ў дрэва і заглухла, завязалася барацьба.

Мужчыну выратаваў выпадак: на шчасце, побач на дарозе аказаўся аўтамабіль, што выехаў з жылой забудовы, і акрываўленаму таксісту з крыкам аб дапамозе ўдалося выскачыць яму насустрач. А налётчыкі, зразумеўшы, што не здолеюць завалодаць машынай, схаваліся ў лесе. Неўзабаве яны былі затрыманы міліцыяй, заведзена крымінальная справа.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЧАРГАВАННЕ МЕСЯЦАЎ І СТЫХІЙ

Красавік звычайна напоўнены сонечнасцю да краёў. Сонечнасць у празрыстым красавіку такая пякучая, што яе можна называць вогненнай. Красавік — вогненны месяц. Сакавік, безумоўна, месяц вады, месяц плыняў ды ручаінаў. Травень — месяц духмянасцяў, месяц зямлі і квецені. Чэрвень — паветраны месяц. Ліпень цякучы, сакавіты, навальнічны, вадзяны. Жнівень, як і красавік, вогненны, пыльны, выпалены залатым і чырвоным сонцам. Зямля ў верасні збірае плады, збірае ўраджаі. Верасень зямны. Кастрычнік уздыхае з палёгкаю пасля працоўнага лета, у кастрычніку зноў лёгка і вольна дыхаецца. Лістапад змрочны ў сваіх доўгіх і халодных дажджах, змрочны ў вільготных ямінах ды ледзяных лужынах. У снежні пачынаюцца пякучыя маразы, яны запальваюць чырвань на шчоках. Студзень пад снегам глухі, як зямля. Люты ззяе ледзянымі дыямантамі ў крыштальным паветры.

ЭРЫКА І МІША

Рэжысёр з Чэхіі Эрыка Гайкова цэлы дзень праздымала дзесяціхвілінны дакументальны фільм пра мяне як паэта Адама Глобуса, пра мяне як выдаўца Адамчыка, і пра мяне як мастака Уладзіміра. Глобус з Адамчыкам паводзілі сябе сціпла, а вось Уладзімір запатрабаваў у студыю натуршчыцу. Я лічу, што мастак меў права на такое патрабаванне. Толькі заўсёдная і безадмоўная натуршчыца Лера не пагадзілася пазіраваць перад камераю. Лічу, што і яна мела такое права. У нашай краіне мастак і натуршчыца яшчэ маюць такія-сякія правы. Што невымоўна радуе і Глобуса, і Адамчыка, і Уладзіміра, і Эстрагона... Хто такі Эстрагон? Мой любімы персанаж у тэатры абсурду, створаным Сэмюэлем Бекетам. У яго на сцэне працавала пара — Уладзімір і Эстрагон. Яны чакалі Бога... Яны чакалі бОга, якога называлі ГадО. Можа яны і не чакалі бОга, а чакалі толькі таго, хто не прыйшоў, бо меў поўнае права не прыйсці, як і натуршчыца Лера. Яна не выйшла на сцэну, яна не з'явілася на здымачную пляцоўку, дзе ўсім кіравала блакітнавокая Эрыка Гайкова. Эрыка паглядзела на сваю здымачную групу і прызначыла на ролю натуры Мішу. «Памочнік рэжысёра Міша будзе пазіраваць?» — «Хто супраць?» — «Я за!» Міша — Міхаэла, шыкоўная доўгавалосая брунетка села на чырвонае крэсла і пачала глядзець у столь. Мастак Уладзімір маляваў. Малюнак атрымаўся няўдалы. Я намаляваў Мішу яшчэ два разы. Выйшла пасрэдна, але Эрыка ўпадабала малюнкі, а Міша іх папрасіла, а я іх падарыў. Тады Міша выплаціла мне ганарар за здымачны дзень. Як на трох, дык і невялікая выйшла сума, а на аднаго дык і добра. Я сабраў ўсе свае вобразы ў адно цэлае цела і адчуў эратычную лёгкасць быцця.

ІГАР І МЯСА КЕНГУРАНЯЦІ

Ігар перабраўся з нашай бязмежнай Еўразіі ажно ў Аўстралію. Ягонай жонцы надакучыла тутэйшае жыццё-быццё, яна і павяла мужа ў далёкі свет. Тут Ігар працаваў архітэктарам і падпрацоўваў кніжным графікам. Тамака ён працуе і падпрацоўвае на будоўлях, але моцна не наракае на лёс. Зрэшты, ён і тут не моцна выхваляўся сваімі стылевымі фотакалажамі. Сціплы чалавек. З такім добра ўвечары пасядзець у кавярні і паслухаць расповеды пра няблізкі кантынент. Мяне заўжды цікавіў смак кенгураняці. Гэта ўсё з-за Крукава, з якім я вучыўся ў інстытуце. Крукаў прачытаў у крымінальнай хроніцы нататку пра забойства кенгураняці ў заацырку. Падлеткі забілі аўстралійскую жывёлу, падсмажылі і з'елі. Крукаў загарэўся жаданнем пакаштаваць кенгуру. Але тады мы ўсе сядзелі за жалезнай заслонаю і жывога кенгуру бачылі толькі ў клетцы. Цяпер я з Ігарам сяджу на праспекце Незалежнасці, п'ю каву і слухаю па тэле, што мяса кенгураняці падобнае да мяса баранчыка, ён, як і ягня, скубе траву, таму і мяса ў іх падобнае. Ці-кава. Я заўжды падазраваў, што кенгураняці падобна да ягняці Божага, але не ведаў, што асноўнае падабенства — у смаку мяса.



ІВАНОЎ І В'ЕТНАМЦЫ

Іваноў кінуў паліць, пачаў шмат есці і набраў лішніх дваццаць кілаграмаў. Так зазвычай і бывае: кінеш паліць і растаўсцееш. Іваноў і так быў чалавекам у целе, а тут і зусім раздабрэў. Ён нават на дыеты садзіўся, нават ад салодкага і мучнога адмаўляўся, але лішнія дваццаць як былі на Іванове, так на Іванове і засталіся. Затое ён парадаваўся ў В'етнаме. Там ёсць павер'е: калі патрымаешся за тоўстага і калі з ім сфатаграфуешся, будзе табе вялікае в'етнамскае шчасце. Іваноў у В'етнаме адчуваў сябе зоркаю, пра што сам мне і распавядаў з шырознай фотамадэльнай усмешкаю.

ВОДГУКІ РАДАСЦІ

Безнагодная радаснасць і не радасць зусім, а прява скалазубнага глупства. Чалавек можа выскаляцца і сутаргава пакурчвацца ў пахіхікванні, а радасці ў ім ні каліва не будзе. Радасць, як і гора, мусіць мець нагоду. У мяне радасць знітавана з водгукам на дзіва. Пабачыў дзівоснае ці сутыкнуўся з нечаканай асветленасцю нават самай звычайнай рэчы і ўзрадаваўся; а радасць, каб не знікнуць імгненна, пераліваецца праз мяне ў літаратурныя ды мастацкія формы.

РЭЙЗМАН І ЗАПРАШЭННІ

Куды ні глянь — паўсюль запрашэнні. Усе ўсіх некуды запрашаюць: на хрэсьбіны, на выставы, у крамы, на прэзентацыі, на аўкцыёны, на канцэрты, на распродажы, на падключэнні, на службу, на выбары, на флэшмобы, на плошчу, на дні народзінаў, на хаўтуры, у рэшце рэшт. Адкрываеш паштовую скрынку і бачыш букеты запрашэнняў. Але сапраўдных, цёплых, чалавечых запрашэнняў сярод іх амаль няма. Іншая рэч, калі нехта асабіста цябе запрасіў праз тэлефон ці праз густоўную паштоўку ў папяровай капэрце. А яшчэ лепей, калі чалавек запрашае цябе, гледзячы ў вочы. Такое запрашэнне помніцца доўга, нават калі ты яго і не прыняў. Так Рэйзман запрасіў мяне ў Ізраіль. Мы выпадкова сустрэліся ў мінскім дварэ, і ён узрадаваўся: «Валодзя, як ты? Што ты? Дзе ты? Я тое-сёе чытаў, нешта ведаю, у цябе ёсць талент, а ў мяне ёсць белы дом на беразе мора. Праз вокны мора відаць. Можна ляжаць на скуранай канапе і глядзець на мора. Тэлефануй. Прыязджай. Кладзіся на канапу і глядзі на мора...» З Рэйзманам я вучыўся ў адным класе. У школе мы нават сябравалі. Шляхі нашыя разышліся ў розныя бакі і праходзяць у розных краінах. Але ж скрыжаваліся шляхі. Я атрымаў запрашэнне, і я яго вельмі цаню, але хутчэй за ўсё так і не выкарыстаю, як і большасць атрыманых запрашэнняў.

ЖОНКА І ЧАРВЯК СКВАПНАСЦІ

Адламалася ручка ад лядоўні, трэснула і развалілася на дзве часткі. Давялося ручку здымаць і выклікаць майстра. «Вы няправільна адчыняеце лядоўню. Каб вы асцярожна і акуратна яе адчынялі, ручка пратрымалася б сто гадоў. Цяперака вам давядзецца заплаціць за новую ручку сто тысяч». Жонка выслухала тыраду рамонтніка, і на яе напаў чарвяк сквапнасці. «За кавалак пластыка сто тысяч? Вы знарок робіце такія крохкія ручкі. Вы знарок ставіце ў лядоўні лямпачкі, якія імгненна перагараюць. Людзі заплацілі за дарагую лядоўню, а потым плоцяць і плоцяць за лямпачкі ды ручкі!» Давялося мне даваць жонцы статысячную паперку, каб утаймаваць чарвяка сквапнасці. Лядоўня з лямпачкай і ручкай мне падабаецца больш за лядоўню цёмную і без ручкі.

Адам ГЛОБУС.

ПА ШЧАСЦЕ — ВА УКРАІНУ

На заставу Брэсцкай памежнай групы паступіў сігнал, і неўзабаве на месца парушэння прыбыў нарад, які на кантрольнай паласе выявіў сляды двух чалавек, што вялі ў бок дзяржаўнай мяжы.

З дапамогай службовага сабакі ўдалося затрымаць 2 грамадзян Расіі. Жыхары Пензы (22 і 24 гадоў) мелі пры сабе прадукты, мабільныя тэлефоны, плашч-палаткі...

Затрыманыя растлумачылі, што спрабавалі нелегальна перайсці беларуска-ўкраінскую мяжу, каб знайсці лепшае жыццё ва Украіне.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Навіны сталіцы

КВАТЭРЫ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў КАМУНАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦІ, МОГУЦЬ ВЫСТАВІЦЬ НА ПРОДАЖ

Гарадскі выканаўчы камітэт прапануе выставіць на продаж кватэры, якія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці.

Пра гэта паведаміў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька на пашыраным пасяджэнні Мінскага гарадскога савета па развіцці прадпрымальніцтва.

Паводле яго слоў, гэты варыянт абмяркоўваецца як часовая мера для прыцягнення ў бюджэт валютных сродкаў, паколькі гораду неабходна фарміраваць крытычны імпарт.

— Трэба аплачваць даўгі прадпрыемства «Белрыба». Таксама неабходна заплаціць 1 млн долараў, каб набыць новую прадукцыю для УП «Кінавідэапракат». Акрамя таго, сродкі патрэбны для таго, каб УП «Мінскія інфармацыйныя тэлевізійныя сеткі» магло разлічыцца з расійскімі пракатчыкамі за іх паслугі, — удакладніў М. Ладуцька.

Паводле слоў старшыні Мінгарвыканкама, таксама разглядаецца пытанне аб тым, каб прадаваць за валюту нерухомасць, што арандуецца суб'ектамі гаспадарання на працягу пяці і больш гадоў.

— У нас ёсць шэраг такіх заявак ад прадпрымальнікаў, — адзначыў Мікалай Ладуцька. — Звярнулася, у прыватнасці, адна буйная кампанія, у якой аб'ект, які арандуецца, знаходзіцца ў цэнтры горада. Прапануем ім выкупіць яго па 6 тыс. долараў за квадратны метр.

Наталля ВАВІЛАВА, *«Мінск—Навіны»*.

УСЁ БОЛЬШ КВАТЭР ЗДАЕЦЦА Ў АРЭНДУ

Па стане на 1 ліпеня зарэгістраваны 31500 мінчан, якія плацяць падатак з даходаў ад здачы жылля ўнаём. Пра гэта карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» паведаміў начальнік сталічнай інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Уладзімір Лайкоў.

Пры гэтым за студзень—чэрвень колькасць арэндадаўцаў павялічылася больш чым на 3 тыс. (на 12%) у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам.

Стаўка падатку на кожны пакой, які здаецца ўнаём, залежыць ад размяшчэння кватэры па эканоміка-планіровачных зонах і складае 1—2 базавыя велічыні ў месяц.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ, *«Мінск—Навіны»*.

ВАЙНА НЕЗАКОННЫМ ШЛАГБАУМАМ

У Мінску аб'явілі вайну самавольна ўстаноўленым шлагбаумам і іншым закрываючым устройствам. Аб гэтым паведаміў учора на аператыўнай нарадзе ў мэрыі начальнік землеўпарадкавальнай службы Мінгарвыканкама Андрэй Дамарацкі, перадае БЕЛТА.

Такія аб'екты падлягаюць або ўстараненню, або афармленню ў адпаведнасці з заканадаўствам. За нерэгаванне на прадпісанні суб'екты гаспадарання прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці.

Усяго за апошні тыдзень выяўлена 39 фактаў самавольнай устаноўкі загараджальных канструкцый (ланцугоў, дроту з флажкамі, шлагбаумаў), 11 з іх дэманціравана, 15 у бліжэйшы час будуць узаконены, на 10 уласнікі афармілі дакументы. Але сустракаюцца выпадкі, калі пасля дэмантажу закрываючых устройстваў яны зноў вяртаюцца на свае месцы.

«Гэта пытанне знаходзіцца на кантролі, да арганізацый, якія ігнаруюць указанні і патрабаванні, будуць прымяняцца самыя строгія меры», — сказаў Андрэй Дамарацкі.

Таксама ён звярнуў увагу на неналежны выгляд некаторых узаконеных закрываючых устройстваў (усяго іх у Мінску налічваецца амаль 60), часта гэта ржавыя лагцугі, дрот з флажкамі, якія парушаюць эстэтычны выгляд горада. У месячны тэрмін трэба правесці інвентарызацыю такіх аб'ектаў і прывесці іх у парадак.

Каровы і коні без дакументаў

Ля Хойнікаў быў затрыманы аўтамабіль «Фальксваген», які ў грузавым адсеку перавозіў пяць галоў буйной рагатай жывёлы, без ветэрынарнага пасведчання, як гэта патрабуецца. Глыбокай ноччу ў Веткаўскім раёне міліцыя затрымала «ГАЗ-53», кіроўца якога ў кузаве машыны перавозіў 7 коней, што належаць яго знаёмай прыватнай прадпрымальніцы. На трох коней адсутнічалі суправаджальныя дакументы.

У тым жа раёне, побач з вёскай Рудня, быў затрыманы мікрааўтобус «Форд Транзіт». У ім знаходзіліся дзве каровы, і таксама без неабходных папер. І каровы, і коні да высвятлення іх далейшага лёсу змешчаны на часовае ўтрыманне ў Веткаўскі аграсэрвіс.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Прадукты не прападуць

На прапускным пункце «Макраны» брэсцкія памежнікі і мытнікі ў легкавой аўтамашыне знайшлі кантрабанду. Грамадзянін Украіны сярод асабістых рэчаў здолеў схаваць 350 кг сычужнага сыру, 1 тысячу бляшанак тушонкі, 180 бляшанак згушчанага малака.

Тавар на суму 16,5 млн рублёў канфіскаваны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Кватэрнае пытанне

НОВАЯ ЎЛАСНАСЦЬ — НОВЫ КЛОПАТ

Майму мужу належыць двухпакаёўка, у якой мы жывём. Такую ж кватэру ён можа атрымаць у спадчыну ад бацькоў. Пытанне: калі ён стане ўласнікам дзвюх кватэр, як трэба будзе плаціць падаткі?

С.Л., *г. Мінск.*

Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь вызначана (п.п. 1.17 п. 1 арт. 186), што калі ў грамадзяніна маецца ва ўласнасці два і больш жылых памяшканняў, ён вызваляецца ад выплаты падатку толькі за адно жылое памяшканне на яго выбар на падставе пісьмовай заявы, пададзенай у падатковы орган па месцы жыхарства, з пазначэннем месцазнаходжання ўсіх прыналежных фізічнай асобе жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах. У выпадку непадачы фізічнай асобай такой заявы вызваленню ад падатку на нерухомасць падлягае толькі адно жылое памяшканне, набытае (атрыманае) ёй ва ўласнасць раней за іншыя жылыя памяшканні.

Падатак на нерухомасць спаганяецца ў памеры 0,1 працэнта ацэначнага кошту аб'екта нерухомасці. Вылічэнне гадавой сумы названага падатку ажыццяўляецца падатковым органам штогод на 1 студзеня кожнага падатковага перыяду.

Грамадзяне выплачваюць падатак на нерухомасць на падставе паведамленняў падатковых органаў не пазней за 15 лістапада бягучага года. Паведамленні з пазначэннем сумы падатку, якая падлягае выплаце, штогод уручаюцца плацельшчыкам падатковым органам да 1 жніўня.

Неабходна таксама ўлічваць, што калі ў другой кватэры ніхто не будзе прапісаны альбо колькасць метраў будзе перавышаць вызначаную норму агульнай плошчы, то плата за тэхнічнае абслугоўванне дома, ацяпленне і адлічэнні на капітальны рамонт дома будуць збірацца не па зацверджаных стаўках і тарыфах, а па нарматыўным сабекошце (гэта значыць, у значна большых памерах).

Віктар САВІЦКІ.

Вырошчваў каноплі ў гаражы

Супрацоўнікі міліцыі выявілі ў чэрвені 1048 фактаў незаконных пасеваў маку і канопляў на плошчы больш як 560 тыс. кв. м. Вынішчана каля 42 т наркотыкаў.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, у першы летні месяц за незаконную рэалізацыю насення маку да адміністратыўнай адказнасці прыцягнута 25 асоб, складзена каля 500 пратаколаў. Так, супрацоўнікі Барысаўскага РАУС прыцягнулі да адміністратыўнай адказнасці беспрацоўную жанчыну, на прысядзібным участку якой расло каля 70 кг маку. А ў Любанскім раёне ўчастковы інспектар міліцыі на агародзе мясцовага жыхара, які таксама не працуе, знайшоў 55 кустоў канопляў вагой 10 кг. Нарказасліны знішчаны.

У цэлым за чэрвень выяўлены 404 злачынствы, звязаныя з незаконным абарачэннем наркотыкаў. Да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 347 асоб. Так, у Мінску на тэрыторыі ГБК «Курасоўшчына-1» супрацоўнікі ўпраўлення па наркагандлі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама сумесна з калегамі з Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі мінчаніна, які ў сваім гаражы арганізаваў лабараторыю па вырошчванні канопляў. Абсталяванне і 585 г высушанай марыхуаны канфіскаваныя.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЖАНЧЫНЫ НЕ РАЗ'ЕХАЛІСЯ

Па галоўнай дарозе ў Баранавічах на аўтамабілі «Фальксваген Гольф» ехала беспрацоўная. На скрыжаванні вуліц Куйбышава і Лазо ёй не саступіла дарогу другая беспрацоўная, якая кіравала аўтамашынай «Фальксваген Транспарцёр».

У выніку парушальніца з пераломамі касцей галёнкі трапіла ў бальніцу.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

25 июля 2011 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гранд Фэшен Хаус».

Повестка дня:

1. О сделках общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.

Начало регистрации участников собрания — 13.00.

УНП 290671335

САБАКА БЫВАЕ КУСАЧЫМ...

Праблема

Штогод ад укусаў бяздомных сабак пакутуюць тысячы людзей. На мяне таксама ў дзяцінстве наскочыў вялізны сабака і цапнуў за руку. Але тады, на шчасце, усё абышлося зялёнкай. Прайшло, здаецца, нямала часу, але дагэтуль, калі бачу сабак без нагляду, стараюся абысці іх бокам...

Адчуванне страху перад чатырохногімі, без сумненняў, знаёма і школьнікам са Слуцка, якіх сёлета 12 чэрвеня зграя раз'юшаных бяздомных сабак пратрымала на парапеце будынка больш за гадзіну. Па словах жанчыны, якая ў той час праходзіла міма, калі б сабакі сцягнулі некага з дзяцей уніз, дапамагчы было б немагчыма. На шчасце, падышлі іншыя людзі і сумесныя намаганнямі адагналі агрэсіўных жывёл.

27-гадоваму ж мужчыне, на якога ў маі мінулага года каля чыгуначнай станцыі «Козенкі» Мазырскага раёна напалі бяздомныя сабакі, пашанцавала менш. Каб выратавацца, яму нічога не заставалася, як залезці на дрэва. Менавіта там, пад дажджом, ён і прасядзеў усю ноч. Толькі раніцай удалося паклікаць на дапамогу мінака, які і выклікаў «хуткую», паколькі ад пераахаладжэння мужчына не мог рухацца.

У маі 2009 года сабакі нанеслі шматлікія цялесныя пашкоджанні, небяспечныя для жыцця, шасцігадовай дзяўчынцы з вёскі Сцепанішкі Мастоўскага раёна... Спіс ахвяраў «сяброў чалавека» можна працягваць і працягваць. Але абмяжуюся апошнім прыкладам.

У нумары за 20 лютага 2010 года мы пісалі аб нападзенні зграі бяздомных сабак на 21-гадовую Таццяну Шараеву з Бабруйска. Дзяўчыне былі нанесены сур'ёзныя пашкоджанні: скальпаваная рана галавы, шматлікія рвана-ўкушаныя раны тулава і канечнасцяў, якія пацягнулі за сабой ампутацыю правай рукі. Пракуратура Магілёўскай вобласці завяла крымінальную справу, і перад судом прадстаў начальнік аднаго з жыллёва-эксплуатацыйных участкаў Бабруйска. Ён абвінавачваўся ў неналежнай арганізацыі работы па выяўленні і адлове бяздомных жывёл. Аднак суд апраўдаў кіраўніка. Зрабіў выснову, што ЖЭУ абслугоўвае толькі грамадскі жыллёвы фонд Першамайскага раёна Бабруйска, а прыватны сектар, дзе і адбылося здарэнне, у сферу абслугоўвання ЖЭУ не ўваходзіў. **Толькі пасля трагедыі і прадстаўлення пракуратуры ЖЭУ абавязалі выяўляць і адлоўліваць бадзяжных сабак і ў сектарах індывідуальнай жылой забудовы.**

Атрымалася, што ў трагедыі, якая прыляла да інваліднасці дзяўчыны, ніхто не вінаваты. Але ці так гэта? Уяўляецца, што вінаватыя ўсё ж такі ёсць, і гэта тыя чыноўнікі, якія з дапамогай інструкцыі і прав

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк» — уполномоченный банк ОАО «Газпром» в Республике Беларусь

Победитель республиканского конкурса «Лучший предприниматель»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, тел. 229 16 16 (администратор)
www.belgazprombank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2011 г.	2010 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		170 126,3	70 183,1
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		20 097,1	920,0
4	Средства в Национальном банке	1103		878 440,4	77 326,0
5	Средства в банках	1104		625 746,0	297 686,1
6	Ценные бумаги	1105		519 344,1	172 853,8
7	Кредиты клиентам	1106		2 532 083,3	1 371 638,7
8	Производные финансовые активы	1107		239 557,1	30 401,5
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		45,9	45,9
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		86 544,3	67 260,7
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		1 897,5	8 041,0
12	Прочие активы	1111		66 444,9	45 242,8
13	**Итого активы**	**11**		**5 140 326,9**	**2 141 599,6**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		316 114,9	10 391,6
16	Средства банков	1202		1 435 796,8	396 126,6
17	Средства клиентов	1203		2 363 672,8	971 751,0
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		339 121,5	171 217,2
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	40,8
20	Прочие обязательства	1206		38 386,1	19 331,6
21	Всего обязательства	120		4 493 092,1	1 568 858,8
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		426 268,8	426 268,8
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		27 564,5	23 015,6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		22 132,5	12 963,7
27	Накопленная прибыль	1215		171 269,0	110 492,7
28	Всего капитал	121		647 234,8	572 740,8
29	**Итого обязательства и капитал**	**12**		**5 140 326,9**	**2 141 599,6**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2011 г.	2010 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		198 475,2	161 032,1
2	Процентные расходы	2012		93 959,4	63 370,8
3	*Чистые процентные доходы*	201		104 515,8	97 661,3
4	Комиссионные доходы	2021		57 402,0	30 822,7
5	Комиссионные расходы	2022		32 217,0	9 244,7
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		25 185,0	21 578,0
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		(27 111,7)	192,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(9 919,4)	4 659,7
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		(81 720,2)	10 258,2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		154 409,2	4 660,1
11	Чистые отчисления в резервы	207		25 209,7	19 629,5
12	Прочие доходы	208		12 766,4	10 026,1
13	Операционные расходы	209		63 699,8	54 552,8
14	Прочие расходы	210		9 639,4	6 048,4
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		79 576,2	68 804,9
16	Налог на прибыль	212		15 734,2	15 701,1
17	**Прибыль (убыток)**	**2**		**63 842,0**	**53 103,8**

Председатель Правления **В.Д. Бабарико**

Заместитель главного бухгалтера **В.А. Коробова**

Дата подписания: 7 июля 2011 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 от 27.10.2006, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100429079.

МІНСКІМ КАШТАНАМ ПАГРАЖАЕ МІНІРУЮЧАЯ МОЛЬ

Заморскае насякомае паражае мінскія каштаны. На вуліцы Сурганава ў раёне Цэнтральнага батанічнага сада каштаны, якія растуць уздоўж дарогі, выглядаюць не лепшым чынам. Сярэдзіна лета, а крона дрэў пажаўцела, прычым некаторыя з іх зусім ужо скінулі лісце.

— Гэта мініруючая моль, — патлумачыў загадчык лабараторыі наземных беспазваночных жывёл Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Анатоль Кулак. — Гэта інвазіўнае, або чужароднае для Беларусі, насякомае, якое ўяўляе рэальную пагрозу для фаўны. Яно паражае лісцевыя пласцінкі. Спачатку яны пакрываюцца плямамі, пасля ліст засыхае, скручваецца і адмірае.

У Мінску ад мініруючай молі церпяць у асноўным каштаны. Хоць у іншых краінах яна нападае і на клёны. Насякомае размнажаецца паступова, паражаючы дрэва за дрэвам. Сёння сярод дазволеных для прымянення ў горадзе хімічных прэпаратаў няма такога, які быў бы эфектыўны ў барацьбе з гэтым шкоднікам. Паражонае апалае лісце каштанаў збіраюць і спальваюць, каб спыніць распаўсюджванне шкоднікаў. Да слова, мініруючая моль — гэта праблема многіх еўрапейскіх краін. Беларуская сталіца ўпершыню сутыкнулася з ёй 2—3 гады таму.

Ірына ЮДЗІНА, *«Мінск—Навіны»*.

Засвяціўся «пажарнік»

У адным з дамоў г. Брэста невядомы пашкодзіў асяродкі замкоў і выкраў з пажарных шчытоў пад'езда 23 пажарныя рукавы.

Нанесеная шкода вылілася ў 5 585 000 рублёў.

Нічога няма тайнага

На пункце пропуску «Казловічы» мытнікі зацікавіліся аўтамабілем Volvo. Кіроўца схаваў у кабіне аўтазапчастак на 65 млн рублёў. Але аказалася, што ўсе тыя схованкі даўно вядомыя мытнікам і памежнікам.

На гэтым жа пункце было канфіскавана 227 упаковак лёзаў для галення фірмы Gillette. Мінчанін спрабаваў перавезці іх у скрынцы для інструментаў. Лёзы пацягнулі на 18 млн рублёў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Фернандэль. Адвакат. Дональ. Кіт. Блок. Атакама. Алаіс. Навідка. Абуза. Фюнэс. Кэрн. Акра. Кампа. Прора. Рыс. Рэб. Стэрг. Індура. Хіл. Марцыпан. Мана. Кубэр. Удон. Рагу. Бэрк. Таяпка. **Па вертыкалі:** Рапіна. Чантэль. Такса. Кворум. Дар. Гарачка. Аман. Лак. Анабар. Опад. Фура. Дзвярэда. Арак. Хан. «Прагрэс». Лакуна. Нут. Атлас. Сон. Атара. Рант. Курк. Заяўка. Мураг. Вырін. Прас. Лазоўка.

Фестывальная мазаіка

20-й Паводле самых сціплых падлікаў, у фестывальным Віцебску адпачываюць звыш 20 тыс. турыстаў. Такое меркаванне выказаў БЕЛТА начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Віцебскага гарвыканкама Дзмітрый Скарынкін. У гасцінічных комплексах абласнога цэнтра, поўнасцю загружаных у час фестывалю, спыніліся турысты з Украіны, Літвы, Латвіі, Чэхіі, Турцыі, Сербіі, Малдовы, Італіі, Кітая, Ізраіля, а таксама многіх іншых краін свету. Значную частку гасцей складаюць расіяне і нашы суайчыннікі з розных гарадоў і рэгіёнаў Беларусі.

Жыхары Віцебска і госці «Славянскага базару» з'ядаюць больш за паўтону марожанага ў дзень, паведамілі ў Віцебскім канцэрне «Мяса-малочныя прадукты». З пачатку фестывалю праз шэсць гандлёвых пунктаў імі рэалізавана больш як 2,5 т марожанага. Пры гэтым традыцыйна попыт на гэту прадукцыю ў дні форуму ўзрастае ў 2—3 разы. Найбольшым попытам у гэтым годзе карыстаецца класічны пламбір. У топ самых запатрабаваных уваходзяць таксама шакаладны пламбір, ражкі і фруктовы лёд.

Другі том гісторыі фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» прэзентаваны ў прэс-цэнтры фестывалю. Даведачна-энцыклапедычнае выданне «Славянскі базар у Віцебску. Другое дзесяцігоддзе» падрыхтавана дырэкцыяй фестывалю да 20-годдзя знакамітага свята мастацтваў. Кніга змяшчае падрабязную інфармацыю аб фестывалі з 2001 па 2010 год.

У гонар юбілею па заказу дырэкцыі фестывалю былі выраблены 100 спецыяльных медалёў «20 гадоў «Славянскі базар у Віцебску». Іх уручылі тым, хто, паводле слоў Радзівона Баса, «тварыў гісторыю фестывалю, укладаў у яго сваю душу і энергію». Сярод узнагароджаных — пастаянная вядучая галоўных канцэртаў фестывалю Алена Спірыдовіч, нязменны вядучы «Зорных гадзін» Віктар Татарскі, артыст і кампазітар Канстанцін Масковіч, рэжысёры і пастаноўшчыкі фестывальных канцэртаў і конкурсаў, журналісты.

Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

МАЛАЙЧЫНА, АЛЕНА!

Прадстаўніца Беларусі на міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні Алена Ланская ў першы дзень выступлення атрымала больш балаў, чым астатнія, — 89. Малайчына. Усяго на адзін бал менш у хлопца з Украіны і прадстаўніка Чэхіі па прозвішчы Дэйл. У спявачкі з Літвы, бландзінкі Руты, — 86 балаў. Па 83 — у прадстаўнікоў Балгарыі, Малдовы, Казахстана і Расіі. Інтрыга на момант падрыхтоўкі артыкула заставалася. Хто атрымае галоўны прыз юбілейнага фестывалю?

Крысціна (Малдова).

Наша прыгажуня ў першы конкурсны дзень выканала песню на рускай мове «Неба ведае». Алена выйшла на сцэну Летняга амфітэатра ў кароткай сукенцы колеру валошкі — сімвала фестывалю. Спела ўпэўнена, скарыла гледачоў, разбіла сэрцы многім мужчынам у зале. Жадаем Алене ўдачы. Як і ўсім астатнім канкурсантам.

Учора вечарам канкурсанты выступілі ў суправаджэнні аркестра маэстра М. Фінберга. Алена збіралася спець песню «Белая ластаўка».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Алішэр (Казахстан).

Дэйл (Чэхія).

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Сёння

Месяц

Поўня 15 ліпеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.54	21.36	16.42
Віцебск —	4.36	21.33	16.57
Магілёў —	4.44	21.26	16.42
Гомель —	4.49	21.14	16.25
Гродна —	5.11	21.50	16.39
Брэст —	5.20	21.42	16.22

Імяніны

Пр. *12 апосталаў: Андрэя, Варфаламея, Івана, Мацвея, Піліпа, Пятра, Сафрона, Сімона, Фадзея, Фамы, Юды, Якава.*

К. *Маргарыты, Сары, Андрэя, Генрыха, Яўгена.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзве даты

13 ліпеня

1940 год — створана Дзяржаўная акадэмічная капэла імя Рыгора Шырмы. Заснавальнікам і нязменным мастацкім кіраўніком капэлы доўгія гады быў народны артыст СССР Р. Шырма. У выкананні капэлы гучаць творы сусветнай музычнай класікі, найбуйнейшых кампазітараў сучаснасці і беларускіх аўтараў Я. Глебава, Ю. Семянякі, Г. Вагнера. Рэпертуар калектыву складаюць з паэма, вакальныя цыклы, харавыя мініяцюры і свабодныя апрацоўкі музычнага фальклору. Капэла вядзе таксама і актыўную гастрольную дзейнасць.

1930 год — у Монтэвідэа (Уругвай) стартаваў першы чэмпіянат свету па футболе. Гэты чэмпіянат — адзіны з сусветных футбольных чэмпіянатаў, перад якім не праводзіліся адборачныя спаборніцтвы. Зборныя траплялі на турнір па запрашэнні, прычым з-за фактычнага байкоту чэмпіянату вядучымі еўрапейскімі камандамі набралася ўсяго 13 каманд. З гэтых 13 каманд 4 прадстаўлялі Еўропу, 7 — Паўднёвую Амерыку і 2 — Паўночную і Цэнтральную Амерыку. Футбольныя зборныя, якія прыехалі ва Уругвай з Еўропы, не ўваходзілі ў склад лідараў еўрапейскага футбола, і таму яшчэ да пачатку турніру было відавочна, што званне першага чэмпіёна свету дастанецца камусьці з паўднёваамерыканцаў. Уругвай стаў не толькі арэнай правядзення першага чэмпіянату свету, але і яго пераможцам. У фінальным матчы гаспадары перамаглі суседзяў з Аргенціны з лікам 4:2.



Цытата дня:

«Сапраўдныя веды заключаюцца не ў знаёмстве з фактамі, якія робяць чалавека толькі педантам, а ў выкарыстанні фактаў, што робіць яго філосафам».

Генры Томас Бокль (1821—1862), англійскі гісторык і сацыёлаг.

АСІНА

Ёсць у нашых лясах адно незвычайнае дрэва — асіна, вакол якой з'явілася мноства легенд і паданняў, прыкмет і павер'яў. Самае дзіўнае ў яе «паводзінах» — нават калі прырода, здавалася б, заснула глыбокім сном, асіна трымціць, шапоча сваім лісцем, бы хвалюецца за нейкі непапраўны грэх. З глыбокай даўніны даляцела легенда, быццам, наканавана асіне вечна трэсціся за тое, што з яе быў зроблены крыж, на якім Сын Божы Ісус Хрыстос быў распяты іншаверцамі. Народнае паданне сцвярджае, што і цвікі, якімі прыбілі Збавіцеля да крыжа, таксама былі асінавымі.

Больш позняе беларускае паданне «Пра бярозу і асіну» па-свойму «асэнсоўвае» прыродную асаблівасць дрэва. Яно зазначае: бяроза і асіна — гэта няверная жонка і яе палюбоўнік. Жонка разам з каханкам забіла свайго мужа, за што Бог ператварыў яе ў бярозу, і тая штогод абліваецца слязамі (сок пускае) за свой учынак. Палюбоўнік стаў асінаю, якая ўвесь час трасецца ад страху.

Каб перасцерагчыся ад хваробы, нашы продкі не выкарыстоўвалі гэта дрэва пры будаўніцтве хаты, не садзілі на падворку. Але каб пазбавіць гумно і хлеў ад нячыстай сілы, у сцяну абавязкова клалі некалькі асінавых плашак.

У шэрагу рытуалаў, звязаных з магіяй, яскрава прасочваецца цесная сувязь асіны з нячыстай сілай. Каб вызначыць, хто з вясковых жанчын-вядзьмарак забіраў у кароў малако, гаспадар высякаў вялікі асінавы кол, убіваў у зямлю, здзіраў з яго кару і кідаў на раскладзены агонь, над якім падвешвалася даёнка, дзе кіпяцілася марлевая цадзілка. Кажуць, ведзьма абавязкова прыйдзе прасіць патушыць агонь. Распазнаць ведзьму можна было і іначай. Асінавымі дровамі палілі ў печы, а затым на полымя ставілі патэльню з соллю. Праз некалькі хвілін у хату ўлятала вядзьмарка і абяцала адрабіць назад нанесеную карове шкоду.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Міліцыя затрымала групу ашуканцаў, якія прадаюць дыпломы. «Нам прыйшлося іх адпусціць», — заявіў доктар эканамічных навук старшы сяржант Іваноў.

☺

— Глядзі, Сёма, якія бландзінкі сімпатычныя! Дзяўчаты, а як вас завуць?

— Не кажы яму!

— Добра, Тань.

— Ну Іра!..

☺

Самая доўгая тэлефонная гутарка зафіксаваная ў Маскве, калі Ціна Кандэлакі выпадкова патэлефанавала Андрэю Малахаву.

☺

Крама.

— Добры вечар, гэта зона ветлівага абслугоўвання?

— Не, дурань, гэта тэрыторыя нізкіх цэн!

☺

Люта ненавіджу сяброў мужа! Я б іх усіх, гадаў, пераганяла!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3329. Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12